Уладзімір Караткевіч

SHOUT
SHARE
IT

- Уладзімір Караткевіч
  - Saxifraga
  - Балады каменя
  - Дыяментавы горад
  - І будуць людзі на зямлі
  - Памяць зямлі беларускай
  - Калі на зямлі ёсць казачныя краіны
  - Песня з паўночных Афін
  - Подзвіг Францыска Скарыны
  - Сцюдзёная вясна, або 1000 год і 7 дзён
  - Тысячу стагоддзяў табе!
  - Абраная
  - Твой зорны шлях
- notes
  - 1
  - 2
  - 3
  - 4

Уладзімір Караткевіч
Эсэ

Saxifraga

Некалькі год назад у нашай кінагрупе, што здымала ў Крыме мой фільм, выдаўся вольны дзень. Я выпрасіў на той дзень у нашага дырэктара аднаго з чатырохногіх артыстаў — а менавіта асла — і накіраваўся на ім у горы, на Яйлу. Хацеў бы я, вядома, сказаць, што выклянчыў не асла, а каня. Гэта было б куды больш рамантычна: вылазка на кані ў горы. Але праўда ёсць праўда — сябрам маім быў не скакун з сімферопальскай плембазы, а звычайны, буравата-мышасты і даўгавухі, баечны герой.

Я адчуваў сябе не вельмі здаровым, кепска спаў і пабойваўся, што мае жылы не вытрымаюць падарожжа на сваіх дваіх. Але я не мог і ўявіць, наколькі горшае будзе падарожжа на маім "таварышы і верным слузе" з яго ўпартасцю і калатлівым трушком.

Спачатку паабапал сцежкі цягнуліся карлікавыя лаўры, пасля вінаграднікі і шэрыя, заімшэлыя пліты таўрскіх магіл. Пасля пайшлі дубы. А потым зніклі і яны і пачалося царства каменю і травы, а найболей голага каменю.

Зранку з Яйлы спаўзлі, нібы снег, лавіны аблокаў, але пасля, відаць, вецер сагнаў іх, і яна адкрылася, урэшце, з усімі сваімі роўнядзямі, праваламі і морам, што, наўскос перакуленае, ляжала перада мной: далягляд на ўзроўні вачэй, а пад нагамі — кроў ледзянее — бездань.

Я глядзеў на ўсё гэта, на пульхныя падушкі нейкіх раслін і амаль пакутліва ўспамінаў — а што такое знаёмае нагадвае мне ўсё гэта?

І раптам успомніў.

Вось і ўлюбёных паэтамі лаўраў
І пышных магнолій не ўбачыш,
.
Толькі зямлячак бялюткіх сустрэнеш, бярозак…
.
Потым не стала іх.
.
Суха, нідзе ані былкі, усё задушыла каменне,
Нібы давеку турма.
.
Душна… ні кроплі вады… гэта ўсё нібы шлях у Нірвану,
Смерці ўсеўладнай краіну…

Успамінаючы ўсё гэта па радку, па слоўцу і, вядома, па-ўкраінску, я зразумеў, чаму такі мне знаёмы гэты краявід, што гэта за расліны, нават успомніў, што калісьці бачыў у Масандры іхняе пышнае цвіценне пад ліванскімі кедрамі.

Кветка вялікая, гожая, свежасць пялёсткаў раскрыла,
Кроплі расы самацветамі ззялі на дне.
Камень прабіла яна, той камень, што ўсё перамог,
Што задушыў і магутнасць дубоў,
І цярноў непакорнасць.
Гэтую кветку вучоныя людзі завуць saxifraga.
Нам, паэтам, гадзіцца яе называць — ламікамень
І шанаваць яе болей за пышныя лаўры[1].

І вось тут, на Яйле, над бездонню і бязмежным морам, калі я згадаў гэтыя радкі, пазнаў усё, што вакол, — паўстаў у маёй душы той даўно ўсімі забыты дзень, калі рвала на валынскіх палетках валошкі шэравокая русявая дзяўчынка, будучая вялікая паэтэса, будучы гонар Украіны.

…Сто гадоў назад, 25 лютага 1871 года. Маці — украінская пісьменніца Алена Пчылка, з Драгаманавых. Бацька, Пятро Касач, галава з'езду міравых пасрэднікаў у Наваград-Валынскім. Матка выпеставала здольнасць і ўкраінскае сэрца. Бацька даў не толькі вонкавыя рысы, але і дабрыню бязмежную, цярплівасць, паблажлівую лагоднасць, сілу волі, бескарыслівае сумленне, крайнюю прыстойнасць, здольнасць хутчэй моўчкі пакутаваць самому, чым прыносіць пакуты іншым, і велічэзную павагу да годнасці чалавечай, хай бы сабе гэта была і годнасць малога дзіцяці.

Аксана Сташэнка, дачка М. Старыцкага, піша: "Пятро Антонавіч паходжаннем з паўночнай Чарнігаўшчыны, ледзь не з Беларусі, хоць і лічыў сябе ўкраінцам, але ўкраінскаю моваю размаўляў дрэнна…" Вонкава суровы, ён мог і накрычаць, але ўсё роўна рабіў як лепей людзям. Паны крыўдавалі, што ён псуе сялян, заўсёды стаючы на іх бок, але ў спрэчках між сабою ўсё ж бралі трацейскім суддзёй заўсёды яго, ведаючы, што са шляху крыштальнага сумлення яго не зверне і цар.

Гэты чалавек, пакуль быў жывы, падбіраў кожную саломінку перад дачкою на нялёгкім яе шляху.

…Нейкія сем вёрст на ўсход ад Ковеля. Вёска Калодзежнае. Вялікі дом Касачоў немцы разабралі на бліндажы, і ў мой час яго толькі збіраліся аднаўляць, але ясна свяціўся на фоне дрэў "Лесін бяленькі дамок", пабудаваны бацькам, каб дзяўчо магло працаваць. Чатыры акенцы. Веранда. Мезанін, што выходзіць на

маленькі балкон. Тут кожны год святкаваліся шаўчэнкаўскія гадавіны, ставілася лялечная п'еса пра Кармелюка, тут стаяла фартэпіяна, якому прысвечана кранальная элегія, тут пісаліся многія з ранніх вершаў. Першы яе верш, які дайшоў да нас, быў напісаны ў дзевяцігадовым узросце. Тут дзесяцігадовая дзяўчынка запісала два тоўстыя сшыткі народнымі песнямі. Сюды нелегальна прыязджаў з-за мяжы Іван Франко: пагаварыць з бацькамі, адпачыць, палавіць уюноў. Тут вялізны свет палескай фантазіі ўпершыню нарадзіў тыя вобразы, што пазней так ярасна будуць зіхацець у славутай "Лясной песні". Тут нарадзілася душа дзяцей, усё тое, што прымусіць іх, і ў тым ліку Лесю, лічыць, што "мы не чарнігаўскія і не палтаўскія, а мы палешукі". І адчуванне гэтай еднасці з Палессем будзе глыбокае, як возера Нячымнае ("нічым не дастаць дна"), ля якога жыў пасечнік Леў. У яго гасцявалі дзеці, і ён пазней стаў прататыпам "дзядзькі Льва" з "Песні".

Нячымнае таксама недалёка. З тванню ля аднаго берага, з глыбачэннай крыніцаю, з пнямі ад старых дубоў і сасновым борам. Усяго 25 кіламетраў ад Калодзежнага. Возера чыстаплёснае, верасовае і лугавое па берагах, надзіва зажуранае. І… пустое цяпер. Зусім пустое.

Тут жа непадалёку, толькі ў Луцку, пачалося і тое няшчасце, што на ўвесь век атруціла жыццё гэтаму незвычайнаму чалавеку. Дзесяцігадовае дзіця застудзіла ногі на вадохрышчы — было гэта, значыцца, 6 студзеня 1881 года, — прастаяўшы на лёдзе ўсю гэтую цырымонію… Палонка… Крыж з лёду, увянчаны голубам… Марозная пара ад вады… Чырвоныя ў сцюдзёным сонцы рызы…

І вось праз два гады ўсё гэта адгукнулася. Спачатку туберкулёзам левай рукі, пасля — нагі, на пачатку 900-х гадоў — лёгкіх і ўрэшце нырак і страўніка. А там прыйшла і заўчасная смерць. Пасля жыцця, праведзенага ў нялюдскіх — не на аднаго чалавека — пакутах. Таму і ў школе не была, а вучылася толькі ў прыватных настаўнікаў. Хоць тут магчымае і другое тлумачэнне: маці, напрыклад, казала, што ўсё гэта было не столькі праз хваробу, колькі таму, што яна, маці, баялася, каб казённая школа не разбурыла дзіцяці мову, характар, погляды.

Як бы там ні было, але дзіця гэта было навучана нямецкай, французскай, грэчаскай, лацінскай мовам, а пасля сама вывучыла польскую, італьянскую, англійскую, балгарскую і іспанскую. А што ж?! Сям'я была культурная, таленавітая, цікаўная да ведаў. Брат Міхась — а было яму тады год дзесяць — аднойчы нават перамог у спрэчцы вядомага гісторыка Ілавайскага, аўтара гімназічных падручнікаў па гісторыі. Давёў яму, што адно пытанне з гісторыі Чырвонай Русі княскіх часоў той недастаткова

ведае і таму разумее не так.

— Дока растет, — сказаў ашаломлены гісторык.

— Не то что дока, а очень люблю читать книги по истории Украины, — спакойна і сціпла адказаў Міша.

Дзіўна, што ў такіх умовах вырас усё ж чалавек, патрэбай якога было не толькі выслоўлівацца, але і дзейнічаць.

Жыццё — прыклад мужнасці. Ды яшчэ ў гэткіх абставінах, у ліпучых кайданах з гіпсу.

Як Франко, разбіты паралюшам. Як Гейнэ ў матрацнай магіле. Але гэтыя былі мужчыны.

Хаця… вядомы ў свой час прафесар Сапежка казаў: "У мяне пры такой аперацыі пацыенты-мужчыны "вядзьмедзем" равуць, а тут слабенькая кабета сціснула зубы і маўчыць".

У гэтых кайданах, у якія яе перыядычна закоўвалі, яна няўтомна працуе і робіцца дасканалай паэтэсай, драматургам, празаікам, цікавым і (што куды цяжэй, і мы пераконваемся ў гэтым на кожным кроку) бездакорна праўдзівым і справядлівым крытыкам і публіцыстам, значным гісторыкам, этнографам, фальклярыстам, музыказнаўцам.

Музыцы яна вучыцца ў жонкі Міколы Лысенкі, вялікага кампазітара. І вучыцца так, што каб не хвароба рукі, то — яна сама казала пра гэта, — магчыма, пераключылася б галоўным чынам на музыку. І, можа, там яе здольнасці выявіліся б не меншыя, чым у паэзіі. Грала яна, між іншым, і свае творы, і імправізацыі, на жаль, не запісаныя.

У 18 гадоў яна склала дзеля сястры курс "Старажытнай гісторыі ўсходніх народаў": першабытныя людзі, свет, вядомы ім, індусы, мідзяне і персы, егіпцяне, асірыйцы і вавіланяне, фінікійцы, ізраэліты — вось яго раздзелы. Вось адкуль яшчэ вядзецца яе цікавасць да ўсходу, вось адкуль пайшлі "ўсходнія" сюжэты многіх п'ес і вершаў.

Яна перакладала сацыялістычныя брашуры, сама пісала іх па-ўкраінску або рабіла прадмовы да чужых.

Яна дзейнічала. Заслужыла добрую памяць калодзежанскіх сялян, якія ўспаміналі яе дабром аж праз шэсцьдзесят год, паверце мне. А вока на добрых людзей у простага люду вострае. Сялянка Варвара Дзмітрук, напрыклад, сярод усіх шматлікіх у тыя гады наведнікаў панскага дому ўспомніла праз 50 год "мужа, жонку і іхніх дзяцей з Львова". А гэта быў Франко з сям'ёй.

Яна змагалася на эпідэміі тыфусу. Арганізатарскай дзейнасцю і грашыма бязмерна многа памагла сялянам у неўраджайны, смяротна галодны 1891 год.

Будучы пасля смерці бацькі (а крыніцаю сродкаў была служба) чалавекам вельмі небагатым, каб не сказаць

недастатным, яна, нібы ад імя невядомага дабрадзея, усё ж на свае грошы арганізавала фальклорную экспедыцыю 1908 года на Палтаўшчыну. З новымі тады фанографамі. Кіраўніком экспедыцыі быў выдатны музыказнаўца, фалькларыст і кампазітар Філарэт Калеса. Перад ім была пастаўлена адна задача: толькі думы і гістарычныя песні. І ў гэтым была свядомая мэта. Кожная іншая песня магла пачакаць — думы выміралі ўжо тады. А так яшчэ жылі славутыя Міхайла Краўчанка і Гнат Ганчарэнка. Нельга было адхіляцца. Было мала часу і грошай. Трэба было хоць бы на гектографе выдаць сабранае ці ў таннай літаграфіі, хоць бы рэпертуар аднаго Краўчанкі, хоць бы ў самай абмежаванай колькасці экземпляраў.

Сабрана было… два тамы. Да выдання другога Леся не дажыла. Але гэта таксама помнік ёй, вялікай выратавальніцы скарбаў.

А колькі пакут трэба было перанесці ў працэсе гэтага подзвігу, колькі звычайных для "вялікай гісторыі" зневажанняў годнасці чалавечай, колькі паганых "жандарскіх ласкавасцяў"!

Ганчарэнку, напрыклад, спяваць забараняла паліцыя, і ён, пераехаўшы жыць у Севастопаль, да сына-рабочага, ніколі не насіў з сабою бандуры. Калі ён прыехаў да паэтэсы ў Ялту, на запісы, паліцыя на прыстані ўсё ж прычапілася да яго, як да жабрака з недазволеным спосабам прашэння (галадаць дазволена, працягваць руку — дазволены спосаб, а спяваць думы свайго народа — спосаб недазволены); толькі запэўненні паэтэсінай наймічкі, што ён не жабрак, што едзе ў госці да вядомых людзей, уратавала бандурыста ад бяды. А той нават не быў падобны на жабрака: прыстойная вопратка, годныя паводзіны, велічная постаць, тонкія артыстычныя пальцы; і не толькі не прымаў грошай, але і найменшай паслугі не прымаў дарма; быў артыстам, што паважаў сваю прафесію.

Словам — бог мой! — і там было не лепей, чым з беларускімі лірнікамі і дударамі. Царскія служкі знішчылі найбольш адметную, паэтычную, найбольш гістарычную з'яву быцця народнага.

Каму гэта трэба было?

Маці мая расказвае, што, калі яна настаўнічала, лірнікі часта праходзілі праз сяло, гралі па хатах, і яны, настаўніцы, таксама клікалі іх да сябе і дарылі, як усе, і слухалі: "Ой, спаў крумкач на магіле", і "Дароту", і "Цара Маркабруна", і "Трубу златакаваную", і "Язэпа Прыўкраснага", і "Равуць воды крывавыя", і журботную нашу "Сіротку". А я апошні раз чуў — і, магчыма, апошняга ў свеце — лірніка на кірмашы ў Оршы ці ў сорак сёмым, ці ў сорак восьмым годзе. І плакаў, як усе вакол; плакаў, можа, не столькі ад

спеваў, колькі ад адчування, што прысутнічаю пры сконе чагосьці гонарнага і велічнага. Таго, што ў самыя клятыя і чорныя часы не давала згаснуць святому адчуванню, што мы гордыя і вялікія людзі, калі мы стварылі такое.

Леся Украінка і тут зрабіла подзвіг. Гэта скажа і сёння кожны, хто слухаў украінскага кабзара. Не сцэнічнага, не на падмостках, а ў звыклай, роднай яму стыхіі. Я меў такое шчасце двойчы. Праўдзівей, чуў двух кабзароў, можа, таксама ледзь не апошніх.

Аднаго чуў шмат разоў — і адразу пасля вызвалення Кіева, і ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Не ведаю, ці сядзіць ён яшчэ і зараз у Пячорскай лаўры, пад старым каравым арэхам, сляпы, у памятым пінжаку, але ў бяленькай сарочцы з яркаю жычкай.

А другога — і гэта было яшчэ лепей, бо натуральная і спрадвечная была бяленькая хата пад саламянай страхою — я чуў пазней, у вёсцы па дарозе на Тарашчу.

І заўсёды, і ў адным і ў другім выпадку, не пакідала адчуванне, што прысутнічаеш пры сапраўдным, мо апошнім дзіве. І заўсёды здзіўлялі і словы, і вобразы, і гэтая манера спеву: вольны рэчытатыў, дзе фразы і словы то расцягваюцца, калі гэта трэба, то сціскаюцца. Да мурашак па спіне ўражала гэтая музычная дэкламацыя з яе раздробленым рытмам, які драбіцца ў адпаведнасці з нераўнамернымі радкамі, пазбаўленымі нават самай нязначнай, нават найменшай рытмічнай схемы, раскутымі, шырокімі, як Дняпро ў навальнічную паводку. Заплачкі, галошанне, беларускае і паўночна-ўкраінскае, — вось што гэта нагадвала. Так мне здавалася тады, так здаецца і цяпер. І пры гэтым велічным, спакойным і трагічным галашэнні, якое бандурыст выконвае, ясна ж, у міноры, нібы за валасы цябе ўздымаюць, нібы ў сэрца ўганяюць ледзяны і пякучы жах і захапленне пальцы, якія бегаюць па струнах, акампаніруючы ў мажорным гукарадзе. І гэта не дысгармонія, не дысананс, не какафонія, а, наадварот, парастак гармоніі вышэйшай.

Але подзвіг быў не толькі ў творчасці і абароне слова і песні. Ці не найвышэйшы подзвіг быў у абароне годнасці чалавека і краіны.

Калі ўвосень 1896 года цара і царыцу віталі ў Парыжы афіцыйныя колы, то некаторыя музыканты, артысты, пісьменнікі складалі ў іх гонар кантаты, здравіцы і песні. Абуралася ўся левая расійская інтэлігенцыя, але ніхто не асмеліўся сказаць слова, акрамя гэтай нядужай дваццаціпяцігадовай жанчыны.

Яна напісала і даслала ў газету "La Reform" гнеўны артыкул "Голас адной расійскай зняволенай".

"Ганьба крывадушнай ліры, ліслівыя струны якой напаўнялі акордамі залы Версаля… Ганьба вольным паэтам, якія перад

чужынцам звіняць звеннямі сваіх добраахвотна накладзеных кайданоў. Няволя яшчэ больш мярзотная, калі яна добраахвотная. Ганьба вам, аўтары, калі вы блюзнерскімі вуснамі вымаўляеце імя Мальера, які калісь сваім з'едлівым глумам падточваў жахлівага волата, якога стварыў для Францыі… кароль-Сонца. Прывід гэтага караля, такі бледны напярэдадні, пачырванеў ад радасцяў, пачуўшы вашыя песні ў горадзе Парыжы, гэтым царазабойчым горадзе, дзе кожны камень крычыць: "Прэч тыранію!"

Гэтыя прадажныя тварыны рабілі выгляд, што ў асобе высокага госця яны вітаюць вялікую Расію.

"Ці вы ведаеце, славутыя калегі, што такое ўбоства, убоства краіны, якую вы называеце такой вялікаю?.. Так, Расія велічэзная, расіяніна можна заслаць аж за край свету, не выкідаючы за дзяржаўныя межы. Так, Расія велічэзная: голад, цемра, ліхадзейства, крывадушнасць, бясконцая тыранія, і ўсе тыя няшчасці велічэзныя, каласальныя, грандыёзныя. Цары нашы перавысілі цароў егіпецкіх сваім імкненнем да масіўнага. Іхнія піраміды высокія і дужа моцныя. Ваша Бастылія была нічым у параўнанні з імі. Прыходзьце ж, вялікія паэты, вялікія артысты, паглядзіце на веліч нашых бастыльскіх цытадэляў, сыдзіце з эсград, здыміце вашы катурны і агледзьце нашу прыўкрасную турму… вялікую Расію".

Нават па адным гэтым артыкуле мы бачым, што гэтая жанчына была "свядомы свайго стану работнік…". І тысячу разоў меў рацыю Франко, калі пісаў, што яе паэзія"…гэта агністае абскарджанне таго дзікага гнёту самавольства, пад якім стогне Украіна".

Нават там, дзе Франко свядома завастраў, ён меў рацыю:

"Ад часу Шаўчэнкавага "Поховайте та вставайте, кайдани порвіте" Украіна не чула такога моцнага, гарачага ды паэтычнага слова, як у гэтай слабасілай, хворай дзяўчыны… Мімаволі думаеш, што гэтая слабасілая дзяўчына — траха ці не адзіны мужчына на ўсю навачасную, саборную Украіну".

Ужо ў нейкія дзевятнаццаць гадоў ствараюцца геніяльныя вершы, што ўваходзяць у скарбніцу ўкраінскай і светавой паэзіі. Я маю на ўвазе "Contra spem spero"(без надзеі спадзяваюся). Гэта ўжо не толькі свой стыль і адрыў ад стогнаў і жальбы ў імя мужнасці, энергіі, праклёну. Гэта большае.

Бо ў асобе Лесі Украінкі ва ўкраінскую літаратуру ўвайшло тое, чаго не хапала ў той час і ўкраінцам і нам: спалучаныя з высакароднай ідэяй інтэлігентнасць, вытанчанасць і, пры ўсёй нацыянальнай стыхіі, Сусветнасць у самым вышнім сэнсе гэтага слова. У нас гэта зрабіў Багдановіч, у іх — яна.

І ўсё гэта было як раптоўны выбух вулкана, як пякучая лава,

на якой пасля так раскошна буяюць кветкі, серабрацца алівы, наліваецца вінаград.

Некаторыя крытыкі бедавалі, што праз хваробу, праз прыкутасць на доўгія месяцы да ложка паэтэса часта была вымушана кідаць паплечнікаў, жыць у аранжарэйнай атмасферы санаторыяў, на чужыне. Мы ведаем, што і яна балюча перажывала гэта.

А я думаю — і няхай мне даруе яе вялікі цень, і вялікая ўкраінская паэзія, і сама вялікая Украіна, — я думаю, што ў гэтай бядзе было і зерне станоўчага.

Уявім сабе бясхмарнае жыццё каханай, жонкі, маці. Уся энергія, уся любоў, увесь боль пайшлі б туды. Мужчына ўсё ж менш залежыць ад гэтага, а для жанчын гэта многае, калі не ўсё. Колькі паэтэс чэзла і знікала вось так, у вершах аб каханні, міласці, ружовых дзетках.

Дадзена было ёй і вялікае каханне, і сябар-муж. Але найвялікшай любоўю асталася паэзія. І яшчэ вялікая Украіна, якая без гэтай паэзіі асірацела б у страшныя тыя дні. Дні ліхалецця, прыніжэнняў, заціскання роту. Дні хлусні і турмы, бізуна і плахі.

Калі я рыхтаваў да друку "Каласы пад сярпом тваім", рэдактар моцна пакрэмзаў у адным раздзеле прамову чарнасоценнага прафесара Руніна:

— Ну, браце, гэта ўжо занадта. Ты такія ўжо страшныя рэчы гаворыш. Гэта ўжо нават абразліва.

А я гэтых рэчаў не "гаварыў". Я толькі злёгку перафразаваў некаторыя месцы з кнігі Рыціха "Пакрыўджаны край". Што гаворыцца ў ёй пра беларусаў "з абліччам, не падобным да чалавечага, з нагамі ў выглядзе кола і незразумелай говоркай", якія "знікаюць канчаткова", — пра гэта і казаць няма чаго, тым больш што я пішу гэтыя радкі, даўно зніклы, а з фашызмам у пушчах ваявалі, відаць, таксама прывіды. Паслухаем, што ён кажа пра ўкраінцаў: "…З'яўленне… украінафільства, моцна цяпер падаграваемага аўстрыйскімі агентамі".

Гэта ён, відаць, пра Франко, Стафаніка і Кабылянскую.

"Гэтая справа, з грамадою Шаўчэнкі на чале, нейкай там операю Наталкі-Палтаўкі (адукаваны, новую кампазітарку падарыў Украіне!) і абмежаванай колькасцю фантазёраў, якія мяркуюць, што Маларосія, маларосы складаюць нешта асаблівае са сваёй нераспрацаванай говоркаю і сваімі чумакамі…"

Вось так гаварыў высокаадукаваны дзяржаўны муж.

Гэта нам цяпер смешна. А людзям даводзілася жыць і дыхаць у такой прыбіральні і не спадзявацца на будучыню, бо "Расія можа жыць толькі з такім духам народа, як было пры царах Іаане III і Аляксеі Міхайлавічы".

Вось так…

Але досыць пра сумнае. Падамо і весялейшы прыклад. Пасля валуеўскага цыркуляра 1863 года і Эмскага ўказа Аляксандра II ад 1876 года ўжыванне ўкраінскай мовы зрабілася не толькі чымсьці падазроным, але нават злачынным. Забаронена было ў канцэртах спяваць нават нявінныя песні іначай, чым у перакладзе. На канцэрце Міколы Лысенкі ў першай палове 1864 года кіеўскае начальства, разглядаючы праграму, пастанавіла, каб тэксты песень пераклалі. Была ў тым канцэрце і такая песня:

Дощик, дощик капае дрібненько,
Я ж думала, я ж думала, запорожець, ненько…

Пераклад той песні зрабіла нейкая пані.

І вось выйшаў на сцэну вядомы выканаўца народнай песні Мікола Багданаў і заспяваў гэтую песню па-французску…

У зале выбухнуў несамавіты, навальнічны рогат.

І было з чаго.

Вось так… І хто б уступіўся за галодных і паняволеных, за радзіму, каб не Тарасаў цень, каб не Іван Франко, каб не гэтая слабенькая, кволая жанчына.

Яна ніколі не была абмежаваная. Яна ваявала не толькі супроць прыгнятальнікаў, але і супроць хутарскога беспардоннага "патрыятызму", які лёкайствуе перад моцнымі, ліжа ім рукі, кідаецца ад гучных лозунгаў да халуйства і спадзяецца на цемру народную як на адзіную надзею, што народ той будзе жыць. Супроць патрыятызму галушак і світак за патрыятызм адукаванай грамады, якая, вядома, і галушак не забыла, але дайшла да вышынь духу чалавечага, культуры чалавечай. Першых яшчэ можна было б трымаць у прыгоне, хоць бы трымаючы ў цемры. Другіх — ніколі.

Час прыніжэння таксама нараджае волатаў. І шчаслівы той люд, хто ў такія эпохі мае сілу нарадзіць. Нарадзіць абарону.

Я лічу, што і ў вонкавай яе "стараннасці" не было вялікай бяды. Яна ведала мэту лепей за многіх, ведала шлях да яе і сродкі дасягнення гэтай мэты як ніхто. І, можа, нават лепей, што яна была пазбаўлена часам штодзённых сварак і спрэчак, грызні груповак, лаянкі народнікаў з Грушэўскім і Яфрэмавым, а тых яшчэ з кімсьці.

Ведала шлях і мэту. Спакойна і мужна рабіла сваю справу. І бласлаўленнем была тая "прымусовая бяздзейнасць", на якую яна так горка наракала.

Не яе справа была біцца. Яе справа была куць і сталіць зброю, якой, урэшце, перамогуць воіны яе народа, воіны ўсіх

прыгнечаных зямлі, воіны, створаныя спецыяльна дзеля таго, каб перамагаць. Слова яе ўражала, нішчыла, біла — значыць, перамагала і яна.

Нездарма Нестар Гамбарашвілі, які кватараваў у іх, на пытанне, што прывезці паэтэсе з Грузіі, атрымаў адказ: "Востры кінжал, як эмблему для барацьбы з ненавісным ворагам". Нестар замовіў той кінжал у збраяра ў Горы і прывёз.

А між тым гэта жанчына з усімі адметнымі рысамі жаночай псіхалогіі, з адметнай, арыгінальна павернутай думкай і самой лагічнасцю. Досыць прыгадаць верш "Забыты цень…". Ва ўсіх песнях Дантэ пануе цень Беатрычэ, якую ён бачыў тры разы (і на трэці — у труне), якой ён збіраў у містычным лесе кветкі, мыў іх у водах пякельнага Стыкса, каб пасля ўскласці на раннюю магілу той, пра якую не забыў да смерці. І хто памятае Дантаву жонку, ад якой не асталося нават імя, але якая верным ценем ішла за правадыром "Італіі няшчаснай", дзяліла з ім горкі, жабрачы і цвёрды хлеб выгнання і закрыла яму вочы?

…бачу слёзы…
Па тых слязах, як па расе жамчужнай,
Прайшла ў краіну славы — Беатрычэ.

Тут не толькі жаночы спосаб мыслення і жаночая душэўнасць, тут яшчэ і спагада адной жанчыны другой. Мы ведаем штуршок да напісання верша, прысвечанага Вользе Ліпскай, жонцы Лысенкі, якая не магла нават насіць імя мужа, бо ўлады не давалі яму дазволу на развод, жанчыны, праклятай родным бацькам за яе крок, жанчыны адданай і мужнай, якая ўсё сваё кароткае жыццё гераічна памагала кампазітару несці яго крыж, забыўшыся нават на свой не абы-які талент.

Паэтэса, жанчына тая, знайшла ў сабе, аднак, тытанічную сілу. Бо сэрца і шчокі гарэлі ад сораму за люд так, што яна знайшла страшныя словы: славянін — раб.

…славянін
З пакорай рукі склаў у кайданах папяровых
Ды раз у раз паклоны нізка б'е
Перад слупом, каронаю вянчаным…
У крыві ўвесь, слязьмі твар заліло,
Траістая нагайка цела крае,
А ён сплятае, крадкама, сіло
І брату пад нагамі раскладзе.

Народ, як сляпое зроду дзіця, ніколі не бачыў сонца, за ворагаў ідзе ў агонь і ў ваду і павадыроў сваіх аддаў катам. І, аднак, хай мы рабы

Без сораму, без гонару — хай так!
А хто ж складаў той строй ваякаў мужных,
Якіх сабраў пад вольны сцяг Спартак?

Тут і боль, тут і поўха народу-рабу, тут і вера ў яго.

Гэта якраз часы "Ламікаменя".

Вечны бой судзіцца гэтай жанчыне. Яна не толькі раніць, яна і атрымлівае раны. У 1897 годзе, якраз у год "Ламікаменя", яна пазнаёмілася ў Крыме з Сяргеем Мяржынскім, адным з арганізатараў "Кіеўскага саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа", а таксама і адным з арганізатараў беларускіх сацыялістаў. Saxifraga нездарма расцвіла ў той год. Парасткі сяброўства і любові прабіліся праз камень.

Усе, хто ўспамінаў Мяржынскага, не маглі гаварыць пра яго без пачуцця найглыбейшай павагі і пяшчоты. Гавораць пра глухаваты далікатны голас, пра пяшчотны, матава-белы колер твару, чорныя валасы і вялікія бліскучыя сінія вочы пад густымі бровамі. Гавораць пра мяккасць і строгую сумленнасць характару, пра тонкае разуменне мастацтва, арганічную няздольнасць прычыняць людзям боль, яркасць гераічнай думкі, гарманічны, высокі эстэтызм і альтруістычную захопленасць.

Як і яна, прыўкрасны прадстаўнік пароды чалавечай. Як і яна, асуджаны хваробай на перадчасны скон. Вялікую несправядлівасць дапусціла з абодвума жыццё. Але добра, што дало ім хоць тры з паловай гады шчасця.

Маці памерла ад сухотаў. Сын успадчыў хваробу. Леся і ён, абое хворыя, вырашылі не жаніцца. Супроць іх былі і лёс і людзі. Яго сваякі і матка паэтэсы, што хваравіта раўнавала дачку і, калі тая была ў Мінску (Мяржынскі служыў у дзяржаўным кантролі Лібава-Роменскай чыгункі), ля ложка хворага друга, — лічыла гэта сямейным няшчасцем, якое трэба хаваць. А дачка ў гэты час крычыць у лісце да В. Кабылянскай: "Калі падумаю толькі, што я такога друга маю згубіць!.." А дачка крычыць пакутным вершам "Апантанай". Два месяцы цягнецца пакута, а потым сухотны менінгіт — і ўсё.

16 сакавіка 1901 года каменная паліца лёсу падае на гэтага чалавека. І хоць ён "прасіў памяці, а не пакут", яна хворая ад страшэннай журбы, нават хваравіта-ненармальная. Усе думкі былі засяроджаны на тым, што адбылося.

Нельга без глыбокага жалю чытаць яе лісты з тых часоў,

нельга без пакуты чытаць лірыку, прысвечаную яму і ягонай смерці. Лірыку, што даходзіць да экзальтацыі амаль рэлігійнай. Бо жанчына ведала: дадзена, але на кароткі час. Дадзена, але яго чакае крыж і смерць. Калі рассыплецца руіна, што трымае плюшч, хай яна і яго пахавае пад сабою, бо нашто самотны плюшч? Калі здарыцца евангельскае дзіва і яна прыйдзе, як Магдаліна, рыдаць, што навек страціла яго, і раптам убачыць, што ён уваскрос і заззяў у славе, -

Што скажаш ты тады? Ці, можа, й ты
Тады пашлеш мяне з вясёлай весткай
Тваім сябрам таемным, клапатлівым,
Што тройчы адракліся ад цябе?
І пакуль я, не цямячы ад шчасця,
Па людзях шчасця панясу навіны,
Ты пойдзеш панаваць у новы край,
І рай ты на зямлі збудуеш новы
Дзеля сябе і тых, каго паклічаш.
Ці будзе ж месца там для Магдаліны?
Мне ўсё адно, абы ўчыніўся цуд!

Відавочныя, нечалавечыя рыданні раздзіраюць горла і кожны радок.

То што ж, няхай не зрушу я нічога,
Сарваўшыся ў бяздонне, ў забыццё,
Абы не зраніла так смерць мая нікога,
Як зраніла мяне маё жыццё.

У кожным успаміне б'ецца:

Я тут, я тут заўжды, я ўсё з табою.

У кожнай думцы дакор:

Не захацеў мяне ўзяць,
тут пакінуў мяне на старожы.

У кожным выгуку жаданне канца:

Знямела сэрца. Шчаслівейшай доля
Была тым лыцарам, з сядзельца збітым, —

Па праву даўняму, была ім воля
Гукнуць: "Забі мяне!.." — і быць забітым.

Тры гады спатрэбілася ёй, каб сяк-так ачуняць і аджыць да новага жыцця. Магчыма, цяжар гэтага навакольнага жыцця і ўваскрасіў яе. Занадта вялікая была б ад духоўнай яе смерці радасць усялякай погані, якая буйна і дробна помсціла ёй і ўсім яе годным сучаснікам за гордую незалежнасць, талент і вальналюбства. Помсціла цкаваннем, незаможнасцю і нават простай галечай, помсціла забаронай дзесяткаў лепшых вершаў, такіх, як "Дым", "Fiat nox!" ("Хай будзе ноч!"), "Анёл помсты", і нават паэм.

Адзін за адным з'яўляюцца драматургічныя творы пісьменніцы: "Блакітная ружа", "У пушчы", "Апантаная", "Вавілонскі палон", "Касандра", "На руінах", "Тры хвіліны", "Асенняя казка", "У доме работы…", "Руфін і Прысцыла", "Айша і Махамед", "На полі крыві", "Іагана, жонка Хусава", "Баярыня", "Адвакат Марціян", "Оргія і найлепшыя, на мой густ", "У катакомбах", "Каменны гаспадар", "Лясная песня" — магчыма, вяршыня ў жанры вершаванай драмы.

Нават па саміх назвах драм можна здагадацца, што дзея іхняя пераважна адбываецца ў далёкіх краях і ў далёкія вякі. Сучасная ёй — і не толькі сучасная — крытыка часта рабіла паэтэсе закіды і папрокі у "экзатычнасці". Я аніяк не згодзен з ёю. Тут не "экзатычнасць", а ўсё тая самая праблема адхілення творчай думкі, што, ва ўмовах нецярпімасці і самавольства, блукае па чужых краінах, па краінах гісторыі, па краінах казкі.

Апошнія гады Леся Украінка вымушана была жыць у Грузіі, што аніяк не ішло ёй на карысць. Вільготны, а тады яшчэ і дужа малярыйны клімат шкодзіў яе здароўю, і нават паездкі ў Егіпет не памагалі. Але муж быў прызначаны туды (паэтэса абвянчалася з Кліментам Квіткаю 25 ліпеня 1907 года), то даводзілася жыць там. Тужыць па зялёных гаях Палесся, па купах пышных дрэў, па смарагдавым кіліме балот і па вячэрнім дыме з комінаў. Гэтая туга па ўспамінах дзяцінства і прымусіла яе ў Кутаісі за 10–12 дзён напісаць дзівосную палескую "Лясную песню" ("Лісову пісню").

Улетку 1911 года перад яе вачыма ўставалі не ўзгоркі і малахітавыя ад вінаграднікаў лагчыны Грузіі, а ўвесь гэты чароўны палескі свет, споўнены самымі дзівоснымі праявамі фантазіі народнай.

Свет "Лясной песні" ўвесь створаны незвычайным палескім чалавекам. Свет утопленых няшчаснай маткай Пацярчат, свет

Пералеснікаў, якія лётаюць з пажарам асенняй лістоты, запальваючы дрэвы, неўтаймоўны свет Тых, што рве грэблі, свет страснай вясновай вады і дранцвеючага снегу.

Свет кахання і вечнага пачуцця, абуджэння лесу і зязюлі, што адказвае жалейцы. І Маўка — прырода, Маўка — зямля, Маўка — песня, за здраду якой трэба плаціць.

Я не ведаю лепшага ў гэтым жанры. Бо гэта не п'еса, не драма, не феерыя нават, а вялікая паэма жыцця гэтай лясной і вадзяной зямлі.

Ідзе згасанне. Егіпет, дзе знаёмае арабскае дзіця, трапіўшы ў скрутны стан, крычыць пад яе акном: "Мама… я — труба! Ратуй!" Чорна-чырвоны, крывава-чырвоны, аранжава-ліловы хамсін з яго пылам і нясцерпнай спёкай. І непазбежныя ў такім стане думкі аб марнасці жыцця, якія выклікалі накіды нясканчанага твора "На прадмесці Аляксандрыі…". Паміраючы, ужо ў Кутаісі, яна дыктуе маці нібы канспект гэтага твора ў ліпені 1913 года.

…Нельга не думаць, што яе скарбы таксама гінулі. Нельга не думаць, што яна не ведала пра тыя бездані, якія раскрывала людзям.

1 жніўня 1913 года ў Сурамі ўпаў апошні ўдар.

…Над свежай магілай дачкі яе маці піша Вользе Кабылянскай:

"Такі велічны агонь перастаў гарэць, такі высокі і тонкі інтэлект перастаў жыць, думаць, працаваць! Нібы ветрам здзьмухнула гэтую прыўкрасную, гэтак багата абдараваную істоту!.. Нашто так вядзецца на свеце?! І як могуць людзі верыць у нейкі мудры, вышні род думкі, нейкай усеаруднай сілы, бачыўшы такія з'явы? Каму, нашто патрэбная была перадчасная смерць гэтага прыўкраснага чалавека — і яшчэ сярод такіх пакут?.."

Гэта былі не апошнія пакуты, хоць астатнія ўжо не абыходзілі яе. Астатнія зрабілі людзі. Толькі ці людзі?

Вагон з труною. Кіеў. Катафалк, запрэжаны парай коней, спыняецца на хвіліну ля дома № 97 на Марыіна-Благавешчанскай (цяпер Саксаганскага), а пасля вырушае ў бок Байкавых могілак.

Яшчэ некалькі год назад я любіў сядзець там, ля сціплага помніка маладой жанчыне, што ўсперлася локцем на стос кніг. Зялёны цень бег па каменным, але адухоўленым абліччы.

Але тады, у 1913 годзе, нават да гэтага помніка было як да неба.

…І тут не пакінулі ў спакоі. Паліцыя хацела здзерці з труны чырвоную кітайку. Ход іхняй прымітыўнай

думкі аднавіць лягчэй, чым міргнуць: "Калі ў сэнсе рэвалюцыі — пагана, а калі як забітых казакоў на

крывалі калісьці — таксама не лепей, калі не горш". Зняць кітайку не дазволіў свяшчэннік. Хай будзе

блаславёна яго безымянная памяць, хаця б толькі за гэты ўчынак:

— Працэсія ідзе, то ніхто хай не ўмешваецца да прыкрас на труне.

Забаранілі несці на руках труну і вянкі, забаранілі прамовы і спевы, нават "Вечную памяць". Хацелі скіраваць картэж па пустых вуліцах.

І ўсё ж, не тры разы, як звычайна, а да самага канца людзі спявалі і спявалі тую "Вечную памяць".

…Я думаю зараз, што гэта не хвароба шматавала і катавала беднае яе цела, а той цмок, тая прымара, той змей-полаз, "спрадвечна пераможаны, але не пахаваны", які віўся навокал ля зямлі і ўсіх земляў і сціскаў іх, "хочучы задушыць".

Усё яе жыццё было — барацьба супроць "Таго, што ў скале сядзіць", супроць усіх тых мёртвых і мярцвячых, хто хацеў бы пустэляю бачыць свет, супроць тых, хто не паважае чужога, а таму бацьку

роднага і маці здатны выгнаць з торбаю ў белы свет, супроць тых, хто ўсё жыццё хацеў, нібы ў Маўкі з

"Песні", здзерці з яе грудзей і пажэрці галінку чырвонай каліны, родную зямлю.

Яны і павялі яе

> …ў далёкі край,
> ў нязнаны край, дзе ціша цёмных водаў
> спіць, як спакой вачэй змярцвелых, цьмяных,
> маўкліва скалы там стаяць над імі,
> нямымі сведкамі падзей, што ўмерлі.
> Спакойна там: ні дрэва, ані зелле
> не шалахціць, не навявае мараў,
> здрадлівых тых, што не даюць паснуць,
> ніякіх песняў не даносіць вецер
> аб недасяжнай волі; не гарыць
> зніч пажыральны; вострыя маланкі
> ламаюцца аб скалы і не могуць
> прабіцца ў крэпасць цемры і спакою.

Здавалася б, усё — камень. Але і адтуль далятае і далятае да нас голас пра попел, які

> …вернецца, ў родную ляжа зямліцу,
> разам з вадой там узросціць вярбіцу —
> стане пачаткам тады мой канец.

Так сталася. Яна зламала гэты камень. Цаною свайго кароткага, няшчаснага і шчаслівага жыцця. Цаною скону і цаною існавання вечнага ў памяці народнай. Страшны, зайздросны лёс.

Маладая жанчына супроць усёй чыгуннай сілы з усім яе апаратам дзікага самавольства, тупасці і жандарскага свінства. Выйшла і перамагла. Не магла не перамагчы. Бо што такое свінская сіла супроць сілы вялікага духу?!

Камень прабіла яна, той камень,
што ўсё перамог,
Што задушыў і магутнасць дубоў,
І няскоранасць цёрну.

…Такое і падумалася мне сам-насам з бясконцым морам і бясконцым небам на бязмежнай роўнядзі крымскай Яйлы.

Балады каменя

На маім стале замест прэс-пап'е ляжыць старажытная цагліна, падобная на скамянелы хлеб. Чорная, сітаватая, яна сям-там парасла сівым мохам. Яна ў дваццаць дзевяць разоў старэйшая за мяне. Ёй нешта каля тысячы год.

Я падабраў яе на старым дняпровым гарадзішчы, што пад Збаровам. Другіх вакол не было. Дождж вымыў з зямлі толькі яе ды яшчэ россып чарапкоў. У час, калі ў пакоі вечарэе, калі няма агню, а папяросны дым ціха плыве ў паветры, гэты ўламак часам спявае мне нешта ледзь чутнае і няўлоўнае.

На жаль, я ніколі не здолею спаймаць гэтую музыку. Бо гэта ўсяго толькі цень, лісток са ссечанага дрэва, пялёстак кветкі, засушаны на памяць.

Калі верыць паэтам і лічыць Мікенскі палац скамянелай Іліядай (а гэта, па-мойму, так), то дзве сястры, паэзія і дойлідства, пачыналіся з вартых жалю, але вялікіх сваёй будучыняй зерняў.

Рытмічныя выгукі радасці або гневу — і некалькі камянёў, нагрувашчаных у рад, каб прыкрыцца ад ветру. Спроба надаць рытму два-тры словы — і нашы "рытуальныя" каменні, размешчаныя па кругу. Прымітыўныя абрадавыя песні — і вострыя піраміды камянёў на праславянскім могільніку ля Бяздоннага возера, што пад Слонімам. Маленні Сонцу і Перуну — і мянгіры з далменамі.

Спачатку — словы, спачатку — некалькі камянёў. Паселішчы — гэта ўжо балада. Я адчуў гэта, калі праплываў аднойчы ўначы ля таго гарадзішча, дзе падабраў маю цагліну.

Месяц цягнуўся між разарваных хмар. І ў ягоным святле чорным сілуэтам узвышаўся ўсечаны конус велізарнага насыпу і скарлючаны дубок, што прымасціўся на ім.

І я адклаў вясло. А рака павольна несла мяне, як плынь песні. Кожная балада, нават самая прымітыўная і дзяцінная, мае права на месца ў нашым сэрцы. Нават балада гарадзішча, нават песня сялянскай курнай хаты. Жыць так, як яны, мы не будзем. Але помніць — павінны. Гродзенскі музей перавёз адну такую хату і паставіў яе на замчышчы. І гэты першы крок годзен ухвалы, бо Рыжскі і Стакгольмскі музеі вясковага дойлідства таксама некалі зрабілі першы крок, а цяпер — гонар сваіх народаў. Бо гэта таксама нашы песні, няхай сабе і сціплыя. Бо гэта пад іхнімі стрэхамі або пад стрэхамі іхніх братоў-блізнят, што загінулі ў тысячагадовых пажарах, складаліся "За рэчанькай за быстраю", "Перапёлка, дзе звіла ты гняздзечка", "Лін калыша ваду". Бо,

выходзячы з такіх хат на татар, людзі склалі "Лявоніху", якая збіралася "начаваць з вераб'ямі" вось пад такою страхой.

Нядаўна на дыспуце ў вялікім абласным горадзе адзін з тых, што выступаў, крычаў аб непатрэбнасці "песень для чацвёртага класа", якія "ніяк не могуць выбіцца з-пад стрэх". Не думаю, каб "не выбілася з-пад іх" паэзія Танка ці Багдановіча. Не ведаю, ці прыносіць гэтаму чалавеку асалоду хор Шырмы.

Але затое я добра ведаю, што права на веліч маюць і Багдановіч і "Ой, рана на Йвана".

Маці — у крайнім выпадку прабабка гэтага чалавека — пад такою страхою нарадзіла сына, ягонага дзеда, а значыць, дала жыццё і яму. І тут нарадзіла яна для яго яшчэ і калыханку.

Люлі, люлі, люленькі,
Не шуміце, лазнякі,
Тонкія націнкі,
Моцныя трысцінкі.

І ўсе мы, нават самыя вытанчаныя і інтэлектуальныя, нават самыя вялікія паэты-геніі, рана ці позна, але, урэшце, пайшлі адтуль.

Гэтая страха нікому яшчэ не здрадзіла, тут нарадзіўся твой продак, які меў на ўвазе і прадбачыў праз шэраг пакаленняў нават цябе, адсюль ён выплыў, нібы ў чаўне, каб даць дарогу табе, лепшаму.

У далёкага стваральніка каменных балад ёсць суцяшэнне: знайшліся ў яго лепшыя дзеці. Прыёмныя. Яму няма клопату да тых, няхай сабе і родных, якія не трымалі ў руках рыдлёўкі і гэбля, якія не зрабілі нічога, акрамя двух-трох вершаў, слабых не таму, што пісаў яшчэ малады чалавек, а таму, што ніколі не вырастуць вялікія дрэвы на муры або ў жолабе. Мне заўсёды вельмі шкада іх, але яны — дрэвы, яны не вінаватыя, што іх занёс туды вецер. А ты ўсё ж чалавек і сам павінен рабіць выбар.

За зямлю, за балады з каменя — і тады мукі шляхоў і, магчыма, чалавечая веліч.

Або без іх — і тады заслужаная ганьба і смерць раней смерці. Пэўна, помніш лёс Карыялана, які бурыў родныя камяніцы, лёс тых "вялікіх", што лаялі Рансара за тое, што ён адступіўся ад латыні ў імя новага.

Ці, можа, табе хопіць і такой славы?

Тады праслаўляйся, і досыць пра цябе.

Калі пэцкаць паперу, то пэцкаць яе дзеля чагосьці вартага. Дзеля той каменнай песні, што рабілася ўсё больш і больш складанай, што ўздымалася ў неба вышэй і вышэй. Побач з песняй

жывою.

Плялі славясы, плялі камяні. Кірыла Тураўскі перамяжаў словы казаняў язычаскім гімнам вясне, зямлі, абуджэнню кахання ў людзях. І, як ён, невядомы ягоны сучаснік вывеў на беразе Нёмана муры Каложы. Ён перамяжаў тоўстыя пласты цамянкі ружовымі і жаўтаватымі, танюткімі, як скрылёк, цаглінамі, упрыгожваў сцены зялёнымі маёлікавымі плітамі, што адлівалі ружовым, аранжавым і сінім, як пяро качкі, як вясёлка. І, прыгажэйшая знадворку за кіеўскія і наўгародскія, устае над ракою будыніна, якая сама нібы песня і церпіць напады, як сярэдневяковая песня.

Разлівы рэк і нядбайнасць людзей цягнуць яе муры ў хвалі Нёмана. А потым яе рэшткі, як фрагменты старой сагі, замацоўваюць.

— Стой хаця так, радуй нам душу.

І гэта правільна. Бо калі прыходзяць новыя часы — старая песня адыходзіць. Але кожны ўсё ж бярэ сілы і ў ёй. І можа здарыцца так, што на новым узлёце яна будзе больш сучасная, яна, якой дзвесце-пяцьсот-тысяча год, чым тыя, што створаны восемдзесят год назад. Як "Марсельеза" ў параўнанні з "Узвейцеся, сокалы, арламі". Як Рублёў, якога яшчэ семдзесят год назад лічылі брыдою людзі, якія цяпер для нас — брыда не брыда, а так, нешта не вартае вялікай увагі.

Тое самае з Каложай. Створаная ў цемры стагоддзяў, але з яснай мэтай і яснымі сродкамі, яна бліжэй нам, чым сумна славуты нью-йорскі бацька сучасных хмарачосаў, вядомы "Прас", або нават некаторыя дамы Мінска, якім, скажам, толькі шаснаццаць. Сапраўдныя балады не старэюць. І вечна з намі славутая наша "Шчыравала ў бары пчала", бо яна сучасная і па змесце і па форме. А колькі вершаў, створаных учора, сёння ўжо ўпалі на дно, у каламутную плынь ракі забыцця.

…Прыходзяць іншыя часы — і чалавек мяняецца з імі. Прыходзіць развал старых княстваў. Прыходзіць час, які, сам крывавы і змрочны, як балада, патрабуе новых балад. І на некаторы час Каложа перастае адпавядаць. Як мірная песня ў часіну навалы. Яна стаіць, а непадалёку ўзводзяць муры з байніцамі.

І нават сёстры Каложы, у Маламажэйкаве і Сынкавічах, груба і пыхата тапырацца чатырма пузатымі вежамі па баках. Рыны іхнія не для цёплага дажджу, а для расплаўленага свінцу. І застрашлівыя драконы на іхніх жаралах сведчаць аб гэтым.

А вайна была, вайна была,
А ніўка зялезнай карой парасла,

Зялезнаю, крываваю,
Сталёваю, іржаваю.
Ой, прыехала Літва.
Заўтра будзе ў нас бітва.

І, аднак, тут цепліцца песня і светлы дух чалавечы. Узносіцца готыка, нібы агонь, у неба. І гэта палёт думкі, што пачынае абуджацца, гэта перадпачатак рэнесансу, гэта вершаваны ўступ Скарыны да кнігі "Іудзіф".

Вызвалены дух уздымаецца некуды туды, вышэй, разам з "багамерзкімі" шкалярскімі песнямі. Цесна на зямлі, цесна ў гарадскіх мурах. Крылы яшчэ не нарадзіліся, гэта толькі прадчуванне палёту. Яшчэ шэсцьсот год будуць ваяваць, бурыць дзівосныя будынкі, душачы песню, і паліць кнігі, пакуль чалавек не вырвецца з ланцугоў.

Хай сабе стаяць на зямлі і яны, змрочныя балады Міра, Наваградка, Смалян, Ліды. З часам яны таксама зразумеюць, што не адной вайною жывыя балады, што мужнасць мужнасцю, але і добрым і адкрытым павінен быць чалавек. Як новы гродзенскі замак, як іншыя такія. Што з таго, што пакуль яны служаць адзінкам. Яны прыдатныя і для ўсіх. Паэты і майстры заўсёды загадваюць на стагоддзі.

…Так, разам з песняй, прадбачачы паэзію Багдановіча, як белыя слупы дыму ў марозны сонечны дзень, устаюць на нашай зямлі шырокія снежныя палацы, якія чакаюць і вераць у той радасны дзень, калі да іх прыйдуць не адзінкі, а ўсе.

Некаторыя дачакаліся. Дачакаўся неаддзельны ад "Паланеза" Агінскага Залескі палац.

Дачакаўся замак у Нясвіжы, падобны на абдымкі белых і цёплых рук.

А колькі ж не дачакалася? Стаяць прыдатнымі яшчэ каробкамі, ляжаць камянямі.

Успомніце Старэ Мяста ў Варшаве. Яго ўзнялі з праху такім, якое яно было. Рукамі кавалі ліхтары, бо "тады" яны былі кутыя рукамі, а не адлітыя. Аднавілі па малюнках усё, нават колькасць пер'яў у крыле грыфона на партале.

Загінуў палац у Шчорсах. А людзі маглі б жыць у ім лепей, чым у хатах ці нават у некаторых буйнаблочных будынках. Разабралі ратушу і, амаль насупраць, сталі будаваць музей.

Што б вы сказалі, каб нехта кінуў у агонь "Мёртвыя душы"? Няпэўнае права на гэта меў толькі сам аўтар. Няпэўнае, бо ягонае стварэнне ўжо не было ім як асобаю.

Каб нехта кінуў у агонь Купалаў "Курган"? Дык, паверце, тое,

што здарылася з каменнымі баладамі, - горшы злачын. Тысячы "курганоў" стаяць на паліцах і шалахцяць і спяваюць у руках людзей. А каменныя балады выдаюцца ў адным экземпляры. І знішчаць іх — гэта тое самае, што спаліць "Кіеўскія глагалічныя лісткі" ці "Астраміра Евангелле". Іншых не будзе.

Скажы ты, аўтар вялікай справы, якую ты зрабіў сёння, на шчасце, на доўгую карысць усім людзям, ты, дойлід Крамлёўскага Палаца з'ездаў, ты, аўтар "Ціхага Дона", ты, творца сімфоній, ты, муляр, ты, араты цаліны, скажы мне, ці хацеў бы ты, каб гэтую справу нехта разбурыў заўтра?

Тое, што мы творым сёння, таксама будзе старажытнасцю, і па справах нашых тыя людзі будуць меркаваць аб нас.

Ці хацелі б вы ўсе, людзі, каб на ўсё, створанае вамі ў радасці, муках і поце і на радасць другім, нехта заўтра махнуў рукой і сказаў:

"Ат, мінулае. Парахня".

Вы хочаце павагі ў будучым — паважайце тых, безыменных.

Яны працавалі для вас. Яны прадбачылі вас. Яны вас — не ведаючы — любілі.

Сто пяцьдзесят год мы не можам дараваць Напалеону за полымя, у якім згарэла "Слова аб паходзе Ігара". А за знішчэнне любой каменнай балады самы горшы адказ — кінафельетон у "Фіціль".

На мурах Міра ахоўныя дошкі. Абсыпаюцца муры Міра. А ў іх, пры сціплых сродках, мог быць санаторый, Дом творчасці, музей. У старой балады зноў з'явіўся б змест, адпаведны яе дзівоснай форме і яе аправе са ставоў і зялёных паркаў.

…Адна цагліна ляжыць на маім стале. Але я аддаў бы дзесяць год жыцця, каб па адным гэтым слове аднавіць старажытную баладу. Як кожны паэт, які любіць людзей, аддаў бы іх за поўны тэкст "Энеіды", за спаленыя раздзелы "Анегіна", за знішчаныя агнём, ненадрукаваныя вершы Купалы.

Дык будзем цаніць тое, што маем.

Адна цагліна ляжыць на маім стале, падобная на адзінае слова забытай балады…

Дыяментавы горад

Эсэ пра гісторыю і людзей адной зямлі

Ёсць на свеце гарады, імя якіх для твайго вуха проста сугучча. Прагучала назва, скалыхнула паветра і знікла назаўсёды ці да наступнага разу. Бо нічога за гэтай назвай для цябе не стаіць. Не чуў, не бываў. А і не буду — невялікая страта.

А ёсць гарады, звязаныя з табою нябачнай повяззю, самой музыкай свайго імя, або нечым трывалым, што вяжа з імі назаўсёды, нават супраць твайго жадання.

Ёсць для мяне некалькі такіх гарадоў на Беларусі. І адзін з іх — горад маёй маці, Мсціслаў. Тут яна нарадзілася амаль дзевяноста год назад і тут пражыла некалькі першых сваіх месяцаў. І Мсціслаў быў для мяне, з гэтай прычыны, і не свой і, нібыта, крыху свой.

Гарады, як і некаторыя людзі, чакаюць свайго адкрыцця табой. Шмат год праходзіў міма чалавека — і раптам раскрываецца ён табе ў адной размове і на ўсё жыццё.

Для мяне і майго адкрыцця Мсціслава зорнымі гадзінамі і днямі былі казачыя дні пачатку студзеня 1982 года. Расказаць — не павераць. А трэба ўсё ж паспрабаваць расказаць.

8 студзеня 1982 года, звычайная "Волга" выйшла з Мінска і накіравалася шляхам на Магілёў-Мсціслаў.

За горадам з усіх гурбаў пачалі зрывацца снежныя языкі, а потым змеі. Дуйка бегла па асфальце. Праз шэра-дымнае хмарнае неба мігцела сляпучая, размытая пляма сонца.

Сустрэчныя машыны сярод белага сонечнага дня святлілі насустрач фарамі. Пасля хмары заснавалі сонца, лясы сярод поля, рассечаныя дарогай, як бохан нажом… І самотныя вароны ляцелі высока над лесам, невядома куды, за якім-такім харчам насустрач завірусе.

Не трэба было ехаць насустрач гэтаму. Трэба было спыніцца недзе ў вёсцы і прасіць аб начлезе, але перамагла дурная зухаватасць. І зноў мы спыніліся ў глухім лесе, самотным і заснежаным. І быў гэта зімовы шлях і мары на зімовым шляху да горада, які сёння стаў самы важлівы з усіх гарадоў, бо зрабіўся тваёй мэтай. Безупынны шум дрэў, ясна было і страшна было ўявіць, што робіцца ў чыстым полі.

І ўрываецца ў яго раптам настойлівае рыпенне. І цішыня. І зноў мёртва парыпвае пад ветрам нейкае дрэва. Лес скардзіцца. І

над гэтым змрочным і страшным лесам кліч варон і груганоў, якія цяпер цягнулі ў лес, пад пакрыццё.

Ужо за Друццю зусім не стала відаць ані дарогі, ані зямлі, ані неба. Шалёны ўраган дзьмуў з поўначы ў трубу між Друццю і Дняпром, каб вырвацца, мабыць, недзе ля Рагачова, на волю.

У Магілёве на спуску да Задняпроўя стаялі машыны, якія не змаглі ўзабрацца на гару, а пасля ў полі ўсё часцей і часцей стала трапляцца кінутая тэхніка: трактары, краны, машыны (людзі, відаць, кідалі іх і дабіраліся да першага жылля).

Часамі зусім нічога не было відаць. І ўсё здавалася, што машыну заносіць і заносіць улева, некуды ў нябачны яр.

У пэўны момант здалося: гінем. Адны ў чыстым полі. Нічога не відаць, і слабы арыенцір толькі бур'яны і хмыз з правага боку (левы гіне ў снегавой імгле). Праз неіснуючыя, здаецца, шчыліны нас заносіў снегавы пыл, павольна ўтвараючы ўнутры машыны суцэльную гурбу.

За чатыры кіламетры да Ходасаў селі ў лагчыне, у якой на два кіламетры сядзеў корак з машын, занесеных снегам, і ўзрадаваліся, што не адны будзем у чыстым полі, што вакол людзі, хаця некаторыя з іх сядзелі тут ужо пяць гадзін пры трыццаці градусах марозу і ўраганным ветры.

І не было куды ісці, бо нічога не відаць. Не знойдзеш хаты — саб'ешся і замерзнеш. Застанешся ў машыне — занясе. Заставалася капаць, адкідаць, выцягваць, хаця праз хвіліну заносіла снегам зноў і дранцвелі рукі і твар. Гарэлі ліхтары — толькі за пару метраў іх і не было відаць. Працуеш і задыхаешся і лоб расколваецца ад болю, нібы вецер разбівае яго, сціскваe скроні і чэрап.

Бягуць між машын струмяні, кідаюцца чырвоныя і чорныя чалавечыя цені. Чырвоныя агні і чырвоныя хвалі снегу. Імчыць да самага неба крывавы, пурпуровы ўраган.

Я не ведаю, на жаль, прозвішча сапраўднага героя гэтай ночы. Хтось, хто ведаў дарогу (а як яе было знайсці ў гэтым пекле — не ведаю) усё ж пайшоў у Ходасы, і не збіўся, дайшоў і прывёў не дапамогу людзей.

Раптам я ўбачыў чалавека ў расхрыстаным кажусе. Твар чырвоны, мокры. З'явіўся і прывёў бульдозеры начальнік міліцыі. Гледзячы на яго, на бульдозер і бульдазерыста ў нязмерным кажусе, я ўпершыню падумаў, што, мабыць, не прападзём, а можа і не будзем кукаваць да раніцы, прыгода таксама не з прыемных.

А пасля яшчэ адно ўсмешлівае аблічча за шклом машыны, у якую я залез сагрэцца: першы сакратар райкома Пятро Міхайлавіч Катушкін, добры, просты мужык. І з калегамі, што вярталіся з Магілёва і таксама ўгрузлі. Сядзім, значыцца, разам.

Значыцца, вышэй галаву.

— Давайце ў маю машыну. Замерзнеце.

У ягонай машыне замерзнуць было цяжка: набілася ў яе аж сем чалавек. А наперадзе раўлі ў чырвона-белай імгле вялізныя, як вежы, бульдозеры, рассоўваючы снег (дарэчы, калі ехалі пасля дадому, заносы паабапал дарогі на тым месцы былі ў два-тры чалавечыя росты: словам, "наш" занос быў найлепшы, найпрыгажэйшы, самы выдатны, — ледзь не сказаў "самы прагрэсіўны", — нам пашанцавала трапіць менавіта ў такі, самы здаровы і велізарны занос).

Бурыліся снежныя вежы, узнікалі і зноў бурыліся. Першую "Волгу" "УАЗ" узяў на буксір, а за ёй паступова, у снегавым тунелі пасунуліся мы.

І яшчэ васемнаццаць кіламетраў роў падвеў і шалела неба, але гэта ўжо не было так дзіка і безнадзейна, як у мёртвай лагчыне.

А пасля ўзнік, у дзве гадзіны ночы, Мсціслаў. У глыбокім, мёртвым, буранным сне. Чорныя дрэвы прысадаў і садоў гнуліся і мялі, неба і дамы спалі ў іхняй засені пад спевы ўраганаў. Як тысячу год назад.

Чаму такі ўступ. Без яго ніхто не паверыў бы таму, што і сам я ўпершыню ў жыцці ўбачыў на свеце і больш, мабыць, ніколі не пабачу. Таму, што здарылася ў Мсціславе на наступны дзень.

А сведкі таму тыя, з кім я ў гэты дзень хадзіў па горадзе і ўсе жыхары Мсціслава.

Усе як адзін. Ад дзіцяці да пенсіянера. Ад настаўніка да дырэктара прафтэхвучылішча. Ад шафёра да сакратара, хаця яму ў той дзень зусім не было часу глядзець навокал і, тым больш, на неба.

Вар'яцкі буран мінулай ночы паваліў слупы, абарваў і некуды занёс драты, адключыў ад электрычнасці па вобласці дзевяноста фермаў і вёсак (у раёне, здаецца, дзевяць), перакрыў снегавымі хрыбтамі дарогі, нарабіў мноства іншых бед.

І мне падумалася ў той дзень, што цяжка, вядома, адказваць за сваю душу і сваё сумленне, як гэта ўсё жыццё даводзілася рабіць мне, але адказваць за мноства рэчаў, над якімі ты часам не ўласны, таксама складана, калі ты сумленны перад сабой і людзьмі.

І яшчэ я падумаў, што паняцце міру — рэч досыць умоўная, таму што лёс часам ставіць як асобу, так і грамаду ў самы, здаецца, мірны час ледзь не ва ўмовы перадавой. Як у гэтую ноч, калі шафёр кінуў машыну з камбікормам (і правільна зрабіў, бо загінуў бы), калі абясточана ферма, а на ёй у разгары ацёл, калі сувязі з многімі пунктамі няма. А тут яшчэ з'явіўся пісьменнік:

знайшоў час зірнуць на раён, пра які збіраецца сказаць некалькі слоў. І каб хаця напісаў шырокую карціну таго, што робіцца, каб хаця нешта станоўчае прапанаваў, каб хаця… пашкадаваў ці што, бо гэтаму хлебу не пазайздросціш.

Дык не, не зробіць ён гэтага. Правільна, не зраблю. Мэта не тая. А мэта мая у тым, каб расказаць усім аб малым, непрыкметным, ледзь не самым далёкім ад сталіцы раёне і паспрабаваць пасяліць у вашых душах (і ў душах усіх, хто прачытае гэта) гонар за яго, за продкаў сваіх і за сябе, якія не горшыя.

Вы робіце ўсё, каб зямля працвітала, каб край ваш быў уладкаваны, сыты, прыбраны і багаты. Я не магу непасрэдна памагчы вам у гэтым. Але я магу прымусіць вас азірнуцца.

Я магу зрабіць так, каб вы ясней убачылі прыгажосць вашай прыроды і вашых будынкаў. Я магу расказаць вам пра забытыя і напалову забытыя подзвігі і ўчынкі вашых продкаў. Пра тую прыгажосць, што яны стварылі і кнігі, што яны пісалі.

Я магу напомніць вам, Мсціслаўцы, і іншым людзям, што на многіх шляхах чалавечай дзейнасці вы былі першыя, што ваш малы горад зрабіў для прагрэсу краіны больш, чым некаторыя вялікія і славутыя гарады.

Я магу нагадаць вам, што вы людзі з мінулым, славе і мужнасці, розуму і таленту якога могуць пазайздросціць многія, і што толькі ад вас залежыць, каб гэтая слава тых, хто заўсёды ідзе наперадзе, не прапала ў будучых вяках, каб вы заўсёды былі поўныя незалежнай высокай годнасці ў кожным слове і ў кожным учынку, годнасці тых, хто ніколі не плёўся ў хвасце, хто быў і будзе ў ліку лепшых.

І, магчыма, гэтым я зраблю так, што вам будзе лягчэй жыць, што вы знойдзеце ў сабе сілу выстаяць у хвіліну, якая будзе патрабаваць ад вас мужнасці.

Бо ваш горад з найлепшых гарадоў Беларусі, бо ён малы, але вялікі. Бо вы беларускага старадаўняга кораню, людзі з адвечным глыбінным усведамленнем таго, што ўсю гісторыю вы рабілі справу жыцця (аралі і пісалі кнігі) як мага найлепш, і павінны гэта і надалей. Павінны не нейкаму дзядзю, павінны толькі сабе.

…Узыходзіла ў той дзень усё вышэй чырвонае ад трыццаціградуснага марозу сонца. І па меры таго, як яно ўзыходзіла — вочы вашы ўсё шырэй раскрываліся ад здзіўлення. І вось тут мне і патрэбныя сведкі. Бо дзіву, што ў той дзень убачыў, могуць і не паверыць. Скажуць, што выдумаў небывалае пра звычайны горад.

…Снег пад час гэтага начнога ўраганнага шаленства наліпнуў на дрэвы, муры, вежы і званіцы, на дамы і, аблізаны магутным

ветрам, ператварыўся ў крышталічную ледзяную корку. Кожны порцік, кожная калона, кожная вежа, кожная ліштва заззялі зялёным, аранжавым, блакітным, сінім агнём, як вялізная навагодняя ёлка.

І ўсе будынкі — усе — увесь горад гарэў, іскрыўся, пераліваўся ўсімі колерамі, а найболей блакітным, як адзін вялічэзны, чысцейшай вады дыямент.

Не, такога я яшчэ не бачыў. І — у дадатак да ўсяго — у нябеснай сіні ўстала гіганцкая і тоўстая арка зімняй вясёлкі.

Бачыў я бледныя зімовыя вясёлкі. Але гэтая была ярчэйшая за найярчэйшую летнюю. З усімі пералівамі і адценнямі, ад чырвонай, апельсінавай, жоўтай і блакітная аж да ліловага адцення. На ўсё неба.

І яна адбівалася тысячамі ў мурах дамоў і ў вежах, узнесеных у блакіт.

Яшчэ раз кажу: такога я, мабыць, не пабачу ніколі. Такое нават у перадсмяротнай цемры ўспомніцца і з'явіцца і, як апошняе суцяшэнне, напоіць твой зрок.

І каб канчаткова прывязаць мяне да сябе, Мсціслаў шчодрай рукой выдаў мне яшчэ адно дзіва.

Быццам усяго перажытага, усёй фантазіі было мала — завяршыў яе яшчэ адзін жарт лёсу, нібы заключны мазок дзівоснай карціны.

Была месячная ноч і горад ззяў дыяментамі, як удзень, толькі крыху больш блакітна і прыглушана. Паветра пахнула не выхлапнымі газамі, а пячным дымам. Снег пад нагамі рыпеў не па-сухотнаму, як у Мінску, а звонка, весела, бадзёра.

І раптам гэтыя дыяменты пачалі згасаць, а горад-палац пачаў растварацца ў серабрыстай імгле.

На дадатак да ўсіх раскошаў і дзівосаў Мсціслаў падарыў мне ў ноч на 10 студзеня месячнае зацьменне і павольнае згасанне сваіх дыяментаў у празрыстым паўзмроку, што насоўваўся на свет. Павольна згасала поўня.

Ціха згасаў светлы, іскрысты і зіхоткі горад пад ёй.

І я не магу зараз гаварыць аб ім без захаплення, як не мог бы гаварыць без захаплення пра жывую легенду, што сустрэлася мне на адной са шматлікіх маіх дарог. І я іду зараз разам з ягонымі людзьмі праз усе павароткі лёсу, праз усе бураны, марозныя вясёлкі і зацьменні. Бо толькі так я і магу з большага аддзячыць ім.

Таму што тая ноч — гэта было як быццам гіне чароўны сусвет, а ты павінен аднавіць яго, каб незгасальна стаяў у вачах людзей.

…Мсціслаў — кропля, асколак люстэрка, у якім адбіваюцца

сонца і зоры і ўся няпростая гісторыя Беларусі. Горад, які, здаецца, нічым асаблівым не вызначаецца перад іншымі гарадамі, якіх на Беларусі сотні. Але паглядзіце на яго — і нібы ў фокусе адаб'ецца ў ягонай гісторыі ўвесь наш гонар і наша слава.

Ён чароўны. І ён як сціплы, вонкава непрыкметны чалавек, за плячыма якога багацюшчае жыццё. Сам ён рэдка кіне пра сябе слова. А пачнуць расказваць пра яго іншыя, дык яму пры жыцці помнік ставіць трэба.

:Мсціслаў, невялікі раённы гарадок, утульна стаў на высокім правым беразе ракі Віхры, непадалёк ад яе ўпадзення ў Сож. Ён ляжыць у васемнаццаці кіламетрах ад станцыі Ходасы і на скрыжаванні дарог Магілёў — Смаленск і Орша — Крычаў. Гэта адзін з самых усходніх куткоў рэспублікі, на самай мяжы са Смаленскай вобласцю. Да Магілёва адсюль 111, да Мінска — 312 кіламетраў.

Мсціслаў, як і ўсе гарады, перажываў узлёты і заняпады. У якасці кур'ёзу прывяду вам такія лічбы. У першай трэці XVIII стагоддзя насельніцтва Кіева не перавышала 12 тысяч чалавек. Значна, на пару стагоддзяў раней, у Мсціславе жыло 30 тысяч чалавек. Але Кіеў у ходзе свайго гістарычнага развіцця стаў сталіцай намесніцтва, губерні, сталіцай Украіны. Ужо ў 1763 годзе ў ім жыло 42 тысячы чалавек, а ў 1979-м — 2 мільёны 144 тысячы. Мсціслаў жа, воляй лёсу і гісторыі, перастаў быць такім жа — і нават большым — сярэдневяковым цэнтрам ваяводства і, лежачы нібыта ў баку ад пуцявін гандлю, палітыкі, самой гісторыі, руйнаваны дзесяткамі крывавых нашэсцяў, нібы часова заснуў, як заснулі многія і многія славутыя ў мінулым гарады, якія калісь дыктавалі сваю волю, славіліся вялікай славай і стаміліся ад яе. Як стаміліся Тураў і Суздаль, Растоў Вялікі і Друцк і многія — многія іншыя.

Здаўна-давён населена, абжыта і ўходжана чалавекам мсціслаўская зямля. Едзеш або ідзеш па ёй і паўсюль старыя гарадзішчы і магілы, магілы і курганы. У Доўгавіцкім сельсавеце і ў Сялецкім. І перамяшаныя тут магілы апошняй вайны і курганныя магільнікі Кіеўскай Русі, і таго, што было да яе. Вось яны стаяць над Натапай, кіламетры за два ад вадзянога млына, пляскатыя, нібы разлізаныя часам (пры вышыні ў 1,3 м, 1,7 м, дыяметры іхнія да шаснаццаці-васемнаццаці метраў).

Вось могільнік у Дубейкаве, у самым цэнтры вёскі. 21 насып. І знаходкі: пазалочаныя пацеркі, бразготка-бомка, жалезны нож.

І вось трынаццаць насыпаў у в. Кандратаўск — і гэта Кіеўская Русь.

Але што там Кіеўская Русь!

Вось гарадзішча ранняга жалезнага веку ля в. Міцькаўшчына і

роўнае яму па старажытнасці гарадзішча ў Каробчыне Чырвонагорскага сельсавета. Паўднёва-ўсходні і заходні краі гарадзішча (у густым лістоўным лесе) вельмі стромыя і ў вышыню ледь не на трынаццаць метраў, а насыпаны вал з поўдня метраў каля сямі. Тут у зямлі россыпы керамікі Мілаградскай і Днепрадзвінскай культур, таксама ранні жалезны век. А там гарадзішча ля в. Мазалава. І гэта зноў Мілаградская і Зарубінецкая культуры (пачатак — сёмае стагоддзе да нашай эры, заранка сучаснага "жалезнага " чалавецтва).

Курганы ля в. Новыя Віхраны, ля в. Пячкоўка (на краі кар'ера, які з'еў амаль увесь могільнік), селішча і курганы ля в. Разанцы, гарадзішча і могільнік ля в. Усполле (7 стагоддзе да н. э. — 4 стагоддзе да н. э.).

Густа засялялі гэтую зямлю, густа ў яе і клаліся. Ля той жа самай Пячкоўкі побач са старымі курганамі месца, дзе фашысты расстралялі звыш пяцісот людзей.

Курганы, курганы і курганы. Селішчы, гарадзішчы і зноў курганы. Мноства іх.

І, вядома, самыя галоўныя гарадзішчы гэтай зямлі — гарадзішчы Мсціслаўскія. А сярод іх гарадзішча "Замкавая гара". Высокі мыс на правым беразе Віхры. Абкружаны шырокімі, метраў 60 — 100 і глыбокімі, метраў на 25, ярамі. Плошча 108 на 48 метраў, каля двух гектараў. Па краю Замкавая гара была абкружана яшчэ насыпным валам вышынёю на два з паловаю метры, але ён збярогся не паўсюль.

Першы абследаваў і апісаў гарадзішча славуты беларускі вучоны, этнограф, фальклярыст і археолаг Е.Р.Раманаў, таксама, дарэчы, не дужа і далёкі зямляк з Сожа. Было гэта ў 1893 годзе. У дваццатыя гады абследавалі яго А.М.Ляўданскі і С.А.Дубінскі, у 1978 годзе — М.А.Ткачоў. Раскопкі праводзіў Л.В.Аляксееў. І раскопкі тыя былі на дзіва багатыя. Магутны, да трох метраў, культурны пласт добра захоўваў рэчы арганічнага і неарганічнага паходжання.

Рука археолага ўскрыла жылыя і гаспадарчыя пабудовы, аж цэлых сем ярусаў вулічных маставых (не па гразі хадзілі старажытныя мсціслаўцы — па бярвенным гулкім мосце), вастраколы XIII–XIV стагоддзяў. І мноства розных рэчаў і прыладаў: рамесніцкіх, гандлярскіх, земляробчых, рэчаў культурных і культавых, рэчаў з поўначы, поўдня, усходу (значыць, і туды даходзілі гандлёвыя шляхі старадаўняга Мсціслава). Жылі тут ганчары і гарбары, шаўцы і касцярэзы, майстры ювелірнай справы і майстры апрацоўкі дрэва і выдатныя, на ўвесь славянскі свет славутыя майстры "цаніннай справы " (майстры па паліванай кафлі), залатары і збраяры і іншыя, якіх

нават пералічыць цяжка.

І ўсё гэта ахапляе вялізны час, аж з эпохі бронзы. Усе гэтыя рэшткі Днепрадзвінскай і Зарубінецкай керамікі, сярэднелатэнскія фібулы, грузікі дзякаўскага тыпу (гэта на Дзявочай гары). Усе гэтыя касцяныя восці, дзівосныя звяры з дзвюма галовамі, сярпы, нажы, шкляныя бранзалеты, накладкі калчанаў 13 стагоддзя і жалезныя наканечнікі стрэл.

Бо горад працаваў, але і ваяваў, баронячы створанае сваёй працай. Равы, валы, яры, сцены, а пасярэдзіне рэшткі драўлянай вежы 17 стагоддзя. Апошняй надзеі абаронцаў. На жаль, драўлянай. А дрэва — яно гарыць.

З большага ўсё гэта знойдзенае пайшло ў Інстытут археалогіі АН СССР. Але і там гэтаму будзе цесна. І чаму, каб зведаць старажытны Мсціслаў, я павінен ехаць туды, а не заставацца тут? Не бачыць гэтага на свае вочы тут, або ў Магілёве, на крайні выпадак.

Замкавая гара — не адзінае месца ў Мсціславе, дзе здаўна-давён сяліліся людзі. Непадалёк і Дзявочая гара — гарадзішча Днепрадзвінскай культуры. Другая яе назва "Гарадок": гэта "на палову вярсты" на ўсход ад замка.

Дарэмна гэта ходзяць легенды пра Дзявочую гару, што яе калісьці дзяўчаты нанасілі па пясчынцы. "Дзеві-гарадок" проста аж крычыць сваёй назвай, што гэта "Дзіві-гарадок", месца, дзе водзяцца "дзівы", гэта значыць дзівосы, дзівовішчы, злавесныя пачвары або й добрыя стварэнні, тое, чаму дзівяцца людзі, што створана людзям на здзіўленне. Словам, розныя "дзівія" стварэнні народнай фантазіі эпохі Пяруна, Вялеса і Дажбога.

А можа і эпохі, якая папярэднічала ім, папярэднічала ўвогуле славянам. Бо кераміка, знойдзеная на Дзявочай гары — тыповая кераміка ўсходніх балтаў, а зарубінецкая культура тады ледзь-ледзь займалася тут (ёсць асобныя знаходкі ранняга яе этапу).

Ну а Замкавая гара — проста волат у параўнанні з Дзявочай, Замкавая гара са сваімі валамі, пад'ёмным мостам з паўднёвага боку, Акольным горадам (а вакол яго таксама равы і валы) — гэта ўжо не жыллё родавай абшчыны, а горад ва ўсёй разнастайнасці сваёй гісторыі, гэта ўжо дзевяць — а можа і болей — стагоддзяў гісторыі славян.

Не ўсёй, а пераважна 17 стагоддзя, да часу страшнай "Трубяцкой разні" (1654 г.).

Вулічны мост (мы яшчэ будзем гаварыць пра яго ў сувязі са знаходкай адзінай пакуль на Мсціслаў берасцяной граматы) перасякаў замчышча з поўначы на поўдзень і налічваў аж сем ярусаў бярвенняў. Ніжні датуецца 1239 годам, самы позні — першай паловай 14 стагоддзя. Паабапал моста былі вастраколы

(бярвенняў не шкадавалі), сядзібы, хаты (досыць невялікія па памеры, як тром людзям легчы галовою да ног наступных трох: жыхары, відаць, лічылі, што няма чаго бабіцца ў хаце, калі прасторы хопіць і пад вольным небам у полі ці ў лесе), гаспадарчыя пабудовы і склепы.

Раскапана пакуль што няшмат і да гэтага часу самы ранні раскапаны будынак датаваны 1204 годам, а пад ім ідуць слаі бяднейшыя дрэвам.

Час, аднак, пакажа, што яно было і як. Абы нехта не ўздумаў гаспадарыць на старым гарадзішчы.

Але і знойдзенае да гэтага часу дае шмат матэрыялу для роздумаў і разваг. Касцяныя пласціны ад скуранога калчана, дзе арнамент — складаная повязь раманскага захаду, скандынаўскай поўначы і палавецкага поўдня, крыжы-энкалпіёны (складні) кіеўскай работы, шкляны кубак з арабскім надпісам. І, як часта на Беларусі, прасніцы з валынскага і аўручскага каменя, самшытавыя грабеньчыкі (гэта Каўказ). І, вядома, зброя, ганчарства, вырабы ліцейшчыкаў і гарбароў.

Вось на гэтай узгоркавай сямейцы, на Замку, аддзеленым ад Траецкай і Могільнікавай гор глыбокімі равамі, ды на Дзявочай і ўзнікла ў спрадвечныя язычаскія часы спачатку людское паселішча, а пасля і горад Мсціслаў.

У 12 стагоддзі (1136 год) упамінаецца ён як горад Смаленскага княства ў грамаце князя Расціслава Мсціславіча. У 1156 годзе яго, як умацаванае месца, упамінае Іпацьеўскі летапіс.

Месца было амаль непрыступнае. Ляжала на досыць бяспечнай гандлёвай дарозе (Сож і ягоны басейн ляжаў у межах Смаленскага княства, а купцоў, што плылі Дняпром, маглі абрабаваць, а то і забіць і смаляне і шалёныя, буяныя жыхары магутнага Полацкага княства, для якіх на першым месцы была смеласць, а закон — на другім). Месца ахоўвала з паўднёвага захаду шлях на Смаленск. Месца ляжала, як на той час, менавіта там, дзе трэба, і таму хутка вырастала, рабілася горадам моцным, слаўным, упрыгожаным.

У ім ужо ёсць багаты дзяцінец, мураваныя і драўляныя цэрквы, калі Смаленскі князь Раман Расціслававіч дае яго ва ўдзел сыну Мсціславу. Гэта 1180 год, год пачатку Мсціслаўскага княства. Мсціславу падпарадкоўваюцца Чавусы, Чэрыкаў, Радамля, Расна, Прапошаск, Расціслаў. І князі яго — з роду Манамаха.

Толькі не дужа шанцавала гэтым князям. Мсціслаў Раманавіч, першы ўдзельны князь Мсціслаўскі, а пасля князь Смаленскі, стаў потым князем Кіеўскім і загінуў пасля першага сутыкнення з манголамі на рацэ Калцы ў 1224 годзе.

Ды й самому гораду часамі шанцавала не дужа. З узнікненнем Вялікага княства Літоўскага ён апынуўся на юры, на памежжы паміж княствам і Смаленскай зямлёй. І тут ужо ён сербануў ліха спаўна, пераходзячы ад адных князёў да другіх, аж пакуль не апынуўся ў 1359 годзе — стала на пэўны, вядома, час — у складзе Вялікага княства. Вялікі князь Альгерд аддаў яго ва ўдзел сыну свайму Лугвену Сямёну. Князі літоўскія вельмі хутка аславяніліся і князь Лугвен Сямён не быў выключэннем. Жывучы ў славянскім асяроддзі, укладаючы свой побыт на славянскі манер, прыняўшы праваслаўе, ажаніўшыся з дачкой Дзмітрыя Данскога (у год Кулікоўскай бітвы, дарэчы), ён і гаварыў і выдаваў свае граматы па-старабеларуску. У тым жа 1380 годзе засноўвае ў наваколлі Мсціслава Пустынскі манастыр. А ў 1407 годзе засноўвае Ануфрыеўскі манастыр, а ў 1410 годзе сын яго Юры змагаецца пад Грунвальдам. А ў XV–XVI стагоддзях зноў точацца войны, палаюць гарады, з-за дынастычнай бязглуздзіцы, з-за ўсобіцы і ўладалюбства князёў, каралёў і цароў многімі тысячамі гінулі аршанскія, полацкія, маскоўскія, мсціслаўскія хлопцы. Араташ, рамеснікі, кніжнікі, майстры. Залатыя чалавечыя рукі! Замест таго, каб ствараць, — яны бяруць меч і забіваюць.

І гэта ў той час, калі адзіны святы і стакрат бласлаўёны толькі той меч, што ўзняты на абарону роднай страхі, родных муроў, роднага ачага.

На шчасце, Мсціславу ёсць чым ганарыцца і тут. Яму давялося трымаць у руках меч высакароднай і праведнай вайны за айчыну і за самое існаванне роднага племя.

Здарылася гэта на самым пачатку XV стагоддзя. Тады вялікая бяда звалілася на землі славян. Ішоў Тэўтонскі ордэн, ставячы пад пагрозу не толькі мову, свабоду і гонар, але і самое існаванне славян. З боку рыцараў зачэпкай вайны 1409–1414 гадоў было тое, што Жмудзь упарта трымалася язычаства. Але немцы лічылі не меншымі язычнікамі не толькі праваслаўных, але і католікаў.

Жмудзь паўстала. З яе земляў даляцеў адчайны, перадсмяротны лямант аб дапамозе:

"Выслухайце нас, прыгнечаных, змучаных… Ордэн не шукае душаў нашых для бога, ён шукае земляў нашых для сябе, ён нас давёў да таго, што мы павінны або хадзіць з торбамі, або разбойнічаць, каб было чым жыць. Як яны пасля таго… пасмельваюцца хрысціць? Хто хоча іншых умываць, павінен быць сам чысты. Усё… у нас забралі: штогод звозілі дзяцей нашых да сябе у заложнікі, старэйшынь нашых завезлі ў Прусію, іншых з усім родам агнём спалілі — а яшчэ крыж святы на адзенні носяць. Злітуйцеся з нас!.. успомніце, што мы людзі ж, створаныя па вобразе і падабенству божыю, а не звяры якія"…

Войскі польскага кароля Ягайлы (50 харугваў) і літоўскага вялікага князя Вітаўта перайшлі межы ордэна і 15 ліпеня сутыкнуліся пад вёскай Грунвальд.

Грунвальд.

У рыцараў перавага. Бо яны ад патыліцы да пятак захутаны ў сталь. Бо пусціць нават трох ратнікаў на аднаго рыцара азначала прыблізна тое самае, што пусціць трох воінаў з вінтоўкамі на танк.

У склад войска Вялікага княства Літоўскага ўваходзілі харугвы Берасцейская, Ваўкавыская, Лідская, Навагрудская, Гародзенская і іншыя. Князь Мсціслаўскі Сямён Аўгвен кіраваў так званымі рускімі (часам іх з часоў Салаўёва, невядома чаму, называюць яшчэ "смаленскімі") харугвамі. Гэта значыць — Полацкай, Віцебскай, Смаленскай, Мсціслаўскай.

Іхняй стойкасці, таму, што яны стаялі насмерць у той час, калі цяжкая кавалерыя ордэна пацясніла атрады вялікага княства, абавязаныя былі Вітаўт і Ягайла тым, што мелі час ачухацца, акрыяць, сабраць сілы і нанесці рашучы ўдар, абкружыць і знішчыць армію ордэна, нягледзячы на яе сілу, мужнасць, ваенны вопыт і дасканалае валоданне мастацтвам вайны. Каля 40.000 забітымі і 15.000 узятымі ў палон, увесь абоз страцілі рыцары, і сам магістр Ульрых фон Юнгінкен быў забіты ў сечы. Самое існаванне Тэўтонскага ордэна пасля Грунвальда ператварылася ў нявольную агонію.

Мсціслаўцам і іхняму Мсціслаўскаму князю няма чаго саромецца сваіх паводзін на полі гэтай бітвы. Наадварот, гэта іхнія мячы разам з мячамі суседзяў кавалі перамогу і здабылі ёю ўратаванне свету славян.

Мсціслаўскі князь, дарэчы, вызначыўся воінскімі талентамі не толькі тут, а і да Грунвальда (1392 год), разбіўшы шведаў на Няве, і пасля Грунвальда (1411 год), калі ён на чале ноўгарадцаў зноў хадзіў на шведаў, помсцячы ім за набег, сёлы паваяваў і спаліў і ўзяў вонкавыя ўмацаванні горада Выбарга.

Але гэта рэчы лакальныя. Вяршыняй ягонай мужнасці і мужнасці мсціслаўцаў, безумоўна, быў Грунвальд, адна з тых бітваў, у якіх славяне былі ўратаваны ад рабства і знікнення, у якіх яны былі ўзвялічаныя і зберажоныя, як каштоўнасць і этнічная велічыня.

І сын яго, Юры, быў услаўлены, як многія мужы горада.

Унучка Юрыя пайшла замуж за князя Жэслаўскага (Заслаўскага), якому, разам з родам быў нададзены тытул князёў Мсціслаўскіх. Але Міхаіл Жэслаўскі быў апошні Мсціслаўскі князь. Старэйшы сын ягоны памёр, а малодшы, Хведар, у 1526 годзе ад'ехаў у Маскву (унук ягоны, таксама Хведар, стаяў за

самазванца, пасля ўдзельнічаў у змове супраць яго, ваяваў супраць паўстанцаў І. Балотнікава, узначальваў так званую сямібаяршчыну, выбіраў каралевіча Уладзіслава рускім царом, але й пры Міхаіле Раманаве заставаўся ў першых саноўніках: на ім род Мсціслаўскіх скончыўся).

Што ж датычыцца Міхала, дзеда ягонага, то ён усынавіў каралевіча польскага Сігізмунда, будучага кароля Сігізмунда Аўгуста, і такім чынам кончылася Мсціслаўскае княства і ў 1528 годзе горад стаў каралеўскай воласцю, пад уладай старостаў, а ў 1569 годзе, пасля адміністрацыйнай рэформы зрабіўся галоўным горадам Мсціслаўскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. Спачатку складалася яно з аднаго павету, Мсціслаўскага, а ў першай палове 17 стагоддзя былі створаны ў нашым ваяводстве паветы: Крычаўскі, Магілёўскі, Чавускі, Чэрыкаўскі.

У 1569 годзе кароль Уладзіслаў IV даў галоўнаму гораду ваяводства магдэбургскае права. Быў створаны магістрат. Першым войтам горада стаў Язэп Корсак. Гораду была дадзена пячаць і першы сапраўдны герб: меч і шчыт пад ім.

Мсціслаў 16–17 стагоддзяў — вялікі горад, які вядзе гандаль з Захадам і Усходам. Менавіта тады ён налічвае 30 тысяч жыхароў і тэрыторыя ягоная дасягае прыроднага, так званага Цялячага рова, што абкружаў горад з поўдня і, працягнуўшыся на дзесяць вёрст, выходзіў на заходняй гарадской ускраіне да Віхры. Менавіта тады, у канцы шаснаццатага і ў семнаццатым стагоддзі, пачалі, як грыбы, вырастаць камяніцы, касцёлы і кляштары.

Умацаванні гэтага "Вялікага горада" былі, як на той час, вельмі моцныя.

Вежа-данжон пасярэдзіне Замчышча.

Па перыметры замчышча — вал вышынёй у два з паловай метры, увянчаны сцяной-вастраколам з бярвенняў. Вышыня яе і колькасць вежаў на ёй мы не ведаем (раскапаная толькі нязначная частка Замчышча). Ды й не яна і не вал былі галоўнай перашкодай ворагу. Галоўнай перашкодай былі яры, над якім ўзвышаліся вал і сцяна.

Шырынёю ў 60 — 100 метраў (закідаць іх практычна немагчыма нават для сучаснай тэхнікі) і глыбінёй у 25 метраў, яны ўражаюць і зараз. І зараз жудасна, стоячы на вале, глядзець уніз. Амаль стромыя адходны пад нагамі. А калі за імі сачылі, падсыпалі, раўнялі і, магчыма, забівалі ў схіл нахіленыя ў бок ворага вастраколы, гэта была, мабыць, амаль адвесная прорва, узлезці на якую чалавеку, абцяжаранаму кальчугай, было неймаверна цяжка.

Тым больш, што на месцы цяперашняга ўз'езду на Замчышча таксама быў яр і над ім пад'ёмны мост. І гэта прыродны роў

запаўняўся яшчэ вадою з магутных тады крыніц Здароўца.

Адчынілася брама замчышча. Адгучаў пад нагамі пад'ёмны мост над прорвай.

Вакол — горад са шматлікімі цэрквамі, касцёламі, крамамі. Ад брамы Замчышча да яру, які абкружае горад, і валоў на ім — радыяльна разыходзяцца чатыры вуліцы да чатырох гарадскіх брам: Троіцкай, Апанасаўскай, Спаскай і Пацоўскай.

І вакол манастыры-крэпасці, якія прыкрываюць падступы да горада. Скажам, той жа Пустынскі, той жа Ануфрыеўскі.

Горад вартуе, горад не спіць.

…Пра будаўніцтва і тагачасную архітэктуру мсціслаўскую я раскажу ў свой час, а пакуль што трэба пагаварыць пра асноўныя вехі гісторыі Мсціслава тых часоў. На жаль, гэта будзе пераважна гісторыя войнаў, пажараў, аблог, загібелі многіх і многіх людзей. Было мноства дробных сутычак, былі і больш буйныя сечы.

Трынаццаць год (1654–1667 г.г.) цягнулася вайна між Масковіяй і Рэччу Паспалітай.

У маі 1654 года рушыла ад Бранска на Мсціслаў маскоўскае войска на чале з князем А. М. Трубяцкім. На світанку 22 (па некаторых звестках 12) ліпеня Мсціслаў быў абложаны. Абложнікі, разграміўшы яго, пад гарачую руку, учынілі, так званую "трубяцкую разню".

Пра гэта і гаворыць фрэска XVII стагоддзя на гэтую тэму ў Мсціслаўскім Кармяліцкім касцёле. На ўсіх археалагічных раскопках Замчышча, ніжэй сучасных гародаў ідзе таўшчэзны, магутны пласт разбурэння, друзу і вугалю, рэчаў 17 стагоддзя, чыгунных і каменных ядраў, зруйнаваных дамоў з багатымі кафлянымі печкамі і г.д.

Пра кафлі я ўпамянуў не так сабе. Іх вывезлі. А пакольк Мсціслаў славіўся на ўвесь свет перш за ўсё майстрамі "цаніннай справы", тымі, што ведалі сакрэты вырабаў кафеляў, і дойлідамі, то перш за ўсё вывезлі менавіта іх. Я раскажу пра гэта больш падрабязна, гаворачы пра Сцяпана Палубеса, пра іншых майстроў і справы іхняга жыцця.

Зусім непадалёк ад Мсціслава, у цяперашняй Смаленскай вобласці, у вёсцы Андрусава, быў урэшце ў 1667 годзе ўкладзены мір. Мсціслаў застаўся за Рэччу Паспалітай.

Горад так і не аправіўся да канца ад разгрому. Рос, праўда, ён, расло і яго насельніцтва, але замак і многія храмы ляжалі ў руінах і ранейшага багацця і бляску ён так ніколі і не дасягнуў. Тым больш, што вайна не абмінала яго і пасля.

Паўночная вайна са шведамі прагрукатала навалай таксама праз Мсціслаўскае ваяводства. І Левенгауп ішоў праз Мсціслаўшчыну, і Пётр І. Напярэдадні бітвы са шведамі 30 жніўня

1708 года ля сяла Добрае (16 кіламетраў ад Мсціслава) горад наведаў Пётр I.

Тут нарадзіліся Мсціславец, Гарэцкі, Прахаў, Насовіч, людзі, якія сапраўды праслявілі горад і зямлю мсціслаўскую.

Вынікам работы гэтых людзей былі разумныя і добрыя кнігі, вынікам "наведвання" другога была бітва пад Добрым (заспелі ворага ноччу, нечакана), у якой шведы, пасупраціўляўшыся дзве гадзіны, пакінулі на полі бою тры тысячы забітых, сцягі, мноства параненых.

Пасля скончылася і Паўночная вайна. Горад жыў сабе і жыў, але пакуль што яшчэ не стаў глухой правінцыяй.

Будавалі і гандлявалі, хаця і зменшылася колькасць рамеснікаў і майстроў.

Васемнаццатае стагоддзе ў гісторыі Мсціслава ўжо амаль не мае гераічных, гучных старонак. Горад ужо не вяршыць лёсаў гісторыі, горад нібы на мяжы летаргічнага сну, ён жыве, як многія і многія гарады правінцыяльнай Рэчы Паспалітай. Памалу будуе, памалу гандлюе. Людзі нібыта прывыклі да ўсяго на шляхах страшнай, крывавай і нясправядлівай сваёй гісторыі і, перш за ўсё, звыкнуліся амаль абыякава пераносіць свае пакуты і прымушаць іншых.

Мсціслаў не быў выключэннем з правіл. Тое самае рабілася і ў іншых мясцінах.

У 1772 годзе, па першым падзеле Рэчы Паспалітай, Мсціслаў адыходзіць да Расійскай імперыі.

У 1777 годзе горад прызначаецца цэнтрам Мсціслаўскага павету Магілёўскай, потым Бранскай, потым зноў Магілёўскай губерні, а ў 1781 годзе атрымоўвае новы герб (уласна кажучы, герб-здзек): шчыт, а ў ніжняй частцы бяжыць па зялёнай траўцы лісіца.

Калі гэтым намякалі на жывёльны свет Мсціслаўшчыны, то лісаў там па-мойму, столькі ж, колькі і паўсюль на Беларусі, а калі гэтым намякалі на пэўную хітрасць, спрыт і абаротнасць мсціслаўцаў (кажуць-жа, што "мсціслаўцы не паміраюць на сваёй лаўцы"), то не адны яны такія былі і нашто было знеслаўляць іх такім гербам на ўсю Расійскую імперыю, калі быў у іхнім гербе меч і шчыт, калі славіліся яны не толькі гандлёвым спрытам і ўменнем сяк-так выкруціцца з цяжкіх абставін, але і мужнасцю, стойкасцю ў войнах.

І так зажыў Мсціслаў горадам павятовым. Жыццё ягонае ў XIX стагоддзі можна было б назваць нават дрымотным, каб не дзве акалічнасці. Першая: як і раней, не абыходзілі яго бокам розныя навалы і войны. Другая: рэдка які павятовы горад даў Беларусі і ўсёй Расіі так зайздросна многа славутых і высокародных людзей:

вучоных (гісторыкаў, археолагаў, этнографаў, лінгвістаў), мастакоў, пісьменнікаў. Аб іх я скажу ў сваім месцы. Цяпер жа — аб грамадскіх патрасеннях.

Не абмінула горад і вайна з Напалеонам 1812 года.

Баграціён ішоў праз Мсціслаў пад Смаленск. Яму ўдалося дзе прарвацца, а дзе і праслізнуць праз французскае войска і злучыцца са сваімі асноўнымі сіламі. Горад занялі французы. Але ён ляжаў на ўзбочыне ад мясцін галоўных бітваў. Калі французская армія адступала, гараджане напалі на французаў у Зарэччы, пабілі частку, а частку прымусілі бегчы.

Увогуле горад на працягу XIX стагоддзя не тое каб перажываў заняпад, а проста жыў так сабе, сяк-так. Паменела каменных будынкаў, стала менш жыхароў (першы прызнак гэтага на тыя часы — змяншэнне колькасці цэркваў: зніклі сярэдневяковыя цэрквы Іллінская, Багаслоўская, Апанасаўская, Прэабражэнская, Мікольская, зніклі кармеліцкі і бернардынскі кляштары), і вельмі паменела сярод гараджан, як і паўсюль на Беларусі, пісьменных людзей.

Ведаю, што мае дадзеныя крыху не супадуць з дадзенымі сучаснай кароткай энцыклапедыі, але я бяру энцыклапедыі тых часоў. А згодна іх у Мсціславе па перапісу 1896 года лічылася 8467 чалавек, (з іх 38 працэнтаў пісьменных, 62 працэнты непісьменных). Шлюбаў сорак, нованароджаных 272 (146 хлопцаў і 126 дзяўчынак), памерла 126, прырост 146. Так званых "фабрык і заводаў" 13 з 35 рабочымі і вытворчасцю на сумму 20687 рублёў. Бальніц 3, багадзельняў 4, гарадское трохкласнае вучылішча, парафіяльнае і духоўнае вучылішчы, 3 бібліятэкі, 2 кніжныя крамы.

Заводы былі вапенныя, гарбарныя, свечныя, піваварныя і мылаварныя, 4 цагельні, 2 млыны, 6 крупадзёрак, 2 маслабойні.

У 1889–1902 гадах выходзіла першая мсціслаўская штотыднёвая газета "Белорусский комиссионер".

Першая сацыял-дэмакратычная група рабочых-іскраўцаў узнікла ў 1903 годзе і ў 1905 годзе, у маі, аформілася ў Мсціслаўскую арганізацыю РСДРП. Уваходзіла ў Палескі камітэт РСДРП (б). Налічвала ў канцы 1905 года 61 чалавек.

Распаўсюджвала нелегальныя лістоўкі і брашуры, вяла агітацыю (была звязана з Магілёўскай арганізацыяй, Смаленскім камітэтам РСДРП, з Замежным бальшавіцкім цэнтрам), у 1905 годзе арганізавала двухтыднёвую забастоўку рамеснікаў і рабочых майстэрняў Мсціслава. 1 мая 1906 года правяла дэманстрацыю працоўных і мітынг каля муроў Тупічэўскага манастыра. Вынікам яе агітацыі былі дзесяць сялянскіх выступленняў на працягу 1905–1906 гадоў. На падаўленне іх даслана была пяхота, казакі і

паліцыя. З падаўленнем першай рэвалюцыі аслабнула і дзейнасць арганізацыі, якая крыху ажывілася толькі недзе каля 1910 года, пасля чаго звестак пра яе аж да лютага 1917 года не было.

Падзеі пачатку XX стагоддзя, хочаш не хочаш, трэба падаваць пункцірам. Звестак (у тым ліку статыстычных) мала, яны няпоўныя, а часам і няпэўныя. Таму можна гаварыць толькі пра рэчы несуменныя, а іх не так многа.

На пачатку XX стагоддзя ў Мсціславе ўжо былі мужчынская і жаночая гімназіі, чатырохкласнае духоўнае вучылішча, мужчынскае і жаночае ніжэйшыя вучылішчы, дзве царкоўна-парафіяльныя школы, пачатковае вучылішча пры Тупічэўскім манастыры і народнае вучылішча. У 1914 годзе сюды эвакуіравалі з Панявежа настаўніцкую семінарыю (на яе базе ў лістападзе 1925 года адкрыўся Мсціслаўскі педтэхнікум).

Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 года ў горадзе пачала выходзіць газета "Мстиславский голос", у сакавіку гараджане разагналі царскую адміністрацыю, 15 мая быў арганізаваны першы прафсаюз рабочых і служачых, у лістападзе ўстаноўлена Савецкая ўлада, 10 снежня арганізавана РКП(б), 10 студзеня 1918 года ў гарадскім клубе-тэатры "Ратонда" на мітынгу рабочых, салдат і матросаў абвешчана стварэнне Часовага рэвалюцыйнага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, а 24 студзеня 1918 года адбыўся першы павятовы з'езд Саветаў. У сакавіку 1918 года адбыўся другі павятовы з'езд Саветаў, на якім старшынёй выканкома абралі бальшавіка Ф. М. Малахоўскага, а павятовым камісарам А. Л. Юрчанка (у ліпені 1919 года ён стаў старшынёй выканкома).

Германская акупацыя захапіла частку Магілёўскай губерні, таму ў сакавіку 1918 года ў Мсціслаў перавялі выканком Магілўскай губерні, губком РКП(б) і іншыя ўстановы.

У 1919 годзе Мсціслаў (як і ўся неакупіраваная частка Беларусі, аб'яднаная са Смаленскай губерняй) увайшоў у склад РСФСР, а 3 сакавіка 1924 года адышоў зноў да БССР у адпаведнасці з пастановай Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта.

Але пра гэта можа і хопіць. Я не пішу гісторыі і не трэба тут змяшчаць звестак, якія можна атрымаць, раскрыўшы кожную энцыклапедыю, і амаль кожны даведнік. А я тут пастараюся расказаць аб тым, што не ўвайшло або толькі часткова ўвайшло ў даведачную літаратуру, аб тым, што сабрана з розных крыніц, што калісьці чытаў або чуў, што сабрана адусюль па зернейку. Пра тое, на паўторнае збіранне чаго ў чытача можа не хапіць часу, ахвоты або магчымасці.

…Горад фарміраваўся ў сівую даўніну на паўдзённых узгор'ях

Смаленскага ўзвышша, як было ўжо сказана, навакол Замкавай, Троіцкай і Дзявочай гор.

Адгор'і гэтыя невысокія (да 239 метраў над узроўнем мора), лагодныя, клімат мяккі, колькасць ападкаў дастатковая, глебы добрыя. Плывуць па гэтай зямлі Сож, Віхра, Натапа і іншыя рэкі і рачулкі. Пад лесам зараз 14,4 працэнта плошчы. Ёсць радовішчы фасфарытаў, крэйды, цагельнай сыравіны.

І вось узнікаюць на гэтай ласкавай зямлі паселішча, а потым горад, жыве і развіваецца, як кожны жывы арганізм, ведае перыяды заняпаду і ўзнясення, бурыцца і зноў будуецца.

Мы можам толькі ўскосна меркаваць пра тое, як выглядаў горад у XII-XIII стагоддзях. Равы, валы намякаюць нам на гэта. Ну і рэшткі нейкай царквы той эпохі. Бо знойдзеныя былі паліваныя пліткі падлогі, кавалкі звана, частка свінцовага даху. І плінфы — тонкія і вялікія цагліны, з якіх будавалі палацы і храмы ва ўсіх усходнеславянскіх землях аж да часу мангольскага нашэсця.

Сучасны сілуэт горада складаюць будынкі значна больш познія. Гэта царквы Крыжауздвіжанская, Троіцкая (зберагліся ў фрагментах), асабліва манументальныя касцёлы і кляштары. Гэта ўжо ў XVII–XVIII стагоддзі. Будуюць на пачатку XVII стагоддзя касцёл, калегіі і аптэку езуіты, у цэнтры горада будуюцца дамінікане, аў 1614 годзе кармеліты ўзводзяць на Замкавай гары свой касцёл, самы велічны ў Мсціславе. Праўда, наконт заснавання яго існуюць рознагалоссі. Некаторыя кажуць, што касцёл гэты быў пабудаваны ў 1637 ці нават 1638 годзе. А некаторыя стаяць на тым, што заснаваны ён быў усё ж у 1614, а ў 1637 да яго толькі прыбудавалі цёплую капліцу.

Гэты храм мог бы зрабіць гонар кожнаму гораду, тым больш, што ў ім зберагліся фрэскі, у прыватнасці вельмі рэдкія на Беларусі фрэскі на свецкія тэмы: штурм горада Трубяцкім і "трубяцкая разня". Зроблена гэта па свежых слядах здарэння і зроблена здорава. Ды і ўвогуле храм уражвае кожнага і сваім вонкавым выглядам, і сваім інтэр'ерам. Будынак трывала, і, адначасова, лёгка стаіць на зямлі. Ён, нібыта, і прысадзісты, але, адначасова, такі бязважкі, што душа разам з ім адрываецца ад зямлі, асабліва калі над вежамі ягонымі бягуць аблокі, і сам ты разам з храмам, плывеш з імі некуды.

У 1746–1750 гадах касцёл рэканструяваў вядомы архітэктар Ян Крыштэф Глаўбіц, майстар барока, таго, позняга, у самай развітай ягонай форме. Ён перарабіў вярхі вежаў, галоўны фасад і дах. Да іншых работ Глаўбіца (1700–1767) належыць касцёл у Сталавічах і палац архіепіскапа ў Магілёве. Ён жа рэканструяваў Сафійскі сабор у Полацку. Значная частка работ Глаўбіца, на жаль, не збераглася.

Зараз Кармеліцкі касцёл у Мсціславе рэстаўруецца. Работы, на жаль, ідуць павольна, нават занадта павольна. Мала кваліфікаваных работнікаў.

У 1626 годзе быў уздведзены езуіцкі касцёл з кляштарам (таксама трохнефная, дзвюхвежавая базіліка), у 1842 годзе перароблена ў праваслаўны Мікалаеўскі сабор. Зараз гэты здаровы будынак моцна запушчаны, а не так жа яшчэ даўно тут быў дом культуры. Храм, па-мойму, нават не пастаўлены пад ахову. А яго хапіла б яшчэ на пяцьсот год, і ўвесь гэты час яго можна было б выкарыстоўваць.

А то атрымоўваецца, што камені адказваюць бакамі за ўчынкі людзей і за тыя ідэі, што жылі ў іхніх галовах. І атрымоўваецца, што сілы і грошы народныя выдаткуюцца марна ў барацьбе з міражамі.

Глядзіце самі. Вось стаяла ў цэнтры горада праваслаўная Афанасьеўская царква. Вось у 1772 годзе яна не спадабалася. Знеслі. Збудавалі на яе месцы бернардынскі касцёл з кляштаром. Кацярына II, як мы ведаем, спачатку заігрывае нават з забароненым паўсюль езуіцкім ордэнам.

Па плане 1778 года на галоўную плошчу Мсціслава выходзяць езуіцкі касцёл (на яго арыентуецца восевая вуліца), Троіцкая царква і Бернардынскі кляштар, але ў 1831 годзе, пасля паўстання, большасць каталіцкіх і ўніяцкіх храмаў зачынена ці перададзена праваслаўю.

А тут яшчэ пажар 1858 года крыху пашкодзіў Бернандынскі комплекс. Тады яго з лёгкім сэрцам разбіраюць, а на тым месцы будуюць царкву Аляксандра Неўскага. Добра, што нехта ў нашы дні падаў ідэю размясціць у ёй музей. А то чаго б прасцей — разабраць і на яе месцы зноў нешта ўзвесці.

Мы не павінны помсціць будынкам за тое, што рабілі ў жыцці людзі, якія іх узводзілі.

Скажу болей таго: некаторым рэчам мы павінны вучыцца нават у людзей, ідэі, жыццё, учынкі якіх нам агідныя і брыдкія. Чалавек, калі ён чалавек разумны, бярэ зерне добрай ідэі нават у ворага, скажу болей, нават у вылюдка, калі ў яго такая ідэя часам з'яўляецца. Іначай ён не заслугоўвае назвы чалавека разумнага. Растлумачу зноў жа на прыкладзе Мсціслава і ягоных камяніц. Мы не ведаем імён тых, хто будаваў у Мсціславе храмы і камяніцы аж да XVII стагоддзя, хто распісваў будынкі, упрыгожваў іх разьбою. Як ні дзіўна, сярэдневяковае праваслаўе страшэнна абыякавае да творцы, да асобы, якая на яго працавала, да дойліда, майстра фрэскі і іконы, разьбяра. І так паўсюль. Трэба быць сямі пядзяў у лобе, каб заслужыць на ўпамінанне. А ўжо біяграфіі нават у Рублёва і Феафана Грэка лічы што няма. Творца знікае,

раствараецца ў бязлікай масе, нібы ўсе гэтыя цудоўныя будынкі выраслі з зямлі, а роспісы і іконы ўзніклі самі сабой.

За пяцьсот год гісторыі Мсціслава, ад яго ўзнікнення, ніводнага імя. Ніводнага. Нібы жыццё і творчыя пакуты гэтых людзей на тое не заслугоўвалі.

Ёсць, аднак, і адно імя праваслаўнага Мсціслаўскага майстра, якое дайшло да нас. Дайшло па Маскоўскіх крыніцах другой паловы XVII стагоддзя. І дайшло толькі таму, што справа, што мастацтва, майстрам якога ён быў, было для тагачаснай Масквы справай новай і дагэтуль небывалай.

Імя гэтага майстра Сцяпан Палубес. У Маскве яго называлі яшчэ Сцяпан Іваноў, але мы не ведаем, ці гэта было яго імя па бацьку, ці прозвішча. З аднаго боку "лічыць", называць па бацьку, чалавека простага паходжання (і нават купца) у Маскве не было прынята, а на тагачаснай Беларусі не было прынята зусім. З другога боку ў дадзеным выпадку маглі зрабіць і выключэнне з правіла, надта ўжо незвычайным і рэдкім майстэрствам валодаў чалавек.

А ўмеў ён рабіць вясёлкавыя кафлі і шматкаляровыя рэльефы з маёлікі.

Мне могуць запярэчыць, што Маскоўская дзяржава ведала кафельнае рамяство і раней. Ну так, ведала, але менавіта і толькі як рамяство, а не майстэрства. Маскоўская кафля была ўкрытая празрыстай аднатоннай палівай, часцей за ўсё зялёнай, радзей бура-карычневай. Ішоў па кафлі арнамент, а таксама коннікі, птушкі, сцэны з казак, ваенныя сюжэты. Але гэты дробны аднатонны рэльеф не глядзеўся здалёк: так сабе, плямы і разводы, пісягі і незразумелыя завіткі.

Зблізку, на ляжанцы або грубцы, калі ласка, разглядай колькі хочаш. На грубкі гэтая кафля пераважна і ўжывалася.

Іншая справа кафля беларускіх (мсціслаўскіх, копыскіх і іншых) майстроў. Гэта кафля расфарбаваная непразрыстымі эмалямі і ў мноства колераў; зялёнае плеціва лістяў, завіткі і візэрункі сцяблін, пабегаў, вусікаў на сінім і блакітным полі, залацістыя плямы "павіных вачэй", белыя і карычневыя іскры. Прычым гэта не толькі плоскія пліткі. Гэта карнізы, каляровыя, пукатыя паяскі, калоны, вычварна абвітыя хмелем або вінаграднай лазой.

Будынкі ззялі на сонцы, як вясёлка. І ззяюць зараз.

Гэтае беларускае, мсціслаўскае майстэрства мела даўнія традыцыі. Ніжняя царква і Каложа ў Гродні мелі ўмураваныя ў цэглу муроў паліраваныя рознакаляровыя валуны і паліваныя маялікавыя пліткі, што разам складала кветкі, колы, крыжы. У той жа час храмы Паўночна-Усходніх княстваў не карысталіся гэтай

тэхнікай. Там храмы былі белакаменныя з белакаменнымі ж рэльефамі. Але і гэтая традыцыя была перарваная больш чым на стагоддзе мангольскім пагромам, калі на мураваныя будынкі ўвогуле не хапала ні сіл, ні сродкаў, ні, шчыра кажучы, жадання (нашто старацца, калі заўтра ўсё адно прыйдуць і разбураць).

А будаўнічая традыцыя княстваў Паўночна-Заходніх не была спыненая. Яна развівалася і ўдасканальвалася і вось у XVII стагоддзі прыйшла з Беларусі ў Маскву. Якраз тады, калі там пачалі асабліва цаніць вонкавую ўбранасць, багацце, шыкоўнасць і пышнасць, казачную вясёлкавасць будынка. Так што беларускія майстры кафлі, размаляванай яскравымі эмалямі, якраз прыдаліся да кампаніі і нават пачалі верхаводзіць у ёй. У прыватнасці, Ігнат Максімаў з Копысі і, асабліва, як я ўжо казаў, мсціславец Сцяпан Палубес.

Мы не ведаем яго падрабязнай біяграфіі, не ведаем гадоў нараджэння і смерці, не ведаем, што ён рабіў у Мсціславе, з якога быў родам. Мы ведаем толькі ягоныя маскоўскія работы, якія праславілі яго.

Мы гаварылі ўжо, што пасля "разні" 1654 года князь Трубяцкі вывез у Маскву з Мсціслаўля гарадскіх майстроў, у ліку якіх быў і Сцяпан Палубес. Спачатку ён, відаць, працаваў на князя, пасля стаў царскім майстрам.

Упрыгожваў Уваскрасенскі сабор у Новым Іерусаліме, а з 1666 года зрабіўся майстрам Аружэйнай палаты Маскоўскага Крамля. Разам з іншымі беларускімі майстрамі (з Копыся, Оршы і іншых гарадоў) аздабляў Пакроўскі сабор у Ізмайлаве (1674 год), рабіў фрызы царквы Грыгорыя Неакесарыйскага (1669 год), удзельнічаў у афармленні Церамнога палаца, Аптэкарскага прыказа і царквы Спаса за залатой рашоткай у Крамлі, стварыў шматкаляровыя маялікавыя рэльефы апосталаў для царквы Успення ў Ганчарах (1691), на якіх пануе гармонія карычневага, чорнага, сіняга, зялёнага і залатога колераў.

Гэта стараннямі ягоных рук расцвілі на мурах маскоўскіх палацаў і цэркваў кветкі, грона, зёлкі, павіныя пер'і. Блішчастая, вясёлкавая гульня святла і колераў. Залацістага, блакітнага, сіняга і колеру марской вады.

І вышэйшае, па-мойму, што ён стварыў, лазурны церам на Круціцкім падвор'і. Небывалая, лёгкая, сіняя казка, зірнуўшы на якую, лягчэй робіцца жыць. Дзіва, пабудаванае з нябеснага блакіту і месячнага святла.

Так, адзіны і небывалы ў сваім родзе, непераўзыдзены быў мсціслаўскі майстра Сцяпан Палубес.

На жаль, у родным ягоным горадзе не засталося нічога створанага ягонымі рукамі (замест гэтага ў раскопе тоўсты след

пажарышча). Мала таго, сакрэт высокага мастацтва ягонага загінуў у войнах. А калі зірнеш на тую кафлю, на таго "кабанчыка", якім абкладаюць і "упрыгожваюць" муры дамоў сучасныя дойліды (не толькі мсціслаўскія), — хочацца адно махнуць рукою.

XVIII і XIX стагоддзі ў Мсціславе ўвогуле перыяд будаўнічага ўпадку. Рэгулярны план 1778 года з прамавугольнай сістэмай вуліц парушае традыцыі гарадской забудовы. Пасля архітэктары, як заўсёды, парушаюць і той план. Давяршаюць справу частыя пажары (асабліва моцныя ў 1858 і 1863 гадах). Пасля пажараў забудоўваюцца дзве і як хто хоча. На месцы плошчы разбіваюць бульвар (цяперашні бульвар разбіты ў 1863 годзе).

Пажары ўвогуле часта шкодзілі гораду. Пад час агульнагарадскога пажару 1858 года згарэў, напрыклад, не прастаяўшы і стагоддзя, царскі палац, узведзены для Кацярыны II пад час яе падарожжа ў Крым (Мсціслаў тады, у 1787 годзе, сустракаў яе з вялікай помпай, прычым асабліва вялікая ўрачыстасць адбывалася ў Кармяліцкім касцёле).

Многія пабудовы пажэрлі войны, час, а найбольш нядбальства і варварскія адносіны людзей да свайго мінулага, да сваей спадчыны, да продкаў сваіх. Так вось сабе зніклі многія цэрквы ў самім Мсціславе, манастыры ў наваколлі ягоным.

Тым больш трэба берагчы тое, што засталося. Хай сабе той жа царкве Аляксандра Неўскага толькі сто год — будзе і яна калісь узорам таго, як будавалі ў той час людзі, а пакуль няхай бы несла службу, як музей.

Хай сабе ў Ануфрыеве ад былога манастырскага комплексу (а манастыр заснаваны ў 1407 годзе героем Грунвальда Лугвенам Альгердавічам) збераглася адна толькі царква XVIII стагоддзя — яе позняе барока павінна яшчэ доўга радаваць людзей. Таксама як позняя, на дзіва зграбная, тамтэйшая званіца.

Нічога нельга нішчыць. Ні Мікалаеўскага сабора з будынкам семінарыі, ні царквы Спасапраабражэння на могілках. Усё мае каштоўнасць — вялікую ці крыху меншую, але каштоўнасць — у будучым нашым жыцці.

Мы павінны шанаваць усё гэта як і позні (1906 год) будынак гімназіі, у якім вучыліся столькі карысных і нават вядомых сыноў і дачок нашай зямлі (у тым ліку паэт Аркадзь Куляшоў), як і мемарыяльныя будынкі. Бо не захочам жа мы, каб нашы нашчадкі з непавагаю ставіліся да пабудаванага намі і да нашых магіл. А іх тут многа. Асабліва з вайны 6407 мсціслаўцаў. Магілы ў Шамаве, Лютні, Сяльцы, Капачах, Забалацці. 55, 152, 271, 246, 328, 331, 437, 147 чалавек… Стамляешся лічыць! А тут жа кожны раз сонца згасала. І як падумаеш, што з гэтых пагубленых людзей, сярод

якіх былі юнакі і дзеці, мог бы вырасці новы Пётр Мсціславец, новы Максім Гарэцкі, новы Насовіч, або нешта зусім на свеце небывалае, нейкі касманаўт або вялікі паэт, дый проста добры муж, добрая маці, добры дзед, добрыя работнікі — хоць ты сядай і плач.

Стэлы. Помнікі. А што памогуць стэлы і помнікі? Яны толькі памагаюць жывым крыху менш адчуваць сваю віну перад мёртвымі. Мабыць, галаву адкруціць трэба таму, хто паганіць магілу. І таго самага варты той, хто паганіць або знішчае старую будыніну. Бо гэтым ён павялічвае віну нас, жывых, перад тымі, хто аджыў, хто смяяўся і плакаў, як мы, хто працаваў і будаваў, чые мары аб прыгажосці і шчасці жывуць у гэтых старых мурах.

…Розны бываў па колькасці жыхароў Мсціслаў у розныя часы сваёй гісторыі.

А трыццаць тысяч у ім жыло, і тысяча трыста (у 1780 годзе) і восем тысяч з паловай (1897 год) і дзесяць з паловай тысяч (1905 год). Але колькасць жыхароў яшчэ нікому ніколі і нічога не гаварыла і не гаворыць. Людзі, якія тут жылі і жывуць, вось што галоўнае.

Калі б у мяне спыталі, якая рыса асабліва ўласцівая жыхарам Мсціслаўскай зямлі, што асабліва вызначае іх сярод астатніх беларусаў, я перш за ўсё назваў бы не розум, не мяккасць і дабрыню, не гасціннасць, не іншыя агульнанародныя рысы. Перш за ўсё, бадай, я назваў бы ініцыятыўнасць, прадпрыймальнасць, энергічнасць, дзейнасць і спрыт. Ужо якія толькі беды не хадзілі па ягонай мсціслаўскай спіне, як толькі не стараліся пазбавіць яго жыцця, а ён жыве і выжывае стойкі і ўпарты, як дрэва на камені; ён выкруціцца — дзе мужнасцю, дзе сілай, а дзе й хітрасцю (што ўжо адмаўляцца) з самых невыгодных абставін, ды яшчэ й выйдзе з іх, на ўсеагульнае здзіўленне не толькі з перамогаю, але і з некаторай прыбыллю, хай сабе маральнай.

Ходзячы аднойчы па вуліцах горада з двума паважанымі мсціслаўцамі, я ўздумаў паддражніць іх. Успомніў пару выпадкаў, калі мсціслаўцы каралю жменю блох прадалі, успомніў, што "мсціслаўцы не паміраюць на сваёй лаўцы", прыпомніў, між іншым, як "недасекі" на працягу ста пяцідзесяці год аблапошвалі ўсю імперыю кубрачаствам.

— Гэта што?

— А хадзілі па імперыі з просьбітнымі кніжкамі (заверанымі ў начальства і ў свяшчэнніка). Збіралі грошы на пабудову пагарэльных і ўзвядзенне новых цэркваў.

— Ну і што?

— Ну, каб усе тыя грошы, што яны сабралі, пусціць у справу, то ў Мсціславе не сем цэркваў было б, і не "сорак саракоў" (тысяча

шэсцьсот), як у старажытнай Маскве, а мінімум шаснаццаць тысяч.

— Быць не можа.

— А вы зірніце ў "Расію", т. IX, ст. 397.

Крыху абзадачаныя, яны раздумвалі надзьмуцца ім на мяне ці пусціць усю справу так, аж тут адзін з іх успомніў пра маю маці:

— Э, дык і вы ж таксама недасек.

— Ну так. Калі меркаваць па тым, што маці нарадзілася тут, і я таксама напалову недасек.

— Тады няхай, — прымірыліся яны.

І сапраўды, чаго крыўдаваць на твае жарцікі і кепікі, калі і ты сам не лепшы, ва ўсякім разе, сам напалову такі. Ну, але жарты жартамі, а давайце прыпомнім хаця некаторых людзей, якіх даў Беларусі (і ўсяму свету) маленькі Мсціслаў і яго бліжэйшае наваколле. Таму што востры Мсціслаўскі розум, хватка, кемнасць, дзелавітасць заўсёды былі накіраваныя, але найбольш на карысць чалавеку і на ягоны поступ наперад.

Пра дойлідаў і мастакоў, у прыватнасці Сцяпана Палубеса, мы ўжо гаварылі. Давайце цяпер пагаворым пра людзей асветы, думкі, навукі і культуры.

І, перш за ўсё, увогуле пра мсціслаўскую пісьменнасць.

Доўгі час існавала думка, што на ўсходнеславянскіх землях пісьменнае было ці не адно толькі духоўнае саслоўе, ну і хіба частка самых вярхоў грамадства. Яно і праўда: пергамент рэч дарагая, амаль недаступная для сярэдняга чалавека. Пергаментныя кнігі XI — XII стагоддзяў дайшлі да нас у адзінкавых, па пальцах можна пералічыць, экземплярах. Адсюль вывад: насельніцтва было малапісьменнае.

Такая думка панавала аж да 1951 года, калі археолагі знайшлі ў Ноўгарадзе першую берасцяную грамату. Цяпер іх знойдзена там 588. Значыць, не былі рэдкасцю пісьменныя людзі. Значыць, для штодзённых сваіх патрэб людзі сярэдняй заможнасці карысталіся бяростай. Але ці была такая распаўсюджаная пісьменнасць асаблівасцю толькі адной Ноўгарадскай гандлёвай рэспублікі? Выявілася, што не. Проста асаблівасці паўночнай ноўгарадскай глебы лепш зберагалі бяросту. Але з цягам часу берасцяныя граматы былі знойдзены ў Смаленску, Старой Русе, Пскове.

Потым загаварыла беларуская зямля. У 1959 годзе была знойдзена берасцяная грамата XIII стагоддзя ў Віцебску. Мсціслаў быў другі беларускі горад, дзе ў 1980 годзе таксама знайшлі такую грамату. Яна ляжала ніжэй сёмага бярвенчатага вулічнага насцілу. Мяшчэнне гэтыя датуецца 1249 годам, і значыць, пісалі грамату раней, недзе ў першае трыццацігоддзе XIII стагоддзя.

Грамата гэтая дайшла да нас не цэлая. Гэта, уласна кажучы, невялікі ўрывак, тэкст якога паддаецца прачытанню з цяжкасцю і сэнс якога цьмяны. Ва ўсякім разе гэта дзелавы дакумент (большасць берасцяных грамат гаворыць менавіта аб прыватным жыцці людзей, аб іхніх справах, пакупках, даручэннях: гэта просьбы, загады зрабіць нешта і нават прапановы рукі і сэрца), у якім размова ідзе пра пшаніцу, палупяць грыўняў і пра нейкага Сямёна. Што нарабіў гэты Сямён з пшаніцай і грашыма, для нас, напэўна, так і застанецца невядомым. Але гэта, відаць, дакумент пра закупку пшаніцы, прычым на досыць буйную суму. Што здарылася тады? Куплялі збожжа таму, што быў недарод (а з усіх тагачасных недародаў Мсціслаў закрануў толькі недарод у 1219 годзе). Рабілі запасы на выпадак магчымай вайны з кімсьці? Здарылася яшчэ нешта? Гэтага мы не даведаемся таксама. Але для нас нязмерна важлівы ўжо сам факт знаходжання граматы, як і знаходжанне шовернага колца з неразумелымі літарамі на ім, як і тое, што знойдзена было металічнае пісала, якім выціскалі літары на бяросце (для адной граматы яго заводзіць бы не сталі), значыць, іх было шмат, значыць, іншых грамат мы проста пакуль што не знайшлі.

Бязмерна важлівы, бо праз бярэсту гаворыць з намі не афіцыйная, а прыватная, асабістая гісторыя нашых продкаў, паўсядзённая, шырока распаўсюджаная іхняя пісьменнасць. На кожны час, на кожную нязначную патрэбу. Не загад палкаводцу ці паслу, а "сарочку забыла", "прадай адзенне і купі жыта", "выйдзі за мяне замуж", і нават вось гэтая неразумелая нам галаваломка пра грошы, пшаніцу і нейкім чынам звязанага з імі Сямёна, якога ўжо даўно няма на свеце і які, аднак, наш сабрат па роду чалавечаму.

Здаўна давён пісьменны Мсціслаў мае яшчэ адну неацэнную заслугу перад усходнеславянскай кніжнасцю. Тут нарадзіўся Пётр Цімафееў Мсціславец, друкар, заснавальнік, разам з Іванам Фёдаравым, першай друкарні ў Маскве. Мы не ведаем года яго нараджэння і смерці, не ведаем, дзе ён вучыўся друкарскай справе, на радзіме ці яшчэ недзе (друкаваная старажытнабеларуская кніга лічыла тады за сабою ўжо амаль палову стагоддзя). Адзіныя вехі ягонага жыцця гэта кнігі, выдадзеныя ім.

Нарадзіўся недзе, мабыць, у першай чвэрці XVI стагоддзя. Разам з Фёдаравым заснаваў у Маскве друкарню, у якой у красавіку 1563 года прыступілі яны да набору першай маскоўскай кнігі, "Апостала". Скончылі яе друкаванне 1 сакавіка наступнага года. Праз год выдалі два выданні "Часоўніка". І — не першыя і не апошнія — вымушаны былі пад напорам цёмнай чэрні, падбухторанай перапісчыкамі і цемрашаламі з вярхоў, як

духоўных, так і свецкіх, бегчы з Масквы ў Заблудаў, непадалёку ад Супрасля. Заблудаў належаў гетману Вялікага княства Літоўскага Рыгору Хадкевічу, які дапамог ім заснаваць там друкарню і надрукаваць "Евангелле вучыцельнае" (выйшла 17 сакавіка 1569 года) і "Псалтыр" (выйшаў у 1570 годзе). Ёсць звесткі, што, па прыкладзе Скарыны, нашы майстры хацелі выдаць усё гэта ў перакладзе на простую мову, "каб научение людем ширилося". Чамусьці гэта не атрымалася. А шкада.

У 1569 годзе Мсціславец пераязджае ў Вільню на запрашэнне віленскіх купцоў, братоў Мамонічаў і братоў Зарэцкіх (Івана — скарбніка Вялікага княства Літоўскага і Зянова, бурмістра Віленскага). Там ён будуе паперню і друкуе "Евангелле напрастольнае", потым "Часоўнік" і "Псалтыр", у пасляслоўі да якога ваюе за прасвету супраць невуцтва (тады па "Псалтыры", часцей за ўсё, людзі вучыліся чытаць).

Гэта кнігі выключнага паліграфічнага майстэрства: прыгожы шрыфт, буйны і ясны, нібы спецыяльна для таго, хто вучыцца, гравюры мастацкія, арнамент прыгожы. Кнігу, апрача ўсяго іншага, нават проста прыемна ўзяць у рукі і цешыцца з яе. Яна прыцягвае да сябе. Ужо тады наш мсціслаўскі асветнік разумеў гэта.

Недзе пасля 1580 года Пётр Мсціславец памёр. Што мы ведаем пра яго? Ведаем толькі ягонаю справу: кнігі, якія неслі святло тысячам людзей. Гэты чалавек прадоўжыў друкарскую справу на тэрыторыі Беларусі, быў адным з дваіх заснавальнікаў друкаванага кніжніцтва на Маскоўскай Русі і (паколькі шрыфтамі ягонымі карысталіся Дзерманская, Астрожская і іншыя друкарні) заснавальнікам друкарніцтва таксама і на Украіне.

Мы чытаем больш за ўсіх у свеце, то, згадзіцеся, што тут немалая заслуга ўсходнеславянскіх першадрукароў.

Францыска Скарыны. З Полацка.

Івана Фёдарава. Радзіма невядомая.

Пятра Цімафеева Мсціслаўца. З Мсціслава.

Па-мойму, гэта зусім не так мала. І каб малы Мсціслаў нават нікога больш не даў чалавецтву — хапіла б і гэтага, каб людзі засталіся навекі ўдзячныя яму. І, як слабую даніну падзякі, паставілі б Пятру Мсціслаўцу помнік у ягоным родным горадзе. Помнік, які пакуль што ўзвышаецца толькі ў сэрцах жыхароў Мсціслава.

Давайце будзем называць уразбіўку людзей больш і менш па маштабах іхняй дзейнасці. Бо няма вялікіх і малых працоўнікоў у чалавецтва, бо кожны, хто шчыра служыць яму і прыносіць яму карысць, заслугоўвае на нашу павагу і памяць.

Адным з вядомых публіцыстаў і вучоных-гаспадарнікаў

сярэдзіны XIX стагоддзя быў Іван Іванавіч Сердзюкоў, гаспадар маёнтка Кудрычы на Мсіслаўшчыне. Сам ён быў з Украіны і прывёз у Кудрычы з Палтаўшчыны 25 мужчын і 25 жанчын, якія і склалі ядро гаспадаркі. Ён, вядома, не быў такім асветнікам і дэмакратам-народнікам, як, напрыклад, А. Н. Энгельгардт, якога ведаў Маркс і высока ацэньваў Ленін.

Аднак аб'ектыўна атрымалася так, што ён, яшчэ напярэдадні прыгоннай рэформы, павёў гаспадарку па шляху такой эвалюцыі, у якой ужо вельмі прыкметныя былі капіталістычныя рысы.

Будаваліся млыны, гаспадарчыя пабудовы, разраблялiся культурныя лугі, капаліся асушальныя (і паліўныя) канавы, расцяроблівaліся аборкі, павялічвалася жывёлагадоўля, спрабавалася новае паляводства, уводзіліся штучныя ўгнаенні.

У "Земляробчай газеце" — і асобна з'яўляліся працы Сердзюка (называюць толькі малую частку) "О ценах на сельские произведения", "О болезни овец", "О белорусском хозяйстве", высока ацэнена "О скотоводстве", "Испорченное и поправленное хозяйство", "Народные приметы и метеорология", большой труд "Очерки хозяйства моего", "Климатология мстиславского уезда" і ўдастоенае ганаровым водгукам вучонага камітэта Міністэрства Дзяржаўных Маёмасцяў "Описание Мстиславского уезда".

Ва ўсім разе гэта не быў пан-паразіт, гэта быў інтэлігент, які сеў на зямлі і думаў не толькі пра сваю гаспадарку, але і ўвогуле пра карысць сваёй зямлі. Пісаў і падаваў дзяржаўныя праекты, на якія, як заўсёды, мала звярталі ўвагі, будаваў шашу ў Крычаве "паміж Сожам і Чорнай рэчкай".

Ну а для душы напісаў па-ўкраінску некалькі камедый, аперэт, склаў "Маларасійскі слоўнік".

З яго сям'і выйшла пасля некалькі значных вучоных.

Мсціслаўскае поле было ўвогуле ўрадлівае на вучоных. Вельмі значнымі вучонымі былі, напрыклад, у XIX стагоддзі браты Кутаргі. Сцяпан Сямёнавіч (нарадзіўся ў 1805 годзе ў Мсціславе, у сям'і павятовага чыноўніка, памёр у 1886 годзе) і брат ягоны Міхаіл Сямёнавіч (1809–1886 гг.). С. С. Кутарга, вучоны-прыродазнаўца, заолаг і геолаг, вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце і дактарантуры Дэрпутскага ўніверсітэта. Доктар медыцыны (1832), прафесар заалогіі Пецярбургскага ўніверсітэта (1833), старшыня Пецярбургскага мінералагічнага таварыства. У 1852 годзе за падрабязную геалагічную карту Пецярбургскай губерні быў удастоены Дзямідаўскай прэміі. Асабліва каштоўныя, акрамя гэтай, яшчэ ягоныя работы па Фінляндыі. І яшчэ: ніякі даследчык пермскіх асадкаў Урала дагэтуль не можа абысці ягоныя работы.

Ну і яшчэ адно. Ён першы ў Расіі, ужо праз год пасля выхаду

кнігі Чарльза Дарвіна "Паходжанне відаў", прызнаў дарвінаўскае вучэнне і ў 1860 годзе пазнаёміў з ім студэнтаў Пецярбургскага універсітэта, зрабіўся прыхільнікам Дарвіна і папулярызатарам яго. Уяўляю сабе, якія, мабыць, шышкі сыпаліся на ягоную галаву. Як заўсёды, на галаву першага. А можа, як падумаеш, і нічога, і абышлося, і непрыкметна сышло. Бо проста не паспелі разабрацца і ацаніць усё значэнне гэтага рэвалюцыйнага для біялогіі выбуху.

Штогод разам з братам, прафесарам Пецярбургскага універсітэта Міхаілам Сямёнавічам, Сцяпан Сямёнавіч праводзіў у Мсціславе лета, ведучы вялізную культурна-асветніцкую работу ў горадзе і наваколлі. А брат ягоны быў таксама асобай надзвычай цікавай. Адным з самых выдатных на той час, калі не самым выдатным у Расійскай дзяржаве гісторыкам Старажытнай Грэцыі. З другога курса Пецярбургскага універсітэта таксама быў накіраваны ў Дэрпут, а паколькі Дэрпутскі універсітэт быў універсітэтам шматлікіх моўных стыхій, то выдаў там па латыні першую сваю працу, а затым абараніў магісцерскую дысертацыю, а пасля і стаў доктарам за працу "Калены і саслоўі антычныя", праз год перакладзеную на французскую мову. Працаваў у Парыжы, Берліне, Мюнхене і Гэйдэльбергу, быў прафесарам Пецярбургскага і (з 1869 па 1874) Маскоўскага універсітэтаў.

Бліскуча ведаў крыніцы, але і ўмеў крытычна ставіцца да іх. Даводзіў, што антычныя традыцыі ў апавяданнях і паданнях аб ранніх гістарычных эпохах верагодныя, а, часам, і дакладныя.

Распрацоўваў вузлавыя пытаніі сацыяльнай і палітычнай гісторыі антычнасці (рабы ў антычнай Грэцыі, становішча вольнаадпушчанікаў у Афінскай рэспубліцы, раздзяленне ўласнасці ў Афінах, барацьба дэмакратаў з арыстакратамі ў элінскіх рэспубліках). Такія яго выдатныя кнігі, як "Гісторыя Афінскай рэспублікі ад убіення Іпарха да смерці Мільціяда" (СПб, 1858 г.) і асабліва дужа змястоўная і важлівая "Грамадскае становішча рабоў і вольнаадпушчанікаў у Афінскай рэспубліцы" (выйшла пасмяротна) не страцілі свайго значэння і да нашага часу, і доўга яшчэ не страцяць. Бо гэта не кампіляцыя, бо ён першы ў свеце ўзняў і даследаваў пытанне аб рабстве ў старажытнай Грэцыі, бо гэта работы, заснаваныя на глыбінным веданні першакрыніц.

Вось якія птушкі выляталі, часам, з Мсціслаўскага гнязда. І, ведаеце што? Адну я тут бачу загану, уласцівую ўвогуле беларусам. Яны ствараюць Чылійскую навуку, твораць палітыку Гавайскіх астравоў, робяцца лепшымі ў свеце знаўцамі арабскіх рукапісаў, або, як у дадзеным выпадку, антычнасці, але… Нельга, вядома, абняць неабдымнае, але шкада, што за старажытнай Грэцыяй так мала знайшлося ў Кутаргі ўвагі да сваіх з братам

малых Мсціслава ды Чэрыкава, да свайго роднага Пасожжа. Толькі вельмі багатыя кадрамі народы могуць дазволіць сабе вывучаць інкскую пісьменнасць у той час, як на сваёй ніве хапае рук.

А можа? Можа гэта і ёсць галоўная вартасць і добрая якасць беларускіх вучоных: не абмяжоўвацца толькі сваім і заўсёды самаахвярна прыходзіць на дапамогу суседу? Можа менавіта за гэта даруецца нам вялікае мноства нашых грахоў? Бо павінна ж некалі адгукнуцца народу ягоная самааданасць і жаданне служыць не толькі сабе, але і ўсяму Роду Чалавечаму.

… Вось яшчэ два браты, якія зрабілі вельмі многае. Браты Прахавы. Таксама беларусы з Мсціслава. Старэйшы Мсціслаў Віктаравіч, філосаф, паэт, перакладчык (ледзь не першы ў Расіі) Гейне і Гафіза, гісторык. І малодшы яго брат Адрыян, гісторык мастацтва і археолаг.

Доўгі час я неяк не звязваў іх з Мсціславам. Пасля ўспомніў, што недзе бачыў рэпрадукцыю карціны Рэпіна "Юнак у беларускай жаночай вопратцы" і чытаў пра яе, і што прозвішча юнака, здаецца, было Прахаў і быў ён сынам кагосьці з братоў.

Карціну помню. Сапраўды сядзіць падлетак у тым узросце, калі хлопцы падобныя на дзяўчат і наадварот. І вопратка на ім багацюшчая і гожая-гожая, і вопратка тая…мсціслаўская, сумненняў быць не можа.

І выявілася, што аб Мсціславе Прахаве і аб ягоным вялізным і доўгім уплыве на іх гаварылі і Антакольскі і Рэпін, бо чалавек гэты сфарміраваў іхнія пагляды на мастацтва і іхні інтэлект. Прычым не толькі ў сэнсе мастацкіх густаў, але і ў сэнсе палітычных поглядаў (сам ён, было і такое, пасядзеў у Петрапаўлаўцы за кіраўніцтва студэнцкімі хваляваннямі).

А малодшы Прахаў, Адрыян (нарадзіўся у 1864 г.) скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта і, атрымаўшы камандзіроўку за мяжу, напісаў пад час паездкі магісцерскую дысертацыю "Пра рэстаўрацыю групы ўсходняга франтона Эгінскага храма ў Афінах". Выкладае гісторыю прыгожых мастацтваў у родным універсітэце, у 1879 годзе робіцца доктарам за працу "Дойлідства старажытнага Егіпта", пераходзіць у Кіеўскі універсітэт — у 1887 годзе.

Вакол яго вечна людзі, ён вечна гарыць неймавернымі пачынаннямі (і здзяйсняе іх), ён верыць у талент зусім маладых і бязведамных людзей і смела выцягвае іх на свет, даручаючы вялікую работу (юнаму Урубелю — Кіеўскую Кірылаўскую царкву, юнаму Несцераву, разам з вядомымі ўжо мастакамі, - роспіс Кіеўскага Уладзімірскага сабора, унутраным аздабленнем і ўпрыгожваннем якога Прахаў кіраваў).

Прахаў вечна віруе. Прахаў робіць немагчымае. Ён не толькі піша змястоўныя працы па старажытнарускаму мастацтву — ён адкрывае яго. Так ён адкрыў, замаляваў і даследваў старажытныя фрэскі многіх кіеўскіх цэркваў (Сафійскай, Кірылаўскай і іншых). Вялікі рускі мастак Несцераў пісаў аб ім: "Знаёмства з А. В. Прахавым было радаснае і склала ў маім жыцці цэлую эпоху… Усё жывое, натхнёнае, што было ў гэтым надзвычай таленавітым чалавеку, не пройдзе бясследна".

І на ўсё яго хапала, і там, дзе ён быў, заўсёды ствараўся мастацкі цэнтр Расіі.

Рэпін і Куінджы, Антакольскі і Шышкін, паэты Майкаў і Мінаеў, Васняцоў і Урубель — усе яны ў сферы ўплыву гэтага чалавека. А ўплывае ён і як рэдактар (ілюстраваны часопіс "Пчала"), і, перш за ўсё, як асоба вялікай прыцягальнай сілы, асоба, якая выклікае ў людзях неадольную сімпатыю і бязмежны давер. Побач з ім нельга самому не зрабіцца больш таленавітым, больш адданым сваёй справе. Ён з самага закаранелага флегматыка зробіць энтузіяста і байца.

Паболей бы нам і зараз такіх людзей, як гэты мсціслявец! На жаль, такія з'яўляюцца не так часта, як хацелася б. А яны як дрожджы ў жыцці грамадства. І не загадам яны вядуць людзей да лепшага, а ўласным прыкладам. Тым, што людзі не хочуць адстаць ад іх і хочуць быць падобнымі да іх. Больш чыстымі, больш высакароднымі, лепшымі, чым яны ёсць.

Разнастайных людзей нараджаў Мсіслаў. У 1865 годзе ў мяшчанскай сям'і нарадзілася тут народаволка Аніся Давыдаўна Балоціна. Вучылася ў Маскве, у вучылішчы жывапісу, ваяння і дойлідства. Народніцкі гурток, у які яна ўваходзіла, друкаваў і распаўсюджваў нелегальную літаратуру. Быў данос і арышты. Быў прысуд (у 1887 годзе): восем год Сібіры. Праз два гады ўзброеныя ссыльныя ў Якуцку паўсталі. Узброенае супраціўленне скончылася тым, што шасцёра ссыльных было забіта, сем паранена. Пасля зноў быў суд і ваенна-судовая камісія, якая прыгаварыла трох чалавек да павешання, а параненую ў перастрэлцы жанчыну да жыццёвай катаргі і пазбаўлення ўсіх правоў. Спачатку была Вілюйская катаржная турма, пасля — турма на Кары для асабліва небяспечных палітычных злачынцаў. Пасля было вольнае пасяленне, пасля — жыццё пад наглядам паліцыі ў Шклове. У 1898 годзе А. Д. Балоцінай удалося выехаць за мяжу, дзе далейшыя яе сляды губляюцца.

Яшчэ адно імя цесна звязана з Мсціславам, імя чалавека, значэнне якога для беларускай і агульнаславянскай культуры цяжка перабольшыць. Гэта Іван Іванавіч Насовіч, беларускі мовазнавец-лексікограф, этнограф і фальклярыст (1788–1877).

Вось прыклад чалавека, які доўгі свой век пражыў нездарма, зрабіўшы многае, калі не ўсё, што было накавана яму лёсам. Скончыўшы ў 1812 годзе Магілёўскую духоўную семінарыю, ён трыццаць два гады аддаў педагагічнай дзейнасці, якая, вядома, мала пакідала яму часу для галоўнага свайго прызвання. Быў ён настаўнікам, інспектарам Аршанскага павятовага вучылішча, рэктарам Мсціслаўскага духоўнага вучылішча (1814–1822), рэктарам Маладзечанскага і Свянцянскага дваранскіх вучылішчаў. У 1844 годзе выйшаў у адстаўку. Пасяліўся ў Мсціславе. Яму 56 год. Многія людзі ў гэтым узросце падводзяць вынікі жыцця. Ён разумее: для яго сапраўднае жыццё толькі пачынаецца. І дзякуй богу, што лёс не паставіў хуткай мяжы ягонаму існаванню, даў яму яшчэ трыццаць тры гады жыцця. Іначай паглядзіце самі, чаго мы былі б пазбаўленыя.

Ён, вядома, не ведаў, колькі яму адпушчана. Ён закосвае рукавы: памяраць збірайся, а жыта сей. І ў гэтым ён — прыклад для кожнага.

Ніколі не позна!

"Нехта ўжо канчае. Я толькі пачаў. І я буду ісці па гэтай дарозе наколькі хопіць сілы. У мяне ўрэшце развязаныя рукі, і мяне чакае мой народ, і я павінен зрабіць для яго ўсё, і я не маю права ўпасці, пакуль ён чакае маёй дапамогі і пакуль у мяне ёсць сілы служыць яму." Яму 64 гады, калі выходзіць ягоная праца "Беларускія прыказкі і прымаўкі", яму 79, калі выходзіць ягоны "Зборнік беларускіх прыказак", адзначаны залатым медалём Рускага геаграфічнага таварыства. Яму 80, калі выходзяць "Беларускія прыказкі і загадкі", і 85, калі выходзяць "Беларускія песні". І яшчэ засталіся ў рукапісах "Збор беларускіх слоў па алфавіце" і "Алфавітны паказальнік старых слоў", узятых з "Актаў, якія адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі, выдадзеных у 1853 годзе" (за гэтую работу яму прысуджана Уварашская прэмія 1865 года).

Але галоўная ягоная праца выйшла ў 1870 годзе, калі яму было 82 гады. Гэта "Слоўнік беларускай гаворкі" — "Словарь белорусского наречия" (назва "Беларусь" на той час, як вядома, знаходзілася пад забаронай і ў насельніцтва гэтай зямлі ніякай такой мовы быць не магло. Існавала гаворка).

Вось гэты вялікі па фармату том ляжыць перада мной. У ім 752 старонкі і ён змяшчае больш за 30000 слоў. Аўтар пачаў яго ў 1847 годзе (цераз тры гады пасля адстаўкі), працаваў над ім 16 год і ў 1863 годзе прадставіў на Дзямідаўскую прэмію, якой і быў адзначаны.

Гэта быў першы поўны слоўнік беларускай мовы. Над працамі такога маштаба цяпер, часам, гадамі працуюць цэлыя інстытуты. І.

І. Насовіч адолеў гэтую работу адзін, аддаўшы ёй шаснаццаць год жыцця. Годны здзіўлення подзвіг і яшчэ адзін прыклад таго, што можа зрабіць нават адзін чалавек, калі ён апанаваны сваёй ідэяй і мэтай, калі ён кладзе на працу сваю ўсе сілы без астатку.

Прычым працы Насовіча заўсёды працы лінгвістычныя, з лексічнымі і фанетыка-граматычнымі каментарыямі, тлумачэннямі асобных слоў, выразаў, ідыёмаў.

А "Слоўнік" не проста слоўнік, а слоўнік тлумачальны, са шматлікімі прыкладамі, узятымі з жывой мовы або з песняў, казак, прыказак, словам, з усяго фальклору, які Насовіч ведаў, як мала хто на той час.

Ну вось. Мы назвалі, вядома, не ўсе імёны. Але нават па гэтых, названых, можна меркаваць, што невялікі Мсціслаў зрабіў вялікі ўклад у гісторыю культуры славян. А што датычыцца беларускай культуры, то для яе ў сярэдневякоўі і ў XIX стагоддзі Мсціслаў зрабіў так многа, што стаіць сярод першых беларускіх асветніцкіх цэнтраў.

Мне, як цяперашняму мінчаніну, вядома, крыху няёмка, але я мушу прызнацца, што ў тыя часы Мсціслаў зрабіў большы ўплыў на культуру Беларусі, чым Мінск. Гэта не патрабуе доказаў, але, як спатрэбіцца, гэта можна лёгка давесці.

Здзіўляцца гэтаму не трэба. Нам невядомыя законы таго, чаму і як, на якой глебе і дзякуючы якім абставінам раптам зараджаецца недзе культурны ачаг і ў нейкай мясцовасці часам, як грыбная сям'я на паверхню, лезуць паэты і вучоныя, мастакі і дойліды, дзяржаўныя дзеячы, героі, пісьменнікі. І не абавязкова гэта здараецца ў вялікім цэнтры. Гэта можа быць Вільня і Мінск, але гэта, у розныя часы, могуць быць Слуцк, Навагрудак, Узда, нейкія там Ушачы ці Радашковічы. Дадуць адразу дзесятак паэтаў і пісьменнікаў, вандроўнікаў і вучоных, будаўнікоў і кампазітараў — і заціхнуць на пэўны накрэслены час, перадаўшы эстафету ў нейкую зусім іншую мясціну.

Мсціслаўскі вулкан талентаў не заглохнуў, аднак, і ў нашым стагоддзі. Прыкладам таму можа быць класік беларускай літаратуры Максім Іванавіч Гарэцкі (1893–1939). Нарадзіўся ён у вёсцы Малая Багацькаўка Мсціслаўскага павету. Гаварыць аб ім шмат, мабыць, не трэба. Акрамя таго, што ён — гонар нашай літаратуры, ён яшчэ і вядомы педагог, таленавіты літаратуразнаўца і лексікограф. Такія яго кнігі, як "Рунь", "На імперыялістычнай вайне", "Дзве душы", "Камароўская хроніка", раман "Віленскія камунары" і многае іншае трывала і назаўсёды ўвайшлі ў залатую бібліятэку літаратуры беларускай.

А ён жа яшчэ збіраў фальклор, напісаў і выдаў у 1920 годзе ледзь не першую (і шмат у чым узорную, прынамсі па

сумленнасці падыходу да матэрыялаў) "Гісторыю беларускай літаратуры". І склаў "Хрэстаматыю беларускай літаратуры XI век — 1905 г.".

Зробленае ім дагэтуль, па-мойму, не атрымала ўсебаковай належнай ацэнкі. Але час многае паставіў ужо і шмат яшчэ чаго паставіць на сваё месца.

Для мсціслаўцаў жа Максім Гарэцкі павінен быць дарагі яшчэ і за тое, што ў творах ягоных гамоніць, радуецца, працуе, плача і смяецца, гаворыць іх адметнай і трапнай гаворкай уся Мсціслаўшчына.

Дагэтуль мы сустракаемся з героямі пісьменніка на яе дарогах, слухаем іхнюю мову, смяёмся з іх жартаў, здзіўляемся багаццю іхняга мыслення. І нават дробязі мсціслаўскага побыту, нават сучасныя пейзажы ўстаюць перад намі на старонках ягоных кніг. І мы беспамылкова іх пазнаем. Як, напрыклад, зірнуўшы на драўляную царкву ў імя Іллі Прарока, што стаіць у вёсцы Слаўнае, мы адразу гаворым сабе і ёй: "Грэх, галубка, ды ты ж апісаная ў "Камароўскай хроніцы" і ў "Антоне", ты сышла нейкім дзівам з іхніх старонак і вось, жывая, стаіш перад намі".

Дарэчы, царкву ў в. Слаўнае трэба паберагчы не толькі як "літаратурную славутасць". Гэта досыць рэдкі ўжо на Беларусі ўзор "сталага класіцызму" першай паловы XIX стагоддзя. Словам, гэтаму драўлянаму трохзрубнаму храму з пяціграннай апсідай і васьмерыком са шлемападобным купалам — паўтара стагоддзя.

Раз ўжо мы загаварылі пра Максіма Гарэцкага, то не павінны забыць і на ягонага роднага брата, Гаўрылу Іванавіча (вы заўважылі, што таленты на Мсціслаўшчыне ідуць "кустамі": браты Кутаргі, браты Прахавы, браты Гарэцкія), аднаго з самых выдатных геолагаў Саюза, акадэміка, заснавальніка нашай палеапатамалогіі, навукі аб рэках даўно мінулых часоў: Пра-Волгі, Пра-Дняпра, Пра-Нёмана і многіх іншых. Г. І. Гарэцкі займаецца інжынернай геалогіяй. Рабіў, між іншым, вышукванні пад такія каналы, як Беламорска-Балтыйскі, Волга-Данскі і многія іншыя, а таксама пад такія ГЭС, як Цымлянскую, Кіеўскую, Горкаўскую, Ніжнекамскую. Ну і яшчэ (талент не можа быць вузкі) ён збіраў фальклор і складаў, разам з братам, слоўнік. Таленавіты, страшэнна працаздольны, жывы, нястомны, цікаўны да кожнай новай справы, маладзейшы за маладога ў свае гады — вось што такое гэты чалавек. Я, мабыць, заблытаюся, пералічваючы ягоныя абавязкі і нагрузкі, якія ляжаць на ягоных плячах.

…І пісьменнік Левановіч Павел Антонавіч. Нарадзіўся ў 1914 годзе ў в. Мазалава Мсціслаўскага раёна. Памёр ад ран у 1943 годзе. Паэт і празаік, які быў закаханы ў свой родны Мсціслаўскі

край і памяці якога горад аддзякаваў, назваўшы адну са сваіх вуліц ягоным імем.

На Мсціслаўшчыне (в. Воўкава) нарадзіўся і прасіў, каб там яго аддалі зямлі, і член-карэспандэнт АН БССР, беларускі фальклярыст і літаратуразнаўца Іван Васільевіч Гутараў (1906–1967), які даследаваў беларускую і рускую вусную народную творчасць і эстэтыку.

Гэтага было б, здавалася, і досыць, тым болей што цяжка пералічыць усіх выдатных людзей, якія нарадзіліся тут, вучыліся тут, праходзілі праз мсціслаўскую зямлю, ваявалі на ёй.

Ваявалі на ёй. Ну так, гэтых абмінуць нельга. Хаця б некаторых. Хаця б пару імёнаў.

У Мсціславе нарадзіўся Уладзімір Сяргеевіч Галушкевіч (1898–1964), удзельнік грамадзянскай вайны. У Айчынную вайну на Цэнтральным і Заходнім франтах быў начальнікам аператыўнага аддзела, намеснікам начальніка штаба фронту. Генерал-лейтэнантам.

У вёсцы Доўгавічы нарадзіўся Герой Савецкага Саюза Яўген Іванавіч Качанаў (1915). Сяржант, камандзір стралковага аддзялення. 25 студзеня 1945 года першы фарсіраваў раку Одэр (і гэта дзякуючы тысячам такіх, як ён, рацэ вярнулі яе праславянскую назву Одра), пашырыў з баямі плацдарм, быў паранены, але ў тыл не пайшоў, а наступнага дня першы ўстаў у атаку, падымаючы за сабою байцоў, і быў забіты.

У 1896 годзе нарадзіўся пад Мсціславам, у в. Старое Сяло, Іван Міхайлавіч Паўловіч. Паспеў яшчэ адхапіць два гады першай сусветнай вайны, пасля, у грамадзянскую, быў у Мсціславе сакратаром крымінальна-следчай камісіі, ваяваў супраць банд Мамантава і Булак-Балаховіча, удзельнічаў у разгроме Антонава. Быў у пагранічных войсках. У лютым 1943 года ён — намеснік камандзіра дывізіі на Цэнтральным і Беларускім франтах, пасля камандзір дывізіі на 1-м Беларускім. У чэрвені 1944 года асабліва вызначыўся, і было гэта зусім непадалёк ад радзімы. Паўночней Рагачова асабіста ўзняў у атаку батальён, прарваў абарону немцаў на Друці, а пасля перайшоў цераз Бярозу-раку і ўварваўся ў Бабруйск. А праз месяц, у ліпені, на чале палка, адбіў на паўночна-захадзе ад Брэста атаку шасцідзесяці нямецкіх танкаў. І ў гэтым баі загінуў. Герой Савецкага Саюза пасмяротна.

І яшчэ Рудкін Піліп Мікітавіч. Нарадзіўся ў вёсцы Чорная Сасна ў 1893 годзе. Працаваў у Данбасе, на рыбалоўных промыслах Далёкага Усходу. Салдат. З лютага 1917 года — чырвонагвардзеец. З 1918 года ў органах ВЧК — камандзір атрада, палка, дывізіі. Удзельнічаў у грамадзянскую ў бітвах пад Дзвінскам і Псковам, у разгроме мяцяжоў левых эсэраў у Маскве,

Разані, Кранштаце, у баях з Булак-Балаховічам. З 1943 года генерал-маёр танкавых войск. Зорку Героя атрымаў за 31 сакавіка 1943 года.

Я не кажу тут пра тысячы тых, амаль безыменных у гісторыі, над рэшткамі якіх стаяць капцы па ўсёй зямлі, у гонар якіх насыпаны ў горадзе Курганы славы, якія, уласна кажучы, і ёсць тыя, галоўныя, што адстаялі самое права Мсціслава існаваць. Кожны з гэтых людзей, якія радаваліся, жылі і працавалі, як мы, быў бы варты найлепшай песні.

Ну і яшчэ адно імя. Мастака, які вельмі рана пайшоў ад нас. Міхал Якаўлевіч Лісоўскі (1931–1970). Нарадзіўся ў вёсцы Белы Мох Падсолтаўскага сельсавета. Гэта быў майстар партрэта, станкавага жывапісу. Гумар мсціслаўскай зямлі, назіральнасць яе жыхароў, іх тонкая, някрыўдная з'едлівасць, іхняе ўменне бачыць чалавека наскрозь, іхняе веданне глыбіняў душы чалавечай вадзілі алоўкам і пяром Лісоўскага.

Ну вось. Здаецца, сёе-тое вартае ўвагі мы памянулі. Далёка-далёка не ўсё, бо іначай давялося б пісаць тоўстую кнігу.

А цяпер давайце проста пройдземся па Мсціславу і Мсціслаўшчыне. Дзе ў машыне, а дзе і пехатою. Не па кожнай вуліцы горада і не па кожнай вёсцы, бо на гэта спатрэбілася б зашмат часу.

Адвядзём на гэта дзень ці два, тым болей што пра многія мясціны мы ўжо ведаем. І выберам для нашага паходу летнія дні. Ну хаця б сярэдзіну жніўня з сонцам і бясхмарным небам. Мала ўжо засталося нязжатага, паўсюль торпы саломы. І ва ўсім тое адчуванне радзімы, калі нейкае адценне колеру, нейкі намёк на пах выклікаюць у сэрцы даўно забыты ўспамін: нібы ты малы хлапчук у гародзе, а ў ім між бульбоўніку зелянеюць стрэлы бабоў і чапляюцца за порткі пахучыя двухзубыя ваўчкі. І драма, і лянота, і паснулі на мяжы пузатыя гарбузы.

І Мсціслаў у гэтую пару не дыяментавы, а такі сабе звычайны малы гарадок, які патанае ў садах і магутных дрэвах на адходнах над Віхрой, спакойны і лянотны, з рэдкімі малымі віхурамі на вуліцах.

Вечарамі слаба свецяцца вокны магазінаў і рэстаранаў галоўнай плошчы і ліхтары "рэтра" на газоне перад сучасным будынкам кіно. Выходзяць з яго рэдкія гледачы. І зноў кладзецца налёт таямнічасці на вулкі, якія збіраюцца спаць або ўжо заснулі, на вялізныя дрэвы. Гораду заўтра ўставаць з пеўнямі: чакае не дужа багатая прамысловасць, а галоўнае, чакаюць палі, чакае другі пакос сена. І начныя вулкі пахнуць палямі і сенам, а ты ідзеш імі і здзіўляешся, што мог рабіць тут вечарамі сто год назад хаця б той самы Насовіч у адстаўцы. А ні кіно, а ні тэлевізараў. А

пасля ўспомніш і ўсміхаешся. Што рабіць? А ўсяго толькі скласці слоўнік на трыццаць з лішнім тысяч слоў.

…Дарогі на палях, надзіва добра ўходжаных, як і паўсюль на Мсціслаўшчыне. Адна з іх вядзе на Пустынкі, былы манастыр заснаваны ў 1380 годзе князем Лугвенам Сямёнам Альгердавічам, героем Грунвальда. Да Пустынак 9 кіламетраў, яны ляжаць на самай мяжы са Смаленшчынай.

Яшчэ здалёк-здалёк відаць з дарогі стройны аловачак званіцы і купы дрэў за ім.

Вельмі шкада, але ад XIV стагоддзя ў Пустынскім манастыры нічога не засталося. І званіца, і размешчаныя за ёю па адной асі будынак сабора, моцна пашкоджанага, і будынак жылы — гэта стагоддзе XIX. Сабор, урэшце, уключае ў сябе (быў, відаць, паўтара з лішнім стагоддзя назад перабудаваны) вельмі значныя фрагменты стагоддзя XVIII і сям-там, магчыма, рэшткі будыніны XVII стагоддзя.

Але вакол векавыя дрэвы, спакойнае сонца на іх, густая, па калена, трава і гаючая цішыня. Магутны, вялікі стары сад, які пачынае дзічэць. Крыніца б'е ля падэшвы яра. А крыніцы ж тут увогуле магутныя. І ўвогуле на Мсціслаўшчыне і ў прыватнасці тут, у Пустынках. І нізіна, куды яны збягаюць, яшчэ параўнаўча нядаўна, была ланцугом рукатворных азёр, багатых рыбай.

Зусім яўчэ нядаўна тут была школа. Будынак моцны. Уставіць толькі шыбы і ўсё. Ну і паступова адрамантаваць іншыя службы, закансерваваць і, з часам, аднавіць пад нешта званіцу і сабор. Сады, стогадовыя дрэвы, недалёкія лясы, ланцуг азёр. Маляўнічы спакойны край. І такі гожы комплекс будынкаў. Так шкада, што ён можа прапасці.

Гаспадара няма. І, можа, раёну гэта не зусім пад сілу, асабліва пры тэмпах будовы, пры колькасці будаўнічых аб'ектаў. Ну а вобласці? Рэспублікі?

Чаму б рэспубліканскімі сіламі не дапамагчы давесці да ладу гэты раён. Артэк у Пустынках. Школа-інтэрнат, скажам, у Ануфрыеўскім манастыры. Краязнаўчы музей у Мікалаеўскім саборы, мастацкі музей і зала арганнай музыкі ў Кармеліцкім саборы, крыты павільён над раскопам на Замчышчы, археалагічны музей, гістарычны музей у царкве Аляксандра Неўскага. Я называю першыя — лепшыя аб'екты для рэстаўрацыі і размяшчаю ў іх першыя — лепшыя культурныя ўстановы. Ясна ж, што над гэтым трэба думаць, што сказанае мною пакуль што толькі фантазія.

Але ўявіце сабе, што гэта зроблена, што горад ператварыўся ў турысцкі, гістарычны, мастацкі, культурны цэнтр.

Сілы нашай на гэта не хопіць, ці што? Зрабіць першы пакуль

што горад-музей і тым даць прыклад на стварэнне яшчэ некалькіх.

…Пасярэдзіне двара ў Пустынках ляжалі ў траве два веласіпеды і хатулькі. Два хлопцы, мастакі-рэстаўратары з тых чатырох, што працуюць зараз у Кармяліцкім касцёле, Ю. Маліноўскі і У. Ракіцкі, добрыя знаёмыя, крыху здзіўляюцца мне.

Кожнай раніцай яны едуць на веласіпедах сюды з Мсціслава. Кожны вечар вяртаюцца туды назад. 18 кіламетраў. Выявілі ў прыбудове фрэску XVIII (а можа і XVII) стагоддзя і зараз працуюць, рыхтуючыся зняць яе. Самой фрэскі я не бачыў, яны ўжо заляпілі яе папяроснай паперай. Потым яе замнуюць марляй, затым танюткімі рэйкамі, пасля аддзеляць ад атынкоўкі і павязуць на рэстаўрацыю. З часам гэта будзе зроблена. І фрэску вернуць назад, ва ўладанне гораду, які яе стварыў. Гэта зямля магутнай глыбінай сілы. Вонкава сціпла яна здзіўляе на кожным кроку.

…Спёка. Сонца пячэ дзіка. Палі плаўна спадаюць да Віхры, што струменіць сваю плынь у берагах, укрытых густым хмызняком. Праз гэтыя нетры не дабярэшся да чысцёткай, як слязніца, вады. Смага.

І раптам, гэта ў некалькіх кіламетрах ад Мсціслава, бераг пачынае літаральна вывяргаць ваду.

Вось на беразе, у пары метраў ад ракі, абгароджаны і прыкрыты дахам басейн (гэта метры тры на тры можа, болей). Сценкі бетонныя. З яго вядзе трубка сантыметраў на дваццаць у дыяметры, а з яе б'е няспынны і тугі шкляны вадаспад. Глыбіня крыніы метраў пяць, але вада такая празрыстая, што дно здаецца вось-вось, як руку працягнуць. І на гэтым дне — дзіва, якога я даўно ужо не бачыў. На дне — літаральна вулкан, які выкідае ў секунду, відаць, вёдраў пяць вады, варочае яе і вялізныя, тоўстыя клубы пяску, што тут жа ападаюць, а на іх месцы ўзнікаюць, уздымаюцца новыя.

Кінь валун — будзе варочаць і яго, такі магутны напор.

Не замярзае і ўзімку. І ўзімку няспынна бяжыць і бяжыць тоўстая ручаіна да Віхры. Стоячы ў ёй, некалькі юнакоў скрабуць рыбу і срэбныя бліскаўкі сплываюць у раку.

— Што гэта вы?

— Кажуць, лечыць раматус, — кажа адзін з іх.

- І радыкуліт, — дабаўляю я.

Вада больш ледзяная за лёд. Дзіўнага жывушчага смаку. Даўно я не бачыў такіх магутных крыніц. Магла б, мабыць, забяспечыць пітной вадой увесь горад, як забяспечвала яго калісьці, моцна цяпер запушчаная, крыніца Здаровец у яры пад Замчышчам, у межах самога горада.

А тут б'е. І ўсё дно Віхры б'е халоднымі крыніцамі. І ўвесь бераг ля Мсціслава.

Горы, лес на іх, крыніца, рака. Старажытныя ліпы і лістоўніцы на месцы былога фальварка. Свеціць праз іх перадвячэрняе крынічнае жнівеньскае неба.

Давайце сёння не будзем больш забірацца далёка. Давайце пойдзем на тое месца, дзе малой крынічкай прабілася некалі на свет рачулка нашага гарадка. На Замчышча.

Галаваломны спуск на седлавіну (тут вісеў калісь над ярам пад'ёмны мост), і стромы пад'ём.

На Замчышчы хатка (ці можа дзве: так і не разабраўся праз дзікую густэчу сада, што займае ягоную частку), старыя каравыя яблыні. Пасля шлях вядзе праз грады і сад на археалагічны раскоп: маленькі, жабрачы кавалачак на вялізным, як выявілася, Замчышчы, малюсенькая частка ягоная. На астатняй частцы лапічак саду і гароды. Блытаюцца ў сонцы плеці гуркоў, сцябляны маку, лопухі бураковага гічаўя. Гарбузы віюцца паўсюль і сонечна ззяюць пушыстымі глыбокімі кветкамі. Нейкія жанчыны торгаюць буйную цыбулю. Паўсюль густыя джунглі памідораў, яшчэ зялёных.

А раскоп — яма, запоўненая зялёнай цвілай вадой, і ў ёй рэшткі паляў, драўляных вулічных мастоў, рэшткі будынкаў (Дарэчы, тут я, як мне здаецца, зразумеў, якім чынам жыхары абложанага горада маглі не цярпець недахопу ў вадзе: калі вораг стаяў пад вонкавым валам, праблемы ўвогуле не было, бо выручалі магутныя крыніцы Здароўца ў яры з паўднёва-заходняга боку, там можна напаіць хоць бы й сотню слоноў. А калі вораг абкладаў непасрэдна Замак — выручала вось гэтая вада, што так хутка запоўніла раскоп і не высыхае: тут або таксама блізкі да паверхні вадзяны слой, або на глыбіні ляжыць моцны воданепранікальны пласт гліны, які не дазваляе дажджам усмоктвацца ў зямлю).

Грэшны чалавек, я ўзрадваўся за Мсціслаў, што археолагі раскапалі так мала. Хай астатняя, большая частка Замчышча чакае лепшых часоў, больш дасканалых метадаў, сродкаў на ўзвядзенне над раскопам павільёна. Хай Замчышча пакуль што застаецца некранутай скарбніцай. Бо археолагам з Мсціслаўскім Замчышчам пашанцавала. З XVII стагоддзя тут, відаць, амаль не сяліліся, не капалі, не варочалі грунт. На сценцы раскопа відаць выразна: пласт зямлі толькі зверху крыху падрапаны рыдлёўкай гародніка, ніжэй — пласт пажару і разгрому, а яшчэ ніжэй некрануты культурны слой. Гэта не тое што, скажам, Тураўскае гарадзішча, дзе і ўзводзілі будынкі земскай бальніцы, і дарогу перакладалі, і кіно здымалі, і капалі, і чорт ведае што яшчэ рабілі.

А тут нават стромы яроў, што абкружаюць Замчышча, некранутыя.

І ўвогуле трэба помніць, што пастановай Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах будаўніцтва і калегіі Міністэрства культуры БССР 7 ліпеня 1971 года Мсціслаў уваходзіць у лік гарадоў, што маюць каштоўныя горадабудаўнічыя ансамблі і комплексы, прыродныя ландшафты і старажытны культурны слой, а тым самым уваходзіць у лік гарадоў, праекты планіроўкі і забудовы якіх павінны ўзгадняцца з органамі аховы помнікаў культуры.

Мала дзе мне давялося бачыць такія нечапаныя ні часам, ні рукою чалавечай, незгладжаныя дзікія ўрвішчы. Больш за 25 метраў. Прайшоў на вал — пад нагамі — прорва. Нават страшней, чым на гарадзішчы Старой Разані. Гэта значыць на мой, разам з дахам, стары паціпавярховы дом надбудаваць яшчэ два паверхі. І караскайся сабе на яго, асабліва ў латах, і падай адтуль у ваду рва, калі абаронца піхне цябе ўніз.

Тут была адна з самых непрыступных цвярдынь сярэдневяковай беларускай зямлі. І баранілі тут людзей не каменныя муры, а сама Зямля сваімі крутымі грудзьмі.

…Я не стаў скочвацца з яру ўніз. Не таму, што не люблю моцных уражанняў, а проста не хацеў рабіць пачатак сцежкі на гэтым смарагдава-зялёным схіле (Дарэчы, дзе вы бачылі, каб чалавек не скараціў сабе дарогу, прабіўшы новую сцежку? Тут такіх сцежак няма, бо тут чалавек ужо некалькі стагоддзяў разумеў: скарачаючы або сэрца сарвеш або галаву скруціш). Я пайшоў паўз хаты, ля якой аціраўся чорна-белы шчанюк, весела ішоў да мяне, даваўся на рукі і ў вясёлкавым настроі ўвязваўся следам за мной.

Цяпер трэба было спусціцца да Здароўца, або Кагальнага калодзежа, каб паглядзець, што ўвесь горад піў, калі водаправоду яшчэ не было, адносна зусім нядаўна. У яры адусюль беглі крыніцы. Спуск да Здароўца (вада тут, па сцвярджэнню старых людзей, "здаравіла, вылечвала") быў прыкрыты выбітым брукам. Брукаваны, відаць, яшчэ тады, калі Мсціслаў бруку не меў. Бо гэта было больш чым галоўная вуліца, гэта была артэрыя да вады. Яе трэба было ўтрымліваць у асаблівым парадку (дарэчы, сям-там з-пад бруку яшчэ відаць рэшткі драўлянага мосту: вось як даўно людзі трымалі ў парадку гэты спуск).

Цяпер брук да студні выбіты. Сам вялікі калодзеж зарос і толькі пасярэдзіне вялікага драўлянага зруба б'е з пясчанага кранутага бросняй і зялёнай цінай дна невялікі пухір.

Як прыхожа!

Папрастуем цяпер да Кармяліцкага касцёла.

Што зроблена ў Кармяліцкім касцёле дагэтуль? Першае і самае галоўнае: перасталі псаваць. У сутарэннях яшчэ нядаўна

салілі агуркі і соль раз'ядала цэглу падмуркаў. Я вельмі люблю салоныя агуркі, але добра, што гэтую вытворчасць адсюль урэшце выселілі, што гэты смачны прадукт з гэтага часу будуць рабіць недзе ў іншым месцы. А сутарэнні вычысцілі і яны, з часам, вельмі могуць прыдасца як запаснік для будучага музея.

Цяпер работа ідзе ў прыбудове. На жаль, мала сілы. А работа чакае тытанічная: сама прыбудова і вялізны, проста гігант па памерах храм, які ўражвае каласальнымі сваімі памерамі нават таго, хто сёе-тое пабачыў у сваім жыцці.

Быў я нядаўна ў Латвіі, у Рундале. Там стаіць палац, пабудаваны аўтарам Зімняга палаца В. В. Растрэлі для Э. І. Бірана. Што там зрабілі людзі?

Яны добраўпарадкавалі парк і паступова, адну за адной, аднаўляюць залы, разам з паркетам, лепкаю, мэбляю, карцінамі. І не чакаюць канчатковай рэстаўрацыі. Зараз працуе, здаецца, чатыры-пяць залаў. Экскурсанты ідуць туды і ідуць. Вось залы цалкам адноўленыя, вось адноўленыя напалову. А ў гэтых яшчэ ідзе работа. І аплочваецца яна часткова за грошы гэтых самых экскурсантаў. Бо ім цікава аглядаць не толькі гатовае, а, хай сабе здалёк, бачыць працэс аднаўлення.

Тое можна зрабіць і тут. Нейкая выстаўка ў сутарэннях і прыбудове. І вычышчаны цёплы храм, у якім рэстаўрацыйная работа ідзе паступова, па частках.

І ўсё гэта бачыш. І можна прыехаць праз два, і праз пяць год, і ўбачыць, якая яшчэ частка старажытнай будыніны вырвана з небыцця, аддадзена і вернута жыццю.

Колькі тут работы! Тым болей, што не ў такім далёкім мінулым гора-работнічкі нашкодзілі будыніне горш чым, не нанач будзе згаданы князь Трубяцкі: раскрылі над фрэскай "Трубяцкой разні" дах, каб паставіць новы, ды так і забылі на зіму. Фрэску абмывала дажджом і снегам і часткова моцна пашкодзіла. Цяпер выпраўляй пасля іх.

А там жа, дзе яны зберагліся, фарбы на фрэсках дзівосныя, надзвычайна жывыя. Глянуць праз павуціну гадоў вочы — наскрозь цябе бачаць.

Вось пра што думаць нам усім трэба, вось на што звяртаць увагу, на гэтыя дзівы, вышыні духу і таленту чалавечага, якіх і ў сталіцах пашукаць. І звярнуць на іх самую пільную ўвагу — вось гэта ёсць наша справа, справа ўсяго нашага жыцця і наш гонар.

Трэба скарыстацца са шчырага жадання раённай улады быць карыснай (не тое што ў некаторых: знесці і справе канец, і клопатаў менш), з павагі іхняй да таго, што мае іхні горад, і ўсімі сіламі дапамагчы ім.

…Рачулачка, светлы-светлы пасля дажджу бярозавы гай,

растрапаныя сады, хаты з дзіўнай, неўласцівай для Мсціслаўшчыны і ўсёй сярэдняй паласы Беларусі формай даху: чатырохскатнай, з усечаным зверху і знізу шчытом-франтонам (з залобкам і прычолкам). Вёска Малькаўка. Дзіўная нейкая вёска. Не такая, як навакольныя, у форме зрубаў, у шалёўцы, у размяшчэнні надворных пабудоў.

І, у дадатак да ўсяго (крытык-натураліст, даруй!) у адказ на твой "добрыдзень" дзяўчына, якая палошча ў рачулцы бялізну, нядбала кідае табе ў адказ:

— Лаба дзіена (Добры дзень).

— Каіп гівянімас? (Як жыццё?) — моцна ашаломлены, запінаецеся вы.

— Ачу, герай. (Дзякуй, добра).

Нішто сабе сустрэча. У чатырохстах з гакам кіламетрах ад Вільні (гэта як птушцы ляцець, а калі па дарогах, то ў пяцістах) — чысцейшая, нібы ў тэатры, літоўская мова.

Як літоўцы тут апынуліся, я так і не мог дакапацца. Кажуць, што нібыта ў часы прыгоннай рэформы (ці да яе ці пасля) купілі тут зямлю і перасяліліся. Калі гэта так, то гэта годны прыклад таго, як можна сто дваццаць год пражыць сярод чужой моўнай стыхіі і зберагчы сябе, сваю мову, свае звычаі, свае песні.

Гэты маленькі астравок збярог таксама літоўскую грунтоўнасць, неймаверную працавітасць, сумленнасць у адносінах да справы. Паўсюль сляды старанна прыкладзеных рук і дабрабыт. Хаты дагледжаныя, гароды і палі чыстыя, між кашлатых "медуніц" (дробныя і вельмі салодкія яблыкі) аж гудзе паветра ад пчол над вуллямі.

З гэтай вёсачкі, закінутай далёка-далёка ў беларускія палі, выйшаў І.А.Манюшыс, які быў старшынёй Савета Міністраў Літвы. Вось якія зігзагі робіць часам рэальнае жыццё. Ну, калі ўлічыць, што недзе ў Мсціслаўскім навеце быў маёнтак К.Судзілоўскага, бацькі Мікалая Канстанцінавіча Судзілоўскага — "Руселя", які арганізаваў сацыялістычны рух у Румыніі і Балгарыі, а пасля быў лідэрам партыі незалежных і членам сената Гавайскіх астравоў — то гэта яшчэ не самы дзівосны выпадак на свеце.

…Малая Багацькаўка вёска старая, з адметным абліччам, з шэрагам стаўкоў, на берагах якіх адпачываюць качкі і шэрагамі ходзяць важныя гусі. Старыя сады. Старыя дрэвы. Ашалелы малады жарабец, які, закінуўшы галаву, ляціць на злом шыі ўздоўж ставоў, сп'янелы ад адчування сваёй прыгажосці і бязмежнасці маладой сваёй сілы.

У вёсцы ў чысценькай хаціне жыве яшчэ пляменніца пісьменніка, Клаўдзія Іванаўна Шнарская. Ад старых часоў нічога ў яе не засталося, толькі кнігі Максіма, падараныя ў апошнія гады

геолагам, дзядзькам Гаўрылам. Мілая, з мяккім голасам жанчына.

А вёска што ж? Вёска, з папраўкай на новае, тая самая, што і ў "Камароўскай хроніцы". Пачытайце ці перачытайце яе. Гэта і зараз досыць аддалены куток, а ў часы юнацтва пісьменніка да Мсціслава было, як і цяпер, дваццаць пяць, але ад Мсціслава да бліжэйшай чыгуначнай станцыі было не васемнаццаць, а шэсцьдзесят кіламетраў. Дарога да Слаўнага. Вось у прастакутніку са старых дрэў стаіць старая царква. Вельмі, надзіва вялікая для такой вёскі. Шалёўка збольшага паабдзёртая, у старых, моцных, як косць, бярвеннях кутыя цвікі з квадратнымі капялюшыкамі.

Як там у Гарэцкага ў "Антоне"?

"І на двары, на цвінтары народу нямала, аж мітусіцца ўсё пад старымі ліпінамі, і ў званіцы бабулек стаіць і сядзіць даволі, і на званніцу хлапчукоў-галузаў панабівалася, і ў цэркву аж дабіцца не можна".

Няма нікога ні на цвінтары, ні пад званіцаю, ні на ёй. Царква замкнёная, вартоўня ля яе таксама.

…Едзем далей. Роўнае поле і раптам на ім, сапраўды, як воспа, правалы па некалькі метраў глыбіні, густа зарослыя бярозкамі, вольхамі, асінкамі, лазой, розным хмызняком. На дне часам збіраецца і застойваецца вада. Церабі гэтыя аборкі, раўняй не раўняй — толку мала.

Вырашыў я пазваніць Г.І.Гарэцкаму. Каму ўжо, як не яму, славутаму геолагу, лепей ведаць, што робіцца з зямлёй у яго родных мясцінах?

Гаўрыла Іванавіч, вядома ведае і гэта:

— Апісана гэта і вытлумачана яшчэ ў 20-я гады. Быў такі Георгі Фёдаравіч Мірчынк…

Пра Мірчынка крыху ведаю і я. Адзін з заснавальнікаў навуковай школы геалогіі чацвярцічнага перыяду. Акадэмік Акадэміі навук БССР. Аўтар славутай кнігі "Геалогія чацвярцічных адкладанняў". Але я ніколі не звязваў яго імя з Мсціславам. Ну, але ж цікава пачуць пра яго ад чалавека, які яго добра ведаў.

Ён родам з лужыцкіх сербаў, што пераехалі сюды. Бадай што адзін з самых вялікіх знаўцаў антрапагену Беларусі. Ён, між іншым, растлумачыў і паходжанне "аборак", і апісаў іх. Ён і ўвёў і замацаваў у геалагічнай літаратуры свету гэтае беларускае, не, нават мсціслаўскае слова: "аборкі". Цяпер хай сабе англічанін апісвае гэтую з'яву або, скажам, іспанец — усё адно ён карыстаецца словам "аборка".

— Ну вось. А ў слоўніках беларускіх гэтага слова няма. Нават у пяцітомным тлумачальным. У трох значэннях гэтае слова дадаецца, а ў "нашым" — не.

— Можа, не ведаюць. Можа, лічаць за мсціслаўскае, абласное, дыялектнае. Адкуль ім ведаць, што гэтае абласное мсціслаўскае слова стала класічным тэрмінам, што яго па ўсім зямным шары геолагі ўжываюць?

— Дык што гэта ўсё ж такое?

— А гэта прасадачныя сподачкі.

— Лёсавыя прасадкі?

— Ну так. Там, дзе ёсць лёсавыя пароды — там і яны ёсць. Вада праходзіць, і яны прасядаюць.

Ну так, зараз і я ўспомніў, што порыстасць лёсавых парод 45–55 працэнтаў, а значыць яны здатныя зберагаць ветрыкальныя адхоны (вось, мабыць, чаму час не размыў і не згладзіў яроў Замчышча ў Мсціславе) і даваць вертыкальныя прасадкі пры ўвільгатненні. Проста нешта накшталт падатку, які прырода наклала на людзей за ўрадлівасць глебы: "дала ж я вам плодную зямлю, такую багатую і смачную — трэба ж, каб хаця нешта было не зусім так. А то вы хочаце як мёд той, лыжкай, ды яшчэ вялікай".

— Там іх многа. А ля нашай Малой Багацькаўкі скрозь яны.

— Сердзюкоў вось змагаўся з імі. Мабыць, не атрымалася.

— А я нічога не мог. Іх увогуле не трэба засыпаць, хай так і будуць.

— Але ж… Вось механізатары.

- І ім, калі разабрацца, не трэба. Вадзе ж некуды падзецца трэба, а мясцовасць роўная. Вось яна і робіць

сама сабе сцёк.

— Дык што ж іх, так і кінуць без карысці?

— Чаму? Яны могуць быць вельмі карысныя. Для вадаплаўнай птушкі. Хатняй, а пры ёй і дзікай. Качак

там трэба разводзіць, гусей. Яны ж так любяць гам. Вось няхай і пасвяцца. Вялікімі чародамі.

Дарэчы, калі ўжо зайшла размова пра Сердзюкова, ягоную работу па ўпарадкаванню зямлі і, у прыватнасці, па расцяробу аборак, то мы якраз едзем праз вёску, у якой ён амаль паўтара стагоддзя назад гаспадарыў, праз Кудрычы.

…Дзіўнай прыгажосці краявіды вакол. Чысцюткая Віхра, нічым яшчэ не засмечаны Сож, у які яна ўпадае. У плынях брохае рыба. А за Сожам, дзе ўжо Смаленшчына, цёмная лясная града аж да Бранскіх лясоў (там і ў Чавускім раёне лясы, а на Мсціслаўшчыне, за рэдкім выключэннем, толькі пералескі).

…Бязмежная пойма Сожа. Пералескі і высокія аблокі над імі. За кіламетр ад Крычаўскага раёна, над Чорнай Натапай, непадалёк ад яе ўпадзення ў Сож, патанае пад высокімі дрэўнымі шатамі вёска Ануфрыева. І яшчэ здалёк відаць над ёю волатаву,

стройную і зграбную, як сасновы ствол, пяціярусную званіцу.

Ануфрыеўскі манастыр заснаваны за тры гады да Грунвальда (1407) ягоным героем Лугвенам Сямёнам Мсціслаўскім. З тых часоў тут нічога не засталося. Але званіца і сабор гэта ўзорны класіцызм і ці не пачатак XIX стагоддзя. Будынкаў гэтага часу таксама мала. А будыніна гэтая велічная і прыгожая, і хаця моцна пабітая ў вайну кулямі і асколкамі — прыдатная для аднаўленя можа, нават, лягчэй, чым Мсціслаўскі Кармяліцкі касцёл.

О, дзіўная і праз меру небам прыўкрашаная мсціслаўская зямля! З далёкімі званіцамі і звонам каласоў, са светлымі рэкамі і светлымі людзьмі, з гарачым блакітам улетку і бляклашафранавым, з палосамі колеру прускага блакіту, заходам узімку. З трапяткімі і шаўковымі бярозавымі гаямі — і пахмурным заснежаным яловым лесам (на грані прыцемку і ночы), над якім безнадзейна змірылася глухое неба. З залатым россыпам вясновай лотаці і крывавым асеннім лістападам.

Услаўленая будзь і шчаслівая будзь!

Той, хто пакідае цябе, з першага ж моманту ўносіць у сэрцы тугу па табе. Тугу і жаданне калі-небудзь вярнуцца. Да калыскі продкаў сваіх.

…Машыну трасе і кідае. Паволі адступае ад горада навальнічная хмара. Ад яе і ад старых дрэў у старадаўнім доме, што згубіўся ў гэтых дрэвах, цёмна, і нехта няўчасна запаліў там святло.

Хто? Можна ўявіць каго хочаш. Хаця б таго ж Насовіча, які запаўняе картку на чарговае слова для неўміручай сваёй працы.

Якое слова? А хоць бы — давайце на развітанне ўсміхнёмся — і такое:

"Недаська" — насмешлівае названне ўраджэнца горада Мсціслава. Мсціслаўцы недаські. Хітры недаська!

А можа, за гэтым акном гуляе з цацкамі нейкі малы, які праславіць свой горад на ўвесь свет, як праславілі яго ўжо многія.

…Аддаляецца горад, меншаюць сады і званіцы. Але не меншае над ім ліловая хмара і на гэтай хмары вялізная і празрыстая, прамытая вясёлка.

Можа, не ўсім пашанцуе ўбачыць гэты горад такім дыяментавым, якім убачыў яго я, і сказаць яму "бывай" пад такой яскравай вясёлкай.

Можа, нехта гляне на яго і ўбачыць усяго маленькі закінуты ў палях і лясах гарадок, узімку ў гурбах, улетку ў разлівах кветак.

Але мне ён зрабіў ласку, адкрыўся вось такім, зіхотным і вясёлкавым, і такім я й падношу яго вам у гасцінец.

Вазьміце яго, як мой малы вам дар.

Светлай табе раніцы, руплівага табе дня, спакойнага і

аранжавага табе вечара пад дыяментавай вясёлкай.

І будуць людзі на зямлі

Калі гэта было — дальбог, не ведаю.

Ва ўсякім разе даўно… Даўно, калі мераць час меркай аднаго жыцця.

Наш дом стаяў на крутаяры над Дняпром, аддзелены ад яго алеяй старадаўніх ялін. За домам быў вялікі сад, увесь зарослы і цяністы. А за садам стаяў вельмі стары, уросліы ў зямлю дом, які належаў гаспадарам з дзіўным прозвішчам: Косця. У доме былі печы з маляванымі галандскімі кафлямі і бронзавымі круглымі аддушынамі.

У гэтым доме спыняўся Напалеон, калі ішоў у паход, які яго загубіў. І таму дом здаваўся мне прывабным і страшнаватым, не такім, як усе астатнія аршанскія дамы.

У тую ноч над Дняпром раўла страшэнная навальніца. Вецер удзіраўся праз яліны ў сад, глуха шумеў іхнімі лапамі, варушыў парадзелую лістоту дрэў.

Мой бацька, які ўвогуле не вельмі любіў вершы, падышоў да акна, прыціснуўся лбом да чорнай шыбіны і, гледзячы некуды ў змрок, ціха сказаў:

Реве та стогне Дніпр широкий,

Сердитий вітер завива…

Радкі, якія ведаюць усе людзі і якіх тады яшчэ не ведаў я. Самыя, калі можна так сказаць пра вялікае, "збітыя", самыя "зацяганыя" радкі. І яны раптам аддаліся ў сэрцы вялікай праўдай, адпаведнасцю таму, што рабілася за акном.

Я спытаў у маці, хто гэта.

— Шаўчэнка.

Дняпро, па маіх тагачасных перакананнях, быў нашай, маёй ракой, і я спытаў:

— Ён наш?

— Ён украінец. Яны таксама на Дняпры. Ніжэй па плыні.

"Ніжэй па плыні" азначала тады для мяне "за Ляўкамі", апошняй павароткай ракі, якую я ведаў, Нішто сабе. Блізка. Суседзі. Свае.

Я тады яшчэ не ведаў, да якой ступені я меў рацыю, лічачы гэтага чалавека "сваім". Я проста не мог уявіць, колькі жыццёва важных сустрэч мае адбыцца ў мяне з ім. Розных сустрэч: у горы і ў шчасці, у хмельным ап'яненні юнацтва і сталай задумлівасці.

Першае пачуццё, калі я пачаў чытаць Тараса, было, вядома, не роздум і не суперажыванне. Гэта было хутчэй амаль фізічнае адчуванне заміраючага сэрца. Сэрца замірала ад размаху фантазіі

паэта:

Червоною гадюкою
Несе Альта[2] вісти,
Шоб летіли крюки з поля
Ляшків-панків істи.

Уявіш сабе гэтую поўную крыві гадзюку-раку і здрыганешся ад той жудасці, якая ахоплівае ўсю істоту, калі чытаеш сапраўды вялікі, просты твор няпростага мастацтва.

Лёс зрабіў так, што мае шляхі часта праходзілі праз тваю, Вялікі Кабзар, Украіну, перасякалі твае дарогі. Я трапіў туды неўзабаве пасля вызвалення Кіева (Беларусь яшчэ была пад акупантамі), Крашчацік быў разбураны, але ў Крашчаціцкім завулку збярогся дом, дзе ты жыў. І стаяла чырвоная каробка універсітэта, у якім ты выкладаў бы мастацтва, каб цябе не арыштавалі за бунтарскія вершы. Праз некалькі год я пайшоў вучыцца ў той самы корпус. Ва універсітэт, які носіць тваё імя. І твая Украіна на цэлыя сем год стала мне другой радзімай.

Домік, у якім ты жыў, стаў музеем. У ім была дзівосная печка. Яна адна ацяпляла ўсе пакоі, выходзячы ў кожны хаця адной нейкай маленькай сваёй гранню. І быў пакойчык у мезаніне, дзе стаяў твой мальберт, ляжаў твой гадзіннік і твае пэндзлі. Можа, адным з іх ты маляваў Кацярыну і дзеда, які рэжа лыжку з грушы і сумна глядзіць на дзяўчыну?

Не. Кацярыну ты маляваў яшчэ ў 1842 годзе. Праз пяць год цябе арыштавалі і дзесяць год трымалі ў ссылцы. Значыць, ты маляваў гэтым пэндзлем нешта іншае. Магчыма, дамалёўваў серыю акварэляў. Магчыма, мой улюбёны "Від на Кара-Тау". І зноў не, бо пэндзаль не акварэльны.

То што?

Не скажаш. І ўсё ж гаворыш.

У студэнцкія гады я з сябрамі хадзіў да цябе ў Канеў, на Чарнечую гару. Ішлі доўга, шмат разоў пераплывалі на сялянскіх дубках праз Дняпро, спыняліся ля крыніц, ішлі па высокіх кручах Трыполля. І зямля была падобная і не падобная на Украіну. Хаты тыя самыя, але вакол былі старыцы, дубы, шаўковіцы на пяску і тэрыконы бітых ракавінак у кожным двары. Гэтыя тэрыконы яшчэ здалёк ззялі перламутрам — аж вачам было балюча.

І раптам адкрылася перад намі гара твайго запавету. І ты ў бронзе. А пад табою твой Дняпро. Мой Дняпро. У чалавека бывае шмат успамінаў, але гэты быў з тых нешматлікіх, якіх не забудзеш.

Пасля універсітэта я два гады настаўнічаў не так і далёка ад

тваёй Звянігарадчыны. Пад Белай Царквою. Ля Тарашчы. У мясцінах, што ты апісаў у "Прагулцы з задавальненнем і не без маралі".

Сяла, прыгажэйшага за мае Лесавічы, па-мойму, няма на Украіне. Сады, белыя хаткі, Катлуй, які абмывае падэшвы ўзгоркаў, утвараючы бясконцыя стаўкі. І песні, песні такой дзівоснай прыгажосці, што шчыміць у сэрцы.

Маліцеся лёсу, паэты, каб ён даў вам у сэрцы вашага народа хоць сотую долю таго месца, якое займае ў сэрцы звычайнага ўкраінскага селяніна Тарас. Гэтага хопіць. Старыя, амаль непісьменныя дзяды чыталі некаторыя яго творы на памяць. І калі над белымі букетамі цвітучых садоў басілі хрушчы — гэта было як Тарасаў "Садок вншневий". І, напэўна, мала хто ў такія празрыстыя вечары не ўспамінаў аб ім.

Хрушчы басілі над вішнямі, як тысячы тысяч сімпатычных бамбавозаў. І гаспадар мой, філосаф ад прыроды, з двухкласнай асветай, ідучы са мною ў Тарашчу і ўзыходзячы на гару, кожны раз спыняўся, аглядаў беленькія ў зялёным хаткі і з чуллівай усмешкай дэкламаваў:

Неначе писанка сіло.

Гэта было на тваіх шляхах, Тарас.

Хадзіў я і ў Лысянку над Гнілым Цікічам, сяло сто разоў апісанае паэтам. Тут ён часта бываў. Тут пабудаваў калісьці палаты Багдан Хмель. Будынак пазней разбурылі людзі Гонты і Залізняка.

Усе гэтыя мясціны былі месцам страшнага пажару гайдамацкай вайны. Гэта тут сяляне-рыцары разбіралі вазы з "жалезнай тараннюю[3] і рэзалі магнатаў. Гэта тут палалі палацы.

Дзве сабакі заўсёды знюхаюцца, калі справа ідзе аб іхняй шкуры. Войска царыцы памагло магнатам Польшчы. І калі нават у наш час тут можна пачуць яшчэ апавяданні пра тыя неспакойныя часы, то можна ўявіць, якім было водгулле навальніцы ў гады дзяцінства вялікага паэта. І мне здаецца — што б тут ні казалі — што менавіта адсюль ён і паходзіць: гэта — апошняе зіхаценне вялікага зарава былых навальніц і першая зарніца будучага вялікага ўрагану.

Як кожны чалавек, ён не ведаў і не мог ведаць сілы пражытага ім жыцця, магутнасці сваіх слоў. Ён не ведаў, што ён — зарніца. Яму здавалася, што ён — толькі апошні ўсплёск зарава.

Ацэньваюць нашчадкі. Сучаснікі — лямантуюць на руінах, як Іерамія. Жолуду, які ўпаў са зрынутага, вялікага калісьці дрэва, заўсёды здаецца, што гэта канец. Ён не ведае, што ён, самотны і

малы для самога сябе, ёсць эстафета будучыні, што ў ім — карані, галіны і лісці вялікага дрэва лютасці, якое будзе весці спрэчку са стагоддзямі, зберагаць сабою чыстыя крыніцы і даваць цень усім добрым людзям.

Жолуд не ведае. А між тым ён — прыклад для кожнага змагара. Нішто не знікае ў свеце. Слязіна крыўды адальецца акіянам. І адно жыццё можа назаўсёды пераважыць шалі вагаў, калі яно — для людзей, калі яно — высакароднае.

У першых вершах Тараса загучаў гнеў і адчай. Гэта і зразумела. Лагодны, смелы і горды народ, абяскроўлены войнамі і паўстаннямі, здраджаны, абылганы, закоўвалі ў кайданы. Слізкі ад крыві бізун лунаў над спінамі людзей. Свісталі шпіцрутэны. І гэта не Тарас Трасіла, а Тарас Шаўчэнка плакаў над прыніжэннем роднай зямлі:

Обізвавсь Тарас Трясило
Гіркими сльозами:
— Бідна моя Украіно,
Стоптана ляхами!

Па загадзе дзяржаўнага фельдфебеля армейскія фельдфебелі здзекаваліся над самой гісторыяй, раскопваючы магілы, выкідаючы з іх шматпакутныя касцякі. Туга "Розритоі могили" ідзе адсюль.

Веданне гісторыі, любоў да яе — гэта падмурак, на якім чалавек — у дадзеным выпадку паэт — будуе трывалы будынак свайго жыцця. І варты жалю той, у якога такога падмурку няма: мурашка, закінутая ў мора, бездапаможнае кацяня ў твані.

На гэтым падмурку Тарас пабудаваў велічны гмах сваёй паэзіі, галоўнай рысай якой стала багаборніцтва. Таму што слабы дазваляе адчаю прыдушыць сваю любоў, а моцны даходзіць да поўнага забыцця небяспекі і пачынае пагарджаць тленным і схільным да болю целам сваім у імя гонару, у імя справы, у імя любві да зямлі і людзей.

І тут ужо чым больш ворагаў, тым лепш. Губляць няма чаго, а слава — большая.

Цар — давай цара, бог — давай бога!!! Таму, што ўладары шныраць вачыма па ўсіх канцах зямных, ці нельга захапіць чужы край і ўзяць яго з сабою ў труну. Няма сілы бачыць гэта, і чалавек крычыць — усё адно дзе: на людных плошчах ці ў пустынях. Няхай не пачуюць ні там, ні там — абы не быць саўдзельнікам брыды, якую чыняць тыраны.

Знішчаць? Няхай. Смерць лепшая за такое жыццё.

Яго любоў да людзей не ведала межаў. Часам яна

прыкрывалася панцырам іроніі, часам аддавала горкім сарказмам. Шаўчэнка надзіва па-юнацку страсны. Ён прымушае кожнае сэрца біцца ва унісон са сваім, магчыма, больш чым які другі паэт на зямлі. І таму ён друг, таварыш дум, паплечнік усіх узростаў.

Ён чалавек дзівоснага, неверагодна рэдкага на зямлі складу.

Ніколі ў жыцці ён не ведаў кампрамісаў. Роўнасць у яго азначае "роўнасць для ўсіх", без аніякіх выняткаў. Толькі што перажыўшы незлічоныя пакуты салдатчыны, ён слухае на параходзе ігру "прыгоннага Паганіні" Панова.

"…з тваёй беднай скрыпкі вылятаюць стогны зняважанай прыгоннай душы і зліваюцца ў адзін працяглы, сумны, глыбокі стогн мільёнаў… Ці хутка даляцяць гэтыя прарэзлівыя крыкі да твайго свінцовага вуха, наш праведны, няўмольны, неўлагодны божа?"

Роўнасць была патрэбная яму не ў нейкай там легендарнай будучыні, а сёння, зараз, вось тут, пад страхою кожнай мужыцкай хаты. Ягоныя радкі аб вёсцы і дагэтуль нельга чытаць без слёз абурэння і гневу.

…Латану свитину з каліки знімають,
З шкурою знімають, — бо нічим обуть
Княжат недорослих. А он розпинають
Вдову за подушне, а сина кують,
Единого сина, едину дитину,
Едину надію! — в військо оддають!

Да віноўнікаў такога не можа быць іншага пачуцця, акрамя нянавісці. Усё адно хто яны: тупыя капралы або ліберальі-панкі, ханжы, манюкі, "заўзятыя патрыёты", якія ўмеюць абдурыць нават славу.

Кругом паскуда!
Чому ж його не так зовуть?
Чому на його не плюють?
Чому не топчуть?! Люди, люди!
За шмат гнилої ковбаси
У вас хоч матір попроси,
То оддасте.

Па-мойму, гэта азначае: знішчыць на месцы.

У каземаце, загнаны ў пустыню, Шаўчэнка кіне словы, споўненыя той гардыні, без якой людзі не былі б людзьмі: "караюсь, мучусь, але не каюсь". У яго не можа быць дылемы

Галілея з адной замежнай п'есы: пайсці на касцёр або пакаяцца, каб "даўжэй гаварыць праўду". Есць ва ўсім гэтым нешта невыказна брыдкае, і нездарма легенда выправіла яву, сказаўшы: "А ўсё ж яна круціцца".

Душу ўладна бярэ ў палон стойкі гонар за тое, што сярод роду чалавечага быў такі чалавек. Нібы сам беспамылковы інстынкт народа, вопыт усіх яго пакаленняў узрос у адной душы.

Агульнапрынятым, напрыклад, быў погляд сучаснікаў на Пятра I як на ўвасабленне велічы, як на з'яву, што можа абяліць рабства і тыранію. І вось Шаўчэнка перад помнікам Пятру:

Кінь басуе, — от-от річку,
От… от… перескочить,
А він руку простягае,
Мов світ увесь хоче
Загарбати.

А вось як выглядаюць пад пяром паэта Пятро і Кацярына:

Кати! Кати! людоіди!
Наілись обое,
Накралися! А що взяли
На той світ з сабою?

Слава асвянцоных афіцыйнай гісторыяй муроў — вось яна:

…а з шкур наших
Соби багряницю
Пошив жилами твердими
І заклав столицю
В новій рясі. Подивися:
Церкви та палати!
Веселися, лютий кате,
Проклятий! Проклятий!

І так паўсюль. У паэта адна думка — думка народа.

Усе булгарыны і чужбінскія могуць ледзь не з амбонаў крычаць, што разгром народнай самасвядомасці — дабро. А Шаўчэнка адказвае:

І забули сірий попіл
По вітру розвіять.

Лежить попіл на розпутти,
А в попелі тліє —
Іскра огню великого.
Тліє, не вгасає,
Жде підпалу, як той месник,
Часу дожидає…

Клерыкалы могуць лямантаваць, што праваслаўе, самадзяржаўе і народнасць — дабро. А ён ведае, што ўсё гэта — фальшывыя гучныя словы, прыкрываючыся якімі, нянавісць, варварства і карыслівасць робяць свае цёмныя справункі.

У нас
Святую Біблію читае
Святий чернець і научае,
Што цар якийсь — то свині пас
Та дружню жинку взяв до себе.
А друга вбив. Тепер на небі!
От бачите, які у нас
Сидять на небі.

Прадажныя гісторыкі выстаўляюць гнюсную расправу з паўстанцамі Каўказа як высакародную справу. Толькі два чалавекі падымаюць голас супраць маны — Леў Талстой і Тарас Шаўчэнка:

Ми хрястияни: храмы, школы,
Усе добро, сам бог у нас!
Нам тільки сакля очі коле:
Чого вона стоіть у вас,
Не намі дана; чом ми вам
Чурек же ваш та вам не кинем,
Як цій собаці! Чом ви нам
Платить за сонце не повинні!

Іронія і сарказм мацнеюць. Здаецца, немагчыма ўжо ні ў каго верыць. Народ змучаны паборамі, замардаваны, прыніжаны. Ён адрокся ад свайго слова, нават ад імя свайго. Немагчыма не кідаць у твар людзям слоў горычы і… немагчыма не любіць іх.

За каго ж ти розіп'явся,
Христе, сине божий?
За нас, добрих, чи за слово

Істини… Чи може,
Щоб ми з тебе насміялись?
Воно ж так і сталось.

Несправядліва было б не звярнуцца са словам да тых, што дапусцілі такое. Так нараджаецца адна з лепшых рэчаў "І мертвим, і живим", магутная, адчайная і, на жаль, амаль безнадзейная спроба абудзіць сумленне ў тых, што, стаўшы над простымі, зажэрліся, забылі аб тым, хто яны, якога народа дзеці, забыліся на ўдзячнасць, на неабходнасць плаціць борг.

Умийтеся! Образ божий
Багном не скверніте.
Не дуріте дітей ваших,
Що вони на світі
На те тільки, щоб панувать…
Бо невчене око
Загляне ім в саму душу
Глибоко! Глибоко!
Дознаються небожата,
Чия на вас шкура,
Та й засудять, — і премудрих
Немудрі адурять!

Падпявалы хлусні, парафіяне дурасці, слугі ўвасобленай бяздарнасці, з інтэлектам, спалоханым яшчэ ў матчыным лоне, — вось яны, бязлітасна высмеяныя паэтам:

Німець скаже: — Ви моголи.
— Моголи! Моголи! —
Золотого Тамерлана
Онучата голі.
Німець скаже: — Ви слав'яни.
— Слав'яни! Слав'яни!
Славних прадідів великих
Правнуки погані!

Паны і паўпанкі, уладары душ, цемрашалы, паборнікі бізуна, закляймёныя пякучым Шаўчэнкавым словам:

А чванитесь, що ми Польщу
Колись завалили!..

Правда ваша: Польща впала,
Та й вас роздавила!
Доборолась Украіна
До самого краю.
Гірше ляха свої дітит
Іі розпинають.

Паўстае перад вачыма "містычная", змрочна-жорсткая ад любві паэзія "Велікого льоха"[4] — аднаго з найбольшых дзіваў у паэзіі.

Усім ладам сваім яна неабвержна сведчыць, што няма даравання тым, хто апраўдвае прыгон і дзеянні цароў, усіх гэтых Мучыцеляў і Пятрух, якіх нібыта трэба ўсхваляць за іхнія дзеі і якіх сучасныя ім прыгонныя мужыкі лічылі за антыхрыстаў. Нельга апраўдваць тых, што далі магчымасць вароне ўкрасці кавалак жоўці ў засланага дзекабрыста, тых, вялікіх, што тысячамі губілі людзей на будове Пецярбурга, на Ладазе, у Фінляндыі, на Арэлі.

Теперь уже заходились
Древності шукати
У могилах… бо нічого
Уже з хати взяти.

Раскопваюць магілы, і ў вочы ім смяюцца касцякі. Каб яшчэ ў форменных кайданах, то прыдаліся б. Але кайданы старыя. І золата няма. І няма нашчадкам карысці ад гордай беднай гісторыі.

І такі чалавек мог існаваць у чорны, у жалезны, у подлы век! Нездарма, відаць, гаварылі аб такіх вароны

2

Я золотом розтопленим
Заллю йому очі!..

1

А він, клятий недолюдок,
Золота не схоче.

3

Я царевыми руками
Скручу ему руки!..

2

А я зберу з всього світа
Всі зла і всі муки!..

Мукі сабралі. Каземат. З забаронаю пісаць і маляваць. Узнагарода за сапраўдную любоў да радзімы. Адзіная ўзнагарода, якой можна ганарыцца.

І адначасова ў гэтым пакаранні — усё бяссілле катаў. Што з ім сапраўды рабіць? Хіба знішчыць? Але мёртвы не пакутуе. Зламаць? Але такія нязломныя.

Знішчыць — застанецца песня. Заточыш — застанецца жывая нянавісць. Кабзар стаўся мацнейшы за фельдфебеля ў парфіры. Але яго казематныя вершы — гэта згусткі пакуты і болю. Менавіта гэтыя гады далі "Садок", які мог бы здацца ідылічным і саладжавым, каб мы не ведалі, калі ён напісаны.

Ідылія знікае. Застаецца плач па волі, смяротная настальгія і пяшчота. Каб ён быў толькі нязломны прарок — мы, магчыма, болей паважалі б яго, але так не любілі б. Каб ён пісаў толькі вершы пра тугу — мы шкадавалі б яго, але не захапляліся. Ён пісаў і тое і другое. Пад пагрозай кары.

У гэтыя гады з'явілася ў свет, бадай, самае чароўнае стварэнне яго — балада, якая сваімі трыццаццю чатырма радкамі адна вартая юнацкай "Кацярыны", балада "Рано-вранці новобранці".

Маці вярнула дачку, якая пайшла была за навабранцамі. Потым пахавала яе і сама пайшла ў старцы. Пахілілася хата. І вось аднойчы прыйшоў на мыліцы салдат, сеў і задумаўся. Хата пустая. А калісь жа тут ткаліся ручнікі, мярэжыліся шоўкам вясельныя хусткі. І ён думаў жыць і кахаць.

Сидить собі коло пустки,
Надворі смеркає.
А в вікно, неначе баба,
Сова виглядає.

Не ведаю, як у каго, а ў мяне марозам цягне па скуры, так гэта хораша. І ўсё гэта не толькі абвінавачванне супраць дзяржавы, якая ваюе, жандарыць і трушчыць людскія жыцці. Гэта

яшчэ і прадбачанне свайго лёсу. Плач аб пакінутай радзіме, хаце, аб дзяўчыне, з якой ён ніколі не сустрэнецца, плач аб сваёй самотнай старасці.

Такога, магчыма, ад яго і чакалі.

І памыліліся. Ён застаецца нязломны. Яму здаецца, што і самога бога даўно праклялі людзі. Значыць, няма чаго маліцца. Толькі што адпушчаны на волю, ён, ні пра што не забыўшы, нічым не навучаны, піша яшчэ больш выбуховую рэч:

Німіі, подліі раби,
Підніжки царськіі, лакеі,
Капрала п'яного! Не вам,
Не вам, в мережаній лівреі
Донощики і фарисеі,
За правду пресвятую стать
І за свободу. Розпинать,
А не любить ви вчились брата!
О роде суетний, проклятий,
Коли ти видохнеш? Коли
Ми діждемося Вашінгтона
З новим і праведним законом?
А діждемось-таки колись!

Яшчэ больш ярасна накідваецца ён на царкву, якая мірылася з усімі гаспадарамі, абы яны дазвалялі ёй жыць і гандляваць Хрыстом. З цэзарамі, што цкавалі хрысціян ільвамі, з язычнікамі, што забівалі папоў. Царква-блудніца, відаць, толькі з-за сусветнай славы самога пана Езуса не аб'явіла яго "ілжэнастаўнікам" і "ерэсіярхам", бо ўся гісторыя царквы ёсць актыўнае адмаўленне Евангелля, бо людзі, якія ліжуць мірскім уладарам пяткі, відавочна, забылі словы аб "сусветных валадарах цемры гэтага веку". І таму — дзярыце з баграніц анучы, курыце люлькі з кадзіл, паліце "яўленнымі" печку, вымятайце крапілам новую хату.

Нянавісць душыла паэта. Здохла "Сука", жонка Мікалая І, галодных дзяцей з прытулкаў гналі за труною "маці народаў", дзякаваць за шчаслівыя забавы дзяцінства. Паэт задыхаўся:

І день іде, і ніч іде.
І голову схопивши в руки,
Дивуешься, чому не йде
Апостал правди і науки!

Ставячы перад сабою гэта пытанне, ён не ведаў, што апостал

праўды і навукі даўно ўжо з'явіўся ў свет, ударыў грамавержца, прыкутым Праметэем пакутаваў у пустынях і цяпер памірае ад пакут, якія даў яму лёс, ад няздзейсненых жаданняў, ад няволі.

Не ведаў, што апосталам гэтым быў ён сам.

…Буде бите
Царями сиянее жито!
А люди виростуть. Умруть
Ще незачатіі царята…
І на оновленій землі
Врага не буде, супостата,
А буде син, і буде мати,
І будуць люди на землі.

Людзі будуць, урэшце, на ўсёй зямлі. І ў немінучым чаканні гэтага мы павінны вечна дзякаваць светачам, і сярод іх Кабзару, за тое, што ён вучыць таму, што не падмане і не састарэе: любові да чалавека, вучыць адзіна вартаму ў свеце — мужнасці.

Вось і ўсё аб тым, як жыццё ўвесь час сутыкала мяне з думамі і радкамі Шаўчэнкі.

Нічога незвычайнага. Усё такое ж, як і ў мільёнаў іншых людзей. У мільёнаў, з якіх я не вызначаюся нічым. Бо так думалі аб ім і так сустракаліся з ім — усе.

Артэрыя Дняпра з'яднала мяне калісь з тваім, Кабзар, радзінным месцам, з домам, які даўно ўжо стаў попелам.

Стаў попелам? Так. Але з попелу гэтага выкрасаўся агонь, які адзін спаліў на нашай грэшнай зямлі больш нечысці, чым тысячы іншых вогнішчаў.

І таму я схіляю перад табой галаву, слава Украіны і ўсіх краін зямлі, мой Бацька, багаборац з майго Дняпра.

Памяць зямлі беларускай

Прадмова да кнігі

Я хачу правесці Вас па зямлі, якая для мяне — і, мабыць, не толькі для мяне — даражэй за ўсё, самы ўтульны і чароўны кут. І ў Вас, калі Вы наведаецеся сюды, у сэрцах могуць успыхнуць пяшчота і любоў да яе, і таму загадзя раблю Вам падарунак: сапрычашчэнне з яе вялікай памяццю. Добрай і суровай памяццю, якая нічога не забывае, Памяццю Беларусі.

Якая яна, мая зямля? Гэта залатыя палі збажыны з сінімі вочкамі васількоў, светлыя ад бяроз гаі, што аглухлі ад птушынага звону, і пушчы, падобныя на гатычныя храмы, пушчы, дзе горда нясуць свае кароны алені. Гэта бясконцыя жылы рэк, у якіх плешчуцца бабры і рыба на захадзе сонца, і гэта амаль адзінаццаць тысяч азёр, чыстых, як усмешка дзіцяці.

Гэта. ў мінулым гераічная і шматпакутная зямля. Безліч разоў, з пачатку дзён, грукаталі па ёй калясніцы вайны. Але мы, дзеці Беларусі, ганарымся тым, што ў гэтых войнах яна ніколі, запамятайце гэта, ніколі не была агрэсарам. Іншая справа, што яна заўсёды мужна і да канца бараніла свой ачаг, сваю праўду і веру.

Памяць маёй зямлі аб гэтым і ў старадаўніх гарадзішчах, і ў курганах, пад якімі спяць яе абаронцы, у барвовых, быццам ад крыві, мурах замкаў, на палетках, дзе працавіты плуг часам выворвае каменную сякеру, меч або гільзы часоў апошняй вайны, у жальніках, на якіх гарэў калісьці агонь перад курганамі мудрых продкаў, і ў вечных агнях перад помнікамі салдатам, якіх мы яшчэ памятаем жывымі.

І, перш за ўсё, памяць маёй зямлі — гзта людзі і іх вечная, неўміручая праца. Араць палі, біць студні, расціць сады, плесці з каменя і дрэва карункі дзівосных будынкаў, спяваць нібы на адным дыханні (так, што, здаецца, спяваюць самі нівы і лясы) песні, складаць вершы, у якіх пяшчота пацалунка і суровасць удару мяча.

Таксама якасць нашай памяці: ніколі не аддзяляць сябе ад культуры і самаахвярна ствараць яе, якія б перашкоды ні ўставалі на шляху. Стварыць непаўторны фальклор і — яшчэ больш як тысячу гадоў таму — бібліятэкі і першымі ў свеце надрукаваць кнігу ў перакладзе на родную, беларускую мову. І не перарываць ані на год той стыхіі, плыні той вялікай ракі, якая валадарыць

чалавечым сумленнем і душамі і якой імя — літаратура. Шанаваць памяць яе дзеячаў, ствараць на месцах, дзе яны нарадзіліся і дзе паэзія нарадзілася ў іхніх душах, запаведнікі — хай то будзе палац або звычайная бедная сялянская хата. І там, і там калыска можа нарадзіць Песню і Неўміручасць.

Няма такой сілы, каб годна апець рукі тыя, што ствараюць памяць у рэчах: наша чароўнае шкло і кераміку, тканіны і кафлі, рэчы з металу і скуры, непаўторныя старадаўнія жывапіс і скульптуру.

І дойлідства. Вясёлку Каложы, пабудаваныя са святла Камянецкую вежу і Спас-Ефрасінню, суровыя камяні замкаў — і адметную, тыпова беларускую готыку (Мір, Навагрудак). І барока, пышнае, як лотас, і класіцызм. І непаўторнае драўлянае дойлідства, роўнага якому цяжка знайсці. Тое, калі звычайная мужыцкая сякера можа паспрачацца з разцом Фідзія.

Ёсць і горкая памяць у маёй зямлі. Дый як іначай, калі кожны чацвёрты жыхар Беларусі загінуў у апошнюю вайну. А колькі па зямлі брацкіх магіл. Першай прыняла яна ўдары ворага і гераічна змагалася з ім, пакуль знішчальны каток вайны не перакаціўся за мяжу. Канцлагеры, дзе кожную хвіліну для кагосьці навекі згасаў свет, і шыбеніцы, і расстрэлы. І — у лясах — амаль чатырыста тысяч чалавек пад ружжом, якія да канца, часам цаною жыцця, адстойвалі ад ворага чысты водар Радзімы.

І жонка была гатовая аддаць мужа, а матка паслаць сына ў полымя. І пайсці за імі. На бой, на прарыў блакады.

Дзеля таго каб зберагчы ўсё тое, аб чым я ўжо казаў: волю, веру, спосаб мыслення, Бацькаўшчыну.

Каб спустошаная вайной краіна ажывілася працаю тых, хто выжыў і перамог, заззяла радасцю і святлом, заквітнела садамі і здзіўляла цудоўнымі будынкамі, зашумела нівамі, зазвінела адвечнай і неўміручай нашай песняй.

Яны, гэтыя мае сёстры і браты, біліся, каб зберагчы і пасля ўпрыгожыць маці нашу, зямлю.

Гэтыя азёры і нівы, сівыя пушчы і светлыя воды. Курганы продкаў, старадаўнія і новыя кнігі, песню сваю і слова, веды свае.

Усё, што за тысячагоддзі стварылі іх рукі, аж да камянёў сівых будынкаў.

Старадаўні прынцып, які прыйшоў аднекуль, але перафразаваны, навекі стаў нашым:

Людзям — душа,
Жыццё — свайму дому,
Сэрца — жанчыне,
Гонар — нікому.

Пранікніцеся любоўю да маёй роднай Беларусі, людзі. Велічная і гордая, яна таго вартая.

Калі на зямлі ёсць казачныя краіны

Прадмова да кнігі "Краявіды Беларусі"

Калі на зямлі ёсць казачныя краіны, то адна з іх — Беларусь. І таму не скуднець слядам на яе дарогах. Хто бачыў яе — вернецца. Хто не бачыў — глядзіце. Мы запрашаем вас, добрыя людзі зямлі.

Тут жыць мастакам і паэтам. Тут сіне-зялёны лес з бледнымі азёрамі, у якіх, як кажуць паданні, патанулі гарады (чуеце ўначы звон падводных званоў?). Спакойная моц Дняпра, што бяжыць між суровых урвішчаў, мяккія ўзгоркі Навагрудчыны і вечны шум першабытных лясоў Палесся (яны шумяць пад Лельчыцамі, шуміць, гамоніць тысячагадовы цар-дуб).

Дзяўчына цалуе сланечнік. Шапацяць залатыя бары. І ў духмяным змроку ўтульна сядзяць сімпатычныя брылястыя дзяды-баравікі. І ўсюды праца. Праца сціплага, упартага, моцнага народа, які ведае цану хлебу і любві, цану свабодзе, Радзіме. І ўсюды — клопат да жывога, усюды шырыня чалавечай душы. Наша прырода — гэта наша душа.

Змрочныя, як старадаўнія балады, руіны замкаў, светлыя палацы і храмы, шыпшына на сонных вясковых могілках, свечы бяроз на палянах і зялёныя языкі ядлоўцу ў жыце, верас, на які падалі продкі, баронячы сваю Бацькаўшчыну, — усё гэта таксама душа народа і зямля яго, да апошняй пясчынкі перацёртая працавітымі рукамі.

Чырвоныя захады і пахілае дрэва восені, бэз ля закінутых капліц і сіні палёт сіваваронкі, туман і залаты лубін — гэта мы. Мы з нашай зямлі і з неба, з магутнасці ляснога зубра і пошчакаў салаўя, самых пяшчотных у свеце…

Кракаюць дзікія качкі ў затоках, мякка б'е пыл між пальцаў босых ног на далёкіх дарогах. І салодкі ўвечары дым вогнішча, і гасцінна адчыненыя дзверы ва ўсіх хатах.

Ідзі, чалавек!

Песня з паўночных Афін

Той асенні дзень быў цёплы і пахмурны. Лісце ляжала пад нагамі тоўстым стракатым дываном, і нам з сябрам добра было хадзіць па ім, варушыць лістоўныя сумёты нагамі і адчуваць сябе бязбожна шчаслівымі, нягледзячы на лёгкі сум. Таму што мы былі ў Залессі, былым маёнтку славутага Міхала Кляофаса Агінскага, "паўночных Афінах", як называлі гэты кут сучаснікі.

Залессе — адна з самых паэтычных мясцін нашай радзімы, а восень надавала ўсяму, што мы бачылі вакол, лёгкую паціну чысціні, празрыстасці і журбы.

Магутныя прысады клёнаў і ліп ішлі да Віллі, туліўся ў зарасніках старажытны цёплы дом са свечкамі калон, ртутна свяціліся ставы, ручай імкнуў праз грэблю. І ва ўсім, што вакол, была музычнасць, ціхая песня: у плёску вады, у шолаху лісця, у парывах ветру, які гайдаў палын на мяжы.

Ёсць мелодыі, якія чуеш так часта, што пачынаеш грэбаваць імі. Ад частага паўтарэння можа абрыднуць (думаецца мне) нават "Легенда" Вяняўскага. Але колькі б ты ні слухаў паланезы Агінскага, а асабліва вялікі паланез ля-мінор ("Развітанне з радзімай") — ён застанецца блізкі і дарагі твайму сэрцу, будзе закранаць у ім самыя глыбінныя, самыя свае струны. І тады добра робіцца ад думкі, што вось нарадзіўся недзе ля Варшавы дзвесце год таму чалавек, жыў, ваяваў, быў дыпламатам і паўстанцам, пісаў між іншым музыку і, дзякуючы гэтай музыцы, стаў табе і ўсім іншым блізкі і родны. Яшчэ адзін прыклад магутнай повязі, што яднае ўсіх чыста на свеце добрых людзей.

Агінскія — стары апалячаны беларускі род, традыцыйныя гетманы літоўскія. Бацька паэта быў троцкі ваявода, а пасля літоўскі мечнік. І, аднак, наш творца, пан, арыстакрат, магнат, нобіль, адмовіўся ад свайго княскага герба, называў сябе "грамадзянінам" і хацеў вызваліць дванаццаць тысяч сваіх сялян, каб узняць іх на паўстанне. І за гэтае чалавекалюбства, дэмакратызм, гуманнасць — ён яшчэ бліжэйшы нам. Продкі ягоныя выдавалі беларускія кнігі, для польскай ягонай душы блізкія былі нашы беларускія напевы. І гэта беларускія ліпы Залесся, іхні вечны напеў навеялі кампазітару мелодыю паланеза ля-мінор і ўвогуле большай часткі ягоных паланезаў.

Ды і хіба толькі гэтыя, залескія, ліпы і дубы "англійскага" парку?! Хіба тыя трынаццаць год, што ён правёў тут?! А што казаць аб Слоніме, дзе ён жыў, аб яго наваколлі, якое, раз пабачыўшы тут, ніколі не забудзеш? А кручы Дняпра? А сінія

віцебскія азёры? А Браслаў? Паўсюль хадзілі ягоныя ногі, паўсюль насіў яго баявы конь, паўсюль чуў ён беларускую песню, празрыстасці і меладыйнасці якой можа пазайздросціць любая песня зямлі.

І таму, калі стаіш ля гэтага залескага дома, сэрцу ўвесь час здаецца (А можа, і не здаецца? Хіба памяць сэрца не самая найвялікшая рэальнасць?), што з палёў ляціць неўміручае беларускае "Жніво", а з палаца адказваюць яму клавішы клавесіна. Гукі клавесіна такія слабыя, такія нямоцныя ў параўнанні з гукамі раяля, такія "несучасныя", але тут яны здаюцца моцнымі, бо вытаргаюць іх пяшчотныя і адначасова сталёвыя рукі паэта і воіна. Гучаць гэтай пераклічцы між песняй і клавесінам тысячы вякоў, аж да сканчэння зямных дзён, якога, трэба думаць, і не будзе.

Не хацелася б тут гаварыць пра агульнавядомыя факты, пра біяграфію, але старонкі гэтага жыцця так адпавядаюць самой музыцы Агінскага, што не зрабіць гэта немагчыма. Улюбёнец шчасця — і выгнаннік. Сын сям'і з велічэзнымі культурнымі традыцыямі, пляменнік паэта і аўтара першай у Польшчы оперы — і дэмакрат. Уладар дзесяткаў маёнткаў — і паўстанец. Арыстакрат — і аўтар памфлета "Папугай", які ядуча і злосна вінаваціць магнатаў за іхнюю абыякавасць да народа і радзімы, за тыя звады іхнія, якія неймінуча вядуць краіну да развалу і пагібелі. Яго паланез фа-мінор ("Падзел Польшчы") — гэта лямант адчаю і гневу, дакумент (так, дакумент!) абвінавачвання. Таму дакумент, што ён сведчыць аб тым цямноцці, у якое гэта "трайное свінства" кінула душы лепшых людзей нацыі. Аб цямноцці, у якім гарэлі, аднак, прамяні надзеі, адзінага, што ніколі не здраджвала чалавеку, іначай у некаторыя цёмныя эпохі ён проста не мог бы жыць.

Міхал Кляофас быў вялікім скарбнікам літоўскім, дыпламатам, але гэта адышло ў мінулае, нікому цяпер не важліва. А вось тое, што за мяжою яго слухалі Гайдн і Моцарт, тое, што інсургенты Касцюшкі ішлі ў бой і над галовамі іхнімі луналі не толькі сцягі, але і маршы Агінскага, — гэта застанецца. І застанецца тое, што, калі загрымела паўстанне Касцюшкі, дваццацідзевяцігадовы чалавек на свае грошы сфарміраваў атрад амаль з пяцісот чалавек і ўзначаліў яго. Яны добра біліся і, галоўнае, мужна. З пяцісот засталося сорак. Яны ўзялі Валожын, ішлі на Івянец, раздавалі сялянам трафеі. А пасля іх малады начальнік узначаліў усе паўстанцкія войскі, і галава яго была ацэнена на вагу золата (як быццам можа быць нейкае золата, вартае такой галавы, галавы, якая стварала такую музыку).

А пасля паражэння прыйшла эміграцыя. І Агінскі вёў

перагаворы з Банапартам. Адвечная трагедыя людзей, якія пакутна любяць затаптаную сваю радзіму і ў якіх выбілі з рук зброю, не далі магчымасці даць адпор гвалтаўніку айчыны. Агінскі, аднак, і тут на галаву вышэй сучаснікаў. Ён вядзе перагаворы з рэвалюцыйным генералам Банапартам, а калі прыйдзе час імператара Напалеона — ён кіне маёнтак і паедзе з адступаючымі.

Нельга быці з моцным, калі ў журбе і крыўдзе твой народ. І калі Напалеон плаціў высакароднай крывёй легіянераў пры Сарагосе, Нёмане, у рускіх снягах, Агінскага з імі не было. Ён спачуваў ім, разумеў іх, але ён ведаў таксама, што гэта памылка, якая не перастае быць памылкай, нават калі яна — трагедыя.

Аляксандр I на пачатку царавання дзейнічаў у духу свайго выхавацеля, русаіста Лагарпа і не заўсёды адмаўляўся ад магчымасці пакакетнічаць з ідэяй лібералізму. Ён даў выгнаннікам амністыю, не схільны быў, як-то завялі пазней, тлумачыць усё на свеце, у тым ліку нават пугачоўшчыну, "польскай інтрыгай" і прызначыў Агінскага сенатарам. У гэтыя гады Міхал Кляофас і атрымаў у падарунак ад Францішака Агінскага Залессе. І вось тады ў Залессі і быў створаны паланез ля-мінор. Гэта была "сустрэча з радзімай", але традыцыя назвала паланез "развітаннем". І, бадай што, гэта было правільна і больш адпавядала тону і настрою музыкі, вялікай яе журбе. Бо і ў радасці сустрэчы быў сум за лёс сваёй зямлі.

У тыя гады Залессе і стала "паўночнымі Афінамі", месцам, дзе панаваў культ музыкі, літаратуры і жывапісу. Большая частка музычнай спадчыны кампазітара была напісана тут.

І, аднак, — да чалавека не прыходзіла радасць. Нічога не збылося з таго, аб чым марыў. Нічога, акрамя музыкі. Напалеон не нёс вызвалення. Ён нёс пакуты і кроў. Нельга было ісці за ім. Але нельга было ісці і за царом. Нельга было жыць на радзіме, лёсам якой заставалася рабства.

У геніяў ёсць дзівосная якасць. У некаторых сваіх творах яны "прадказваюць" свой лёс, як быццам гледзячы праз завесу часоў. Містыкай тут і не пахне. Проста яны ведаюць свой час і сябе. Ленскі — прароцтва Пушкіна аб сваім канцы. Адна з аповесцей Чэхава амаль дакладна малюе яго апошнія гады.

Не мінула гэтая горкая чаша, гэты страшны дар прароцтва, і Агінскага. Паланез ля-мінор сапраўды стаў развітаннем. Пасля эпапеі 1812 года аўтар ягоны едзе за мяжу, і на гэты раз назаўсёды. Калі нічым не можаш дапамагчы — лепей не быць сведкам народных пакут.

Фларэнцыя, "пяшчотны касач", стала ягоным апошнім прытулкам, сады Кашын замянілі яму залескія сады, плыткая

Арно — глыбокую пясчаную Віллю. Тут ён і памёр. Чалавек, на жаль, памірае… Нават калі ён стварaў неўміручую музыку…

Мы сядзелі ля каменя, пакладзенага ў гонар Касцюшкі сярод залескага парку. Восень звінела лістотай. І ва ўсім была ледзь чутная музыка…

Магчыма, калі ён ад'язджаў з радзімы, горкае праroцтва ягонага паланеза гучала ў ягоных вушах, як гучыць яно зараз у нашых. Магчыма, ён ведаў, што ніколі больш не ўбачыць залескіх дубоў і радзімы. Але ведаў ён і другое.

Калі я слухаю паланез ля-мінор і калі ягоная журботная музыка ў плыні сваёй даходзіць да таго месца, дзе вызвалена і грозна пачынаюць гучаць урачыстыя фанфары — я разумею, што ён гэта ведаў.

Мір тым, хто загіне за народ і волю, слава тым, хто пераможа. Залескія дубы дадуць ім галіны для вянкоў, і самыя прыгожыя залескія дзяўчаты ўскладуць іх на галовы герояў.

Музыка абяцае гэта.

Подзвіг Францыска Скарыны

Подзвіг Францыска Скарыны дагэтуль не ацэнены. Не ацэнены таму, што мы почасту глядзім на яго эпоху вачамі сённяшняга дня, забываючыся часам зірнуць на яе вачамі сучасніка Скарыны. Зірнуць на яе знутры, нібы сам жывеш у тыя часы, і многае, што для нас цяпер рэч натуральная, усмактанае ледзь не з малаком маці, само сабой зразумелае — для цябе яшчэ цёмны лес.

Ты сучаснік Скарыны. Прычым адукаваны сучаснік. Якім паўстае перад табою свет?

Космас. Сусвет. Ён канечны і абмежаваны непарушнай зорнай сферай з усіх бакоў. За ёю ці рай, жыллё і месца знаходжання бога, ці ўвогуле хаос. А пасярэдзіне сферы — Зямля. Вакол яе Сонца і планеты. Планет сем, толькі тыя, што можна бачыць няўзброеным вокам, бо і тэлескопа яшчэ няма. Калі ў цябе зрок лепшы, чым у астатніх, і ты, скажам, бачыш, што Мілавіца мае квадры, як Месяц, — памоўчвай, бо на зямлі смярдзіць паленым, і вогнішча на плошчы ледзь не самае інтэлектуальнае відовішча ўладарных, і ўвогуле народных мас.

Толькі адзінкі, дый то абстрактна, спекуляцыйна ведаюць, што Зямля — шар (паводле Пталамея, бо кніга Каперніка з'явілася амаль праз тры дзесяцігоддзі пасля першай кнігі Скарынавай "Бібліі"). І яшчэ добрых пару стагоддзяў эйнштэйны і каралёвы тых часоў будуць прасіць прабачэння у тых, што маюць уладу, за тое, што яны адэпты вучэння Каперніка. Будуць гаварыць прыблізна ў тым родзе, што вучэнне Каперніка не новае, што яно старое, яшчэ да Пталамея, што так думалі яшчэ некаторыя піфагарэйцы (і гэта ў сім-тым праўда):

— Не біце мяне за гэта. Я не наватар. Гэта вы… ой, прабачце! Я, наадварот, закарузлы кансерватар.

Гэта для адзінак. Для большасці Зямля — плоскасць, якую абмывае сусветны акіян. У акіяне жывуць кітарыбы і марскія манахі. Па сушы швэндаюцца, акрамя людзей і звяроў, кіраўрысы (кентаўры). Ёсць на гэтай плоскасці Еўропа, Азія, маленечкая Афрыка. За Атлантыкай ляжыць Індыя, і толькі адзінкі здагадваюцца, што гэта — Новы свет. Іншых земляў няма, бо іх ніхто не бачыў. І няма нікога, хто спытаўся б такога рацыяналіста (божа, колькі іх і зараз!):

— Дзядзька, а вы Вільню бачылі?

— Не.

— А яна ж ёсць…

Чалавек. Ён — вобраз і падабенства боскае (і нікому не страшна за бога, калі ён выпадкова, не на ноч кажучы, успомніць зямных уладароў). І не кожны носіць гэты "вобраз божы". Пераважна еўрапейцы і хрысціяне (адпаведна — магаметане, будысты, юдаісты). Астатнія, не кажучы ўжо пра людзей з сабачымі галовамі і іншым такім, астатнія — расы бездухоўныя, бо не адзначаныя святлом ісціны боскай.

Але і "адзначаныя" не маюць права на роўнасць. Вышэй за ўсіх асвечаны манарх і асвечаная знаць. Праўда, мае ўжо назву галоўнае ў чалавеку — гуманізм, падмурак, на якім вырасце Чалавек Новы. Першыя праблiскі ўтапічнага сацыялізму, вера ў прагрэс звязана з дзейнасцю асвечанага манарха і асвечаных вярхоў. А паколькі іхняя ўлада ад бога, то выступленне супраць яе — злачынства, якое прыводзіць толькі да дзікага самавольства і анархіі. Над ліхім манархам адзіны суддзя — бог. Добры — можа прывесці да росквіту навук, адмены прыватнай уласнасці і раўнапраўя (нешта не бачым мы прыкладаў гэтаму ў гісторыі).

Так думаюць нават самыя перадавыя. Да Шэкспіра, які — хай аднабакова — сказаў аб грамадскай ролі народа, чалавецтву яшчэ араць амаль восемдзесят гадоў.

Навука. Ну хаця б на прыкладзе хіміі (якой яшчэ няма, а ёсць алхімія). Усё досыць проста і зразумела (як паўсюль, дзе амаль нічога не зразумела). Паўсюль строгі парадак (як усюды, дзе няма парадку), усталяваны богам. Існуе сем металаў (па колькасці сямі планет, а значыць, болей і не трэба). Бацька ўсіх гэтых металаў — сера, маці — ртуць.

…Але досыць, іначай мы ніколі не скончым. Іхняя эпоха зусім не прычына, каб смяяцца. Хутчэй, прычына для спачування. Як кожная эпоха ў вачах нашчадкаў.

Проста вось такі ён быў, тагачасны чалавек. Сам Скарына таксама не быў выключэннем. Ён, напрыклад, упэўнены, што "Біблія" — пачатак і канец зямной мудрасці (а можа, толькі намагаецца пераканаць іншых, што упэўнены ў гэтым). Але, называючы яго сярэдневяковым чалавекам, мы выпускаем з-пад увагі тую рысу, якая робіць яго чалавекам Адраджэння, чалавекам новага часу, нашым братам: прагу да святла, нязгаснае імкненне да доблесці і ведаў. І галоўнае: няўменне і нежаданне аддзяліць сябе ад "брацii сваёй", грамадства, у якім кожны Чалавек павінен быць такой самай Асобай, як ён, іначай не варта і гарод гарадзіць. І таму, — і гэта галоўнае, — ён імкнецца не толькі сам ісці да зор, але як Чалавек Новага, і "брацію сваю" цягнуць да іх.

"Ты любіш яе. І паколькі Новы Чалавек — гэта Чалавек Дзеяння, ператвараеш слова сваё ва ўчынак".

Першы крок твой і твайго грамадства да святла — Кніга (хай

сабе нават і "Біблія"), пісьменнасць (хай сабе заснаваная на ёй), асвета (хай сабе рэлігійная, паколькі вышэй сваёй эпохі не дужа скокнеш, як і вышэй сваёй галавы).

Кніга. Пісьменнасць. Асвета. Астатняе прыйдзе з часам.

І каб гэтая кніга была параўнаўча танная, была для ўсіх. Значыць — друкарскі станок, а праз яго Кніга для ўсіх, Пісьменнасць для ўсіх, Асвета для ўсіх. Бо не можа называцца асвечаным грамадства, дзе асвечаныя адзінкі закрываюць сваімі спінамі святло ад іншых.

Асвечанасць — гэта калі кожнаму ў руку — паходню!

І Францыск Скарына робіць гэта, надрукаваўшы у 1517–1519 гадах дваццаць тры кнігі "Бібліі", у 1522 годзе — "Малую падарожную кніжыцу", у 1525 годзе — "Апостала".

І не на чужой мове, а на простай сваёй, беларускай, якую аднолькава разумеюць мужык і магнат, воін і гандляр. Усе.

І да кожнай кнігі — прадмовы і пасляслоўі, першыя ўзоры грамадскай, асветніцкай, эстэтычнай думкі. Таксама для ўсіх. Пачаткі любамудрыя (філасофіі) для ўсіх, адукацыі для ўсіх, вальнадумства для ўсіх. Пачатак мудрасці новых часоў, спасціжэння таямніц сусвету, магчымасці праверыць усё рукамі, розумам, душой.

Не прасіць сабе "дзён многих… ні багацця, ні жэ душ ворагаў", але жадаць "сабе мудрасці". Быць адукаваным і вольным сабратам адукаванага і вольнага грамадства, якое не здушыць аніякая фізічная і духоўная тыранія.

Быць праўдзівым, добрым, чыстым, чалавекалюбівым. І вакол сябе — на шляху да Розуму — бачыць такіх самых братоў, а не кодла свядома-цёмнага і вераломнага быдла.

Праз дух разумнасці — да духу любові. Праз мудрасць і добрыя звычаі — да грамадства, дзе ўсім добра, і, галоўнае, **справядліва** жыць.

Тое, на чым і зараз стаяць лепшыя людзі і чалавецтва і з чаго іх аніяк і анікому не збіць.

Нават знішчыўшы фізічна.

Францыск Скарына быў з тых, першых, хто, кажучы сучаснымі словамі, стварыў стартавую пляцоўку для рыўка Чалавецтва ў ягоную неабсяжную будучыню. Гэты беларус быў з тых, самых першых, што стварылі лепшых з нас такімі, якія мы ёсць.

Ва ўзбраенні ведаў, усемагутнасці мозгу, адкрытай шчырасці добрага сэрца. З навукай у адной руцэ і мастацтвам — у другой.

З катаржнай працы такіх, як ён (а для ўсходніх славян — з яго), пачынаецца ўзлёт гуманізму, ідэі раўнапраўя (хай сабе спачатку ўтапічнай), рэнесанс мастацтва, літаратуры, навукі.

…Хай сабе мы яшчэ дужа і дужа мала ведаем.

Можа праз пяцьсот гадоў нехта і пасмяецца з нашых ведаў, з узроўню нашай думкі.

Дзякуй богу, што пасмяецца.

Без веры ў тое, што далёкія нашчадкі нашы будуць як багі — навошта жыць?

Але ніхто не пасмяецца з нашай працы, з узроўню нашага мастацтва. Вось у чым яго неўміручая сіла! І ніхто не пасмяецца з нашых намаганняў у нашай цяжкай, крывавай, часта трагічнай сечы за будучыню чалавека. З нашай бітвы, у якую аднымі з першых уступілі яны… мы… дзеці нашы. Бітвы, дзе адным з пачынальнікаў быў Францыск Скарына.

З яго веку, і з нашага веку.

Ніхто не пасмяецца з таго, што яны і мы — у меру сілаў сваіх — рассунулі Сусвет, спазналі частку ісціны. Ніхто не пасмяецца са Скарыны і яго нашчадкаў, з іхняй думкі, што дала Польшчы — Міцкевіча, Русі — Сімяона Полацкага і Дастаеўскага, сабе — Багдановіча, Купалу, Коласа і іншых, "імёны ж іх ты, госпадзі, вясі".

І на пачатку гэтага бясконцага шляху — такая малая і такая бязмежна вялікая "Кніга" Францыска Скарыны, чутны і нам праз стагоддзі гук ягонага друкарскага станка… Ціха!.. Ён грукоча!..

І таму Францыск Скарына ў поглядзе тых, самых-самых першых, што зрабілі лепшых дзяцей чалавецтва такімі, якія яны ёсць сёння і якімі яны будуць давеку, пакуль ёсць пад небам Сусвету Чалавек.

І таму мы павінны ганарыцца тым, што ён — беларус. Хаця мудрасць не ведае розніцы нацый, моў, веры.

Таму што, нягледзячы на намаганні навалачы розных нацый, мудрасць ведае адну веру — веру ў вялікае прадвызначэнне Чалавека, якога Прырода стварыла для поўнага і канчатковага спазнання самой сябе.

У гэтым, мабыць, адзіны сэнс чалавечага жыцця.

І Францыск Скарына зрабіў адзін з першых крокаў на нашым шляху да гэтага.

Сцюдзёная вясна, або 1000 год і 7 дзён

"Ныня солнце красуяся к высоти вьсходить и радуяся землю огр ваеть…Ныня… зима пр стала есть и лед… растаяся… Днесь весна красуеться, оживляющи земное естьство; бурніи в три, тихо пов вающе, плоды гобьзують и земля с мена питаюше зелёную траву ражаеть… Ныня новорожаемін агньци и унци быстро путь перуще, и скачють, скоро к матеремь вьзвращающеся веселяться. Ныне древа л торасли испущають і цв ти благоуханія процвітають, і се уже огради сладькую подавають воню… Ныня реки… наводняються… Ныня… трудолюбівая бчела… на цв ты излетающи, медвеныя сты ствараеть… Ныня вся доброгласныя птица… гн здящеся веселяться… и свою каяжьдо поющи п снь, славіть Бога гласы немолчьными".

Кірыла Тураўскі. "Слова на новую нядзелю па Вялікадні". XII ст.

"Ныня сонца, красуючыся, да вышыні ўзыходзіць і, радуючыся, зямлю сагравае… Сягоння… зіма перастала быці і лёд… растаў… У гэты дзень вясна красуецца, ажыўляючы жывую зямную існасць; буяныя вятры (сёння), ціха павяваючы, плады цалуюць, і зямля, жывячы насенне, зялёную траву нараджае… У гэты час нованароджаныя агнцы і агнянкі (баранчыкі і авечкі), хутка ў пуцінку беручыся, скачуць, і скора, да матак вяртаючыся, весяляцца… Цяпер дрэвы парасткі выпускаюць і кветкі духмянасці працвітаюць, і вось ужо сады салодкі падаваюць водар… У гэтую пару рэкі… навадняюцца… У гэты час… працавітая пчала… на кветкі злятаючы, мядзвяныя соты стварае… Ныня ўся добрагалосная птушка… гняздуючыся весяліцца… і сваю кожная спяваючы песню, славіць Бога галасамі несціханымі (нямоўчнымі)".

Гэта голас з васьмі стагоддзяў. Недзе ў далёкім, цьмяным дванаццатым стагоддзі прагучаў ён для нас. З вуснаў сына багатых тураўскіх мяшчан, сына горада, які ні па велічы, ні па дзяржаўнасці, ні па асвечанасці не саступаў Полацку, Ноўгараду Вялікаму, Кіеву… Багаты гандаль (знойдзена мноства манет), драўляныя і каменныя храмы (знойдзены рэшткі фундаментаў), асвечаны двор грэчаскай царэўны (яна была замужам за тураўскім князем)… Першабытная прырода, воды і лясы, роздум пад неабсяжным небам. Юнак, які ідзе ў манахі, жыццялюб (успомніце ягоныя радкі), які ідзе ў аскеты аж да таго, што замуроўваецца ў

вежы. Паэт, які абіраецца ў біскупы і ўсю сілу свайго красамоўства аддае "казанням" (павучэнням) і "словам".

І стаў гэты паэт "Златавустам, які больш за ўсіх заззяў нам", і пачаў ён вялікае наша Пісьменства, і ўславіў родны свой горад, які да дня яго нараджэння быў ужо сто пяцьдзесят год, як упершыню адзначаны ў летапісе (980 г.), а значыць, існаваў ужо і задоўга да таго.

…Мы адзначым ягонае тысячагоддзе толькі ў гэтым годзе. Будзем сціплыя. Не будзем весці гарадской радаслоўнай з першай чалавечай стаянкі на гэтым месцы. Не будзем казаць, што горад Гейдэльберг вядзецца аж з шэльскага часу (800–300 тыс. гадоў назад) толькі таму, што ля яго была знойдзена сківіца гейдэльбергскага чалавека. Хопіць з Гейдэльберга і аднаго са старэйшых у Еўропе універсітэтаў і славы Г. Гегеля і Р. Бунзена, і славы аднаго з ачагоў гуманізму.

Як Тураву хопіць пакуль што тысячы год і славы Кірылы Тураўскага.

…Горад стаяў тысячу год, Кірыла жыў у ім нешта каля пяцідзесяці двух год, мы правялі у ім на гэты раз толькі сем дзён вясны. Мабыць, адной са сцюдзёных, стылых і непрытульных вёснаў, якія даводзілася перажываць гораду.

Сонца зусім не радавалася, скупа аграваючы зямлю, "кветкі духмянасці" пад Мінскам яшчэ і не пачыналі цвісці, і "працавітая пчала" не стварала "медвеныя сты". Пчолаў яшчэ зусім не было, і нявесела славілі неба напаўгалодныя птушкі.

З цяжкасцю, з боем прабівала сабе дарогу вясна, і ўспаміналася, што год высакосны, што ён — "год актыўнага сонца" (якога д'ябла, калі такога пасіўнага яшчэ й бачыць не даводзілася!). І калі мы хадзілі пад Радашковічамі, то суцэльны белы дыван пралесак, якія пакутна мерзлі, здаваўся шэранем.

І калі мы, нагружаныя, як ішакі і вярблюды, сядалі ў аўтобус на Жыткавічы, каб ехаць насустрач тысячнай тураўскай вясне (добры повад для падарожжа і далейшай размовы!), то вясна тая ў Мінску амаль не адчувалася, дый па меры руху на поўдзень праяўлялася так павольна, з такой рахманай ніцасцю, што рабілася крыўдна за яе.

Чырвоны аўтобус (і адразу лезе ў галаву даўні польскі шлягер пра "аў-то-бус чэр-рво-ны"), мажная кантралёрша, якая ўшчувае нас за тое, што курым, кажа нешта пра некурашчага зяця ("добры быў бы зяць, курыць"), і невядома, ці яна скардзіцца на зяця, які ўжо ёсць, ці падахвочвае нас на тое, каб мы кінулі курыць ды набіваліся да яе ў зяці (на жаль, пазнавата). За гонар курцоў уступаецца вадзіцель (нешта накшталт таго, што не той зяць добры, які не курыць, а той, што цешчу з хаты не выкурвае — і

нам так здаецца, — ат сабе, звычайны дарожны беларускі перабрэх!). Вадзіцель малады, але ўжо дужа самавіты, а абліччам і "корпусам" — выліты акцёр Рома Філіпаў, такі самы сімпатычны, такі самы здаравенны (як два бегемоты) і з такім самым адстаўленым ніжнім грыбам.

…Дарога. Зімнія яшчэ елкі і хвоі, нясмелы зялёны пух на бярозах.

Аўтобус няўхільна набліжаецца да мэты, і чым бліжэй да яе, тым часцей сядаюць і злазяць, тым галаснейшыя галасы, тым больш рызыкоўныя і з веданнем справы жарты (бо ведаюць адзін аднаго і вадзіцеля). І ў мяккі аўтобус (хацеў бы я пабачыць такое недзе ў Падмаскоўі ці ў наваколлях Парыжа! — І як шкада, што не пабачыш!) на правах поўных гаспадароў увальваюцца крыклівыя цёткі з мяхамі крапівы (з іх тырчаць сярпы) і з крыху ўжо грыбаватым, але вясёлым дзядком. Вязуць "з-пад ракі Арэсы" крапіву і дзядка ў Абоз. У міжгародным аўтобусе. І шкада, што не ў міжнародным, прынамсі, пасажыры вывучалі б сапраўднае зубастае жыццё, а не дурныя часопісы, не творы Флемінга і… ладна, змоўкнем.

— Дык што, цёткі, у вас у Абозе сваёй крапівы няма?

— Няма.

— Не такая.

— Суседзям дапаможам, а сваю прытрымаць трэба.

Вылазячы ў Абозе, ледзь не забылі серп. Вываліўся. Словам, сумесь самага дрымуча-традыцыйнага ледзь не з навуковай фантастыкай. Як у той тыпова нашай і цалкам праўдзівай (ручаюся!) гісторыі, якую я зараз вам раскажу.

Едуць у такім вось аўтобусе ў горад бабка з малым дзіцем. Дзіця захутанае неймаверна, як капусны качан. Такі сабе бясформенны стажок — невядома, дзе рукі, дзе што. Пасажыры ад няма чаго рабіць лезуць, прыстаюць, "як клічуць?" ды "колькі табе год?". У адказ з-пад хустак толькі невыразнае "бу-бу-бу".

Здзіўленне мацнее. "Ды што такое ўрэшце з дзіцем?" "Куды гэта вы яго?" "Чаму яно нейкае… гэтакае?"

Урэшце бабка тлумачыць. Выяўляецца, гулялі ў касманаўтаў. А касманаўт без шлема — рэч немагчымая. Таму малому надзелі на галаву чыгун. А калі спахапіліся, то выявілася, што зняць яго хатнімі сродкамі немагчыма. І вось бабуля вязе гэтага, магчыма, будучага Клімука, па дапамогу. А захуталі, бо дзіця, у якога замест галавы чыгун, выглядала б па меншай меры дзіўна.

Не ведаю, але, па-мойму, мы яшчэ шчаслівыя, што жывём у складаны, шматфарбны, супярэчлівы час, што лётаюць над гэтай нашай зямлёй спрадвечныя лебедзі і наваз'яўленыя касманаўты. Шкада толькі, што — калі не возьмемся за розум — першых будзе

ўсё менш, а другіх усё больш. А трэба, каб было болей і другіх і першых.

І гэта адна з тэм, пра якія, — як мне здаецца, — трэба яшчэ многа гаварыць і гаварыць. Мала таго, працаваць над гэтым і працаваць, змагацца за гэта і змагацца.

Зберагаць годнае і вялікае старое. Ствараць годнае і вялікае новае. Толькі годнае. Толькі вялікае. Бо ахвотнікі псаваць выпрабаванне часам знойдуцца і без нас. А нашы рукі павінны быць чыстымі і ад таго і ад другога.

…Прыпяць. Задоўга-задоўга да яе пачынаецца пойма, старыкі, мокрыя паплавы з золатам лотаці, вербы. Пасля і сама яна, імклівая сястра наша, адкрываецца вачам, з прыбярэжнымі пяскамі, з паромам, які перавозіць нас цераз імпэтныя воды. Паромам, на якім нам яшчэ давядзецца правесці шмат гадзін, бо гэта адна з артэрый Палесся, месца, на якім засяроджваецца частка ягонага жыцця, плынь гэтага жыцця, бег ягоны.

…І ўрэшце Тураў. Узнесеная над вадою пратокі трапецыя гарадзішча (пасля — замчышча), прыстань, не дужа шматлікія мураванкі і россып хат у нясмелай квецені садоў запозненай, сцюдзёнай вясны.

Гэтая дарога з цяжкімі рэчамі. Двухпавярховая школа. За ёй розныя там турнікі і снарады дзеля караскання (па-мойму, асобныя дзеці часцей ламаюць галовы там, чым над кнігамі), а перад ёю клумба, якая ўдае лічбу "1000". Позняя вясна, нічога яшчэ не ўзрасло на клумбе…

А праз вуліцу ад школы драўляны дом на дзве паловы, у адной з якіх жыве "запаветная" сям'я: арнітолаг Прыпяцкага запаведніка Вадзім Пятровіч Клакоцкі, ды жонка ягоная, батанік Тамара Мікалаеўна, ды іхняя дачка Аленка (старэйшыя сыны не ў Тураве, і я не маю гонару вам іх адрэкамендаваць), якая вучыцца, а значыць, пакуль не мае адносін да запаведніка, хіба што ў вольны час больш-менш паспяхова б'е ў ім лынды.

У гэтым доме мы й мелі гонар пасяліцца, кіравацца адсюль па тураўскіх шляхах, літрамі паглынаць нанач каву і балбатаць языкамі да пасінення.

У многіх і многіх такіх дамах мне за жыццё даводзілася быць. Ад Уладзівастока да Брэста. І дай мне лёс пабываць яшчэ ў многіх і многіх, бо я люблю гэтыя хаты і гэты народ.

І ва ўсіх (амаль) такіх хатах (ва ўсякім разе ў тых, у якіх мне было дабрэй за ўсё) я бачыў, нягледзячы на сталасць побыту, на ўпарадкаванасць жыцця, — бачыў я ўсё ж налёт нейкай цыганшчыны: гнёзды на падваконні, стрэльбу ў куце, кнігі ў самай фантастычнай малакучы, рогі, гаспадары якіх пазбавіліся ад іх за непатрэбнасцю або даўно ўжо адхадзілі па лесе сваё.

А ў двары яблыні, якія — урэшце — расцвілі нават тут, недабудаваная пуня і яшчэ пуня, старая, у якой трусы і куры, ды квактуха з пісклянятамі пад сеткай, ды ў асобнай агароджы дзве будкі, у якіх жывуць ганчак Рыжы (мы нядоўга мелі гонар вадзіць з ім знаёмства, бо ён, адаспаўшыся пасля гайні, уцёк з новай гайнёю, шчадралюбае сэрца), ды пёс няпэўнай пароды па мянушцы Цёпа (гэты не ўцёк толькі дзякуючы прыроджанай ляноце ды таму, што караткаватыя ногі пры доўгім кадлубе не дазволілі пераскочыць плот).

А на дваровым ганку трохкаляровая Чыта з двума кацянятамі, пакуль без назвіска, пярэстым і рыжым, ды кот Кузя, такі ненатуральна доўгі і чорны, што яму прыпаялі за гэта мянушку "Шланг".

А ў двары матацыкл, такі пабіты і пашарпаны па лясных дарожках, што жах глядзець, але, як сказаў бы Эрых-Марыя Рэмарк, "з высакародным сэрцам гоначнай машыны". І мянушка яму, як машыне ў "Трох таварышах", Карл.

Вось, здаецца, і ўсе асобы, вартыя ўпамінавення. Далей аб кожным па ходзе справы.

…І вось вечар. І сядае, пакідаючы на вадзе залатую сцежку, сонца. Можна ісці насустрач яму з гарадзішча па вадзе Струмені, Прыпяцкай пратокі (а мноства стагоддзяў назад, відаць, не пратока, а сама Прыпяць плыла пад валамі гарадзішча), пасля паплавамі, пасля плынямі нядальняй Прыпяці і зноў паплавамі і дзюнамі. Гэтыя дрымотныя валы, тысячакротна ўтаптаныя і ўбітыя нагамі ворага, гэтая ледзь не самая плодная на Беларусі, дзірвановая, перагнойна-карбанатная глеба, тысячы разоў узараная ралам аратая.

Тураўская зямля. Не будзем спрачацца аб правамернасці гэтай назвы ў далёкім мінулым і сёння. Быў Тураў магутнай сталіцай, быў гарадком Мазырскага павета, быў раёнам, стаў пасёлкам Жыткавіцкага раёна. Але не трэба вучоным ламаць дзіды. Хай спытаюць у насельнікаў. Была гэта і ёсць, нягледзячы на ўсе зменлівасці лёсу, тураўская зямля. Так, Палессе, але, на думку жыхароў, "палешукі" — гэта недзе там, а тут былі і ёсць "туроўцы". І характар "туроўца" прадпрымальны, самасцвярджальны, занадта ўпэўнены ў сабе, часам не вельмі прыемны для суседа, як то часта бывае ў чалавека сталіцы, нават краіны, мясцовасці, былая слава якіх ("часова", па цвёрдай іхняй думцы) у заняпадзе. Славяне, беларусы, палешукі — яны ўсё ж самі па сабе. Раней, як дрыгавічы, у адасобленасці ад крывічоў і палян, пазней, як жыхары палітычнага цэнтра княства і аднаго з двух яго эканамічных цэнтраў. Многія і многія з іх не здолелі б растлумачыць гэта гістарычна. Проста яны "туроўцы" — і ўсё.

Гэтыя закляклыя валы — гэта дынастычныя і міжусобныя войны і войны народаў. Гэтыя валы — нібы насыпаны на костках, славянскіх і неславянскіх. За выключэннем нейкіх шасцідзесяці год жыцця ў яднанні з Кіевам, Тураўская зямля ў даўнія тыя часы была палітычна і тэрытарыяльна самастойнай аж да часоў Гедыміна. У лепшыя яе гадзіны хадзілі пад началам Турава Клецк і Слуцк, Мазыр і Пінск, Чартарыйск і Рагачоў.

Нашэсце Батыя прайшло поўднем, мабыць, не зачапіўшы Турава. Хаця, магчыма, тураўскія гарады трапілі ў спіс "тых; іншых", якія спалілі манголы. Калі гэта так, то паданне аб Туркалодзежы, які татары закідалі немаўлятамі і з якога пасля сем год замест вады біла жаночае малако, атрымоўвае хоць нейкае рэальнае абгрунтаванне, хоць нейкую цвёрдую глебу пад ногі.

У іншым выпадку яно так і застаецца застрашлівай і пагрознай легендай, апакаліпсісам беларускай памяці, што хавае ў сабе шмат падобных рэчаў.

А магчыма, легенды кажуць аб іншых татарскіх набегах, нашэсцях крымчакоў у 1502 і 1521 гадах. Бо хто толькі ні спустошваў гэтую зямлю: Літва, крымчакі, Аўчына-Целяпнёў-Абаленскі, гетман Януш Радзівіл.

Рвы, валы, палац, дамы знаці, шматлікія цэрквы — нічога з гэтага не засталося. Па беднасці летапісаў і хронік асаблівую важнасць, асаблівае значэнне набывае археалогія. Гісторыя Турава, і Тураўскай зямлі, і суседніх земляў спіць пад зямлёй. Дый там ёй почасту спакою не даюць.

Нівеліруюць, праводзяць земляныя работы, засыпаюць скінутай з пляцоўкі акольнага горада зямлёй равы (1903–1906), пракладаюць праз гарадзішча дарогу на вёску Запясочча, будуюць на дзяцінцы земскую бальніцу з гаспадарчымі пабудовамі (пачатак XX стагоддзя). Пасля вайны буртуюць бульбу на тэрыторыі дзяцінца.

І археолагі, якія часам праводзяць на гарадзішчы раскопы, знаходзячы то муры, то пілястры нейкага будынка, то шыферны княскі (ці біскупскі) саркафаг, ці рэшткі шасцістоўпнага трохапсіднага храма, не могуць паспець за так званай гаспадарчай дзейнасцю чалавека (мала для яе месца па суседству!) або проста за адміністрацыйным свербам неразумных людзей, якія пагарджаюць нашымі законамі, бо нікога яшчэ не каралі за непавагу да роднай гісторыі.

І археалогія, толькі раскрыўшы рот, вымушана часам навекі замаўчаць "дбаннем" гэтых людзей. А за яе, у большасці выпадкаў, не скажа ніхто.

А ёсць жа, мабыць, артыкул закона, які прадугледжвае нейкае

пакаранне таму, хто прыбраў адзінага сведку нейкай важлівай справы? І тэрмін, пэўна, нейкі даюць? Пішучы гэта, пазваніў, нягледзячы на тое, што ўжо амаль поўнач, добраму прыяцелю, палкоўніку міліцыі. Той, на жаль, у камандзіроўцы. Але я ўпэўнены, што ёсць такі артыкул. То дазвольце, задаць рытарычнае пытанне: выдаленне сведкі крымінальнай справы і выдаленне сведкі — сучасніка нейкай гістарычнай падзеі — ці не аднаго парадку гэта з'явы? Ці не трэба паставіць паміж гэтымі ўчынкамі знак роўнасці? Хай сабе маральны, пакуль не навучацца, перш чым дзейнічаць, спытацца ў разумнага і ўвогуле браць сабе ў сябры і дарадчыкі разумных людзей…

Мы прывыклі ў гэтыя дні сачыць за захадам, за тым, як сонца спускаецца ў бязмежныя воды. Ці з гарадзішча, ці з чаўноў, што стаяць на прыколе пад ім. Сачыць і думаць, бо не так ужо і многа часу адведзена чалавеку на тое, каб думаць, на гэтыя вячэрнія бяседы з сонцам. І, на жаль, менш ужо часу засталося бяседаваць і думаць, чым адбяседаваў і аддумаў.

А дні — што ж? Дні, калі гэта не вандраванні і не праца, — гэта проста мітусня, і беганіна, і марнасць марнасцяў.

Стаіць проста ў яблыні з фіялетавай квеценню буслянка з буслам — і гэта ўцеха воку і ўспамін на ўсё жыццё. І стаіць ля прычала цеплаход з кіношнікамі, якія круцяць тут фільм, равуць у вольныя гадзіны магнітафонамі, радасна гарлаюць пры сустрэчы — і гэта мітусня.

Мабыць, паўтараюся, але як у Калдуэла было ў апавяданні поўным-поўна шведаў, так у Тураве ў гэтыя дні было поўным-поўна кіношнікаў. А пакалькі я сам у пэўнай ступені належу да гэтай пароды людзей, то мне часам бывала не па сабе.

Пабудавалі яны ў затоцы хаты, "па паяс у вадзе" (вясенняй повені ім было мала!), пабудавалі царкву на гарадзішчы (мала ім было сапраўдных драўляных палескіх цэркваў над водамі), укапалі вакол яе ў зямлю векавыя таполі. Сапсавалі ўсім гэтым пейзаж, і ім добра.

Былі, вядома, і тут добрыя сустрэчы. З Барысам, з якім мы каліс "загаралі" на начным ледзяным Карадагу. З актрысай Макаравай, з якой па-братэрску расцалаваліся. Маленькае свядоцтва пра яе. Гэта чалавек, які можа, раннім ранкам ідучы на Камароўку і ўбачыўшы, што клумба на плошчы зарасла, паставіць кошык і, карыстаючыся, што людзей яшчэ няма, пачаць тую клумбу праполваць. Бо нельга запускаць хаця й маленькі лапік зямлі.

Вы самі разумееце, што пасля такога мне глыбока абыякавыя ўсе яе ступені і званні. Хаця, вядома, хай будуць і яны. Толькі — на мой розум — не за майстэрства і іншае такое, а за гэтую

незнішчальную ласку да гэтай зямлі, з якой усе мы выйшлі і куды ўсе пойдзем.

Так вось мала ведаеш чалавека, нават жывучы побач, і раптам павернецца ён да цябе нейкім зусім іншым, адметным бокам.

Дзе кіно, там і анекдот. Патрэбныя былі майстрам экрана старыя палескія хаўтуры. Гэткія з доўбленай калодай замест труны. Свайго туды не пакладзеш, адразу відаць, што ён палову жыцця прахадзіў у джынсах. Значыць, трэба было забяспечыць мясцовага "нябожчыка" ("параненыя і забітыя павінны прыйсці заўтра ў адзінаццаць!"). Прасцей простага было б забяспечыць труп на самай справе, але ў такіх выпадках міліцыя — і намеркаваны нябожчык, вядома, перш за ўсё, — начыста пазбаўляюцца пачуцця гумару. Значыць — грошы.

Звычайна здымачны дзень з безліччу дубляў — гэта тры рублі. Ляжыш сабе ў калодзе са свечкай у руках і слухаеш меладычныя спевы свяшчэнніка.

Толькі адно не ўлічылі, што ёсць у Тураве Кондараўка, што ўсе ведаюць адзін аднаго, а калі не ведаюць прозвішча, то ведаюць мянушкі кожнага (скажам, "брахачка", "чомбе"), што згадзіся вось так паляжаць са свечкай, то засмяюць, да самай магілы будзеш агульным смяхоццем.

З дваццаці пяці рублёў — аніхто не хацеў — плата за полег дайшла да сямідзесяці пяці. І паехалі мы, так і не даведаўшыся, ці знайшлі ахвочага.

Зайшлі мы ў той дзень і да дырэктара Прыпяцкага ландшафтна-гідралагічнага запаведніка — Ількі Аляксандравіча Салановіча. Пагаварылі аб планах, транспарце, суправаджальніках, аб становішчы ў запаведніку. Чалавек, як на кароткае знаёмства, дык, па-мойму, сімпатычны, досыць разумны і абазнаны ў тых мэтах, якім павінен служыць гэты кавалак прыпяцкай, "туроўскай" зямлі. Шанцавала б яму толькі ў вырашэнні складаных праблем, якія стаяць перад запаведнікам, усіх гэтых супярэчлівых, почасту навальнічных плыняў, якія будуць — ой будуць! — яшчэ кідаць гэты немалы карабель.

А карабель гэты — амаль 62 тысячы гектараў. У Жыткавіцкім, Лельчыцкім, Петрыкаўскім раёнах. І з поўначы яго абмяжоўвае Прыпяць, а з поўдня мяжуюць з ім Палескі, Мілашэвіцкі, Лельчыцкі лясгасы.

Немінучыя тут самыя сур'ёзныя пытанні, праблемы, барацьба супярэчлівых інтарэсаў, канфлікты.

Я пад час першай бяседы назнарок удаў з сябе гэткую святую цноту, гэткі бязмежны, да дурасці, наіў. А што, маўляў, будзе, калі я захачу зайсці ў запаведнік, сесці там на пні і ў натхнёнай самоце пісаць там вершы? І ці не выставяць мяне за гэта адтуль пад

канвоем? І зразумеў, што ён цудоўна разумее мае прыдурванні, толькі не хоча даць мне зразумець гэтага. Так што пад час другой бяседы я ўзняў рукі ўгару. Далёка тут яшчэ да статуса дзяржаўнага парку, калі штраф нават за ўзнятую шышку такі, што дзесятаму забароніш рабіць гэта. Не хапае сілы, не хапае людзей. І што ўжо там той ландыш, які я сарваў бы і нюхаў, крэмзаючы нейкі да нудоты сентыментальны верш? Што ў ландышы, калі далёка не кожны выпадак браканьерства мае ў фінале спайманне і заслужаную кару?!

А між тым — і Салановіч, па-мойму, недзе ў душы адчувае гэта — будучыня гэтых мясцін і самога гарадка, прынамсі, на бліжэйшы час і ў ідэале, менавіта у запаведнасці гэтай зямлі, менавіта ў яе першародстве, менавіта ў тым, што гэта не закультураная з незапамятных часоў, як Белавежа, старонка, што гэта першапачаткова было так, і таму гэта унікальная навукова-доследная пляцоўка, якіх у Еўропе — і не толькі ў Еўропе — ужо амаль няма.

У сім-тым, вядома, паспелі напсаваць і тут, але не да такой ступені, каб, гледзячы на гэтыя дубровы і чорнаалешнікі, на гэтыя зарасці грабаў і вязаў, нельга было ўявіць сабе — асабліва калі ты ўмееш уяўляць, — якой была зямля ў першы дзень стварэння.

Харошая была зямля. Створаная для людзей з чыстым сэрцам і празрыстымі вачыма.

Схема, план, карта. Лепей за ўсё пачынаць знаёмства з нечым, што ўбачыш заўтра, трымаючы іх у руках. Шкада, што гэтая схема, якую мы выцыганілі ў дырэктара, такая малая і агульная. Але й так лепей, чым нічога. Прынамсі, будзеш крыху ведаць, куды панясуць цябе ногі, дзе ляжыць у лесе якая вёска, дзе лясніцтва, дзе ручаіна, возера, балота. І вось тут Судзібор, там Сімановіцкая Рудня, там Хлупін, назвы, пакуль што не напоўненыя для цябе аніякім зместам, нумары кварталаў, за якімі яшчэ не ўстае для цябе непаўторны, кожны на сваё аблічча краявід.

А жыццё між тым ідзе і ў хаце і ў двары. У двары трагедыя. Некалькі куранят праявілі самастойнасць і вылезлі з-пад сеткі. А паколькі самастойнасць бывае небяспечная на вынікі, то злы лёс у вобразе мярзотніцы Чыты не замарудзіў распарадзіцца іхнім жыццём. Прысуд абуранага грамадства быў аднагалосны: каб перапыніць на будучае агіднасць і буянства, прысудзіць кошку да расстраляння. Вадзім ледзь не са слязьмі на вачах прыступіў да выканання прысуду. Але адкуль у такой брыды такі розум прадчування? Чыта чкурнула некуды з двара, як міцкевічаўскі селянін, што сядзеў у каноплях, пакуль у пана не пройдзе прыпадак гневу, не з'яўлялася ўсю ноч, і — сэрца, вядома ж, не

камень. Прысуд пайшоў на абскарджанне і быў адменены, бо варта было Тамары спытаць: "Дык, можа б, ты й куранятка хацела б?" — і кошка, падціснуўшы хвост і вушы, ляцела ў зарасці на пяць метраў хутчэй за ўласнае няўканне.

…Раніца ў тысячагадовых гарадах такая самая, як і ў зусім свежаспечаных. Асабліва калі тысячагоддзе не пакінула пасля сябе велічных муроў, вежаў, храмаў і палацаў, калі рэшткі ўсяго гэтага спяць у затравелай зямлі.

Ідуць сабе людзі на работу — і мы сабе едзем нашым малым чырвоным КАВЗам на работу. І не толькі самі едзем працаваць, але і рабочых з інструментам, з рознымі там кельмамі падкідаем да Азяранаў. Круціць баранку вадзіцель Сямён Сяргеевіч, кіруе аўтобусік праз рэчышча Сцвіжынец і рэчку Сцвігу ў гэтую сцюдзёную, рахмана нясмелую вясну.

Як халодна вясной! Як дрыжаць гэтыя слабаапранутыя дрэвы. Як пакорліва, па-рабску спадзяюцца на няблізкае сонца. І якія яны ўпартыя ў чаканні яго.

Слепцы цяпер перайменаваныя ў Знаменку. На гэта мы майстры, бо гэта лягчэй за ўсё. І стаяць на зямлі нашай сотні Вішнёвак, тысячы Пераможных, дзесяткі Арабінавак і Яблыневых. І ніхто не вылупіцца са стандарту, не скочыць вышэй мазгоў, не прыдумае хаця б такіх мясцовых назваў, як Ветвіца, Млынок Сімановіцкі, Хваенск. Ці такой назвы далёкай вёскі, назвы — стварэння розуму геніяльнага, як Байкі Мамчыны (а мо і яе зараз перайменавалі ў нейкую там Кляноўку?!).

Клакоцкі, невялікі, вельмі кашчавы, тварам — ну, дакладна У. І. Даль, толькі што барада клінам (досыць рэдкі выпадак, калі я памяркоўна стаўлюся да барады ў чалавека, што яшчэ не стаў дзедам), расказвае. І ўзрадаваны, што побач чалавек, які ўмее слухаць і спачуваць, і проста — справу гаворыць. Бо проста языком мянціць — гэта ў нас тысячы такіх, мянціць пяром на паперы — сотні. А ведаць, гаварыць слушнае і дзелавое, рабіць, не торкаючы ў вочы паказуху ў выглядзе пустых кніжак — такіх людзей куды менеі, чым хацелася б.

І ён гаворыць аб фаўне стэпаў і лесастэпаў так, што, паслухаўшы яго, іншы дзесяць трактатаў напісаў бы. І ты за яго напісаць не здолееш, атрымаецца "Жыццё жывёл" А. Брэма. І яму параіць напісаць такое — язык не падымаецца і сумленне не дазваляе. Бо чалавек справай заняты.

Вунь, улева, мясцовасць такая, Ковек. Вадзілася там асобная папуляцыя гарнастаяў, вельмі буйная. Цяпер, бо работы вакол, разбрыліся, і папуляцыі той там няма. А вунь канава Бычок, самае вусце, і там піць няварта, а глыбей, у нетры, вада чорная і бліскучая, як японскі лак, і такая самая празрыстая. Даўно

капаная канава. І, як уся тагачасная "меліярацыя", была яна сціплая, не рэзала па жылах маці-прыроды, ціха і паступова ўпісвалася ў адвечную плынь яе жыцця.

Наша меліярацыя ідзе шумна, у тэмпе, волатавымі крокамі. І не дае яна ні расліне, ні жывёле, ні самой натуры прыцярпецца, прыцерціся, прыстасавацца, мякка і навекі ўвайсці ў суіснаванне адно з адным.

Вунь да вёскі Бечы, або Бячанская Буда, нейкія два з паловаю кіламетры, раней было яе не бачна і не чутно, а цяпер — як на далоні.

Дамбы, дамбы — дарогі, дамбы. І мала што жывое паспявае прыстасавацца да іх. Вунь хіба ластаўкі-берагоўкі парабілі калонію гнёздаў у адкосе адной.

Ехаць з Клакоцкім цікава. Бачыць многа. У мяне таксама някепскі зрок (тфу-тфу!), у маладосці быў нават выключны. А ў гэтага зрок абвостраны веданнем. Я магу толькі сказаць (гэта пад Слепцамі): "Палявы лунь ляціць". А ён скажа, ці далёка ягонае месца. Я магу сказаць: "Кражныя пайшлі", ды, можа, дабаўлю, што самцы. А ён скажа, што ляцяць на ліньку. Я заўважу двух сівагракаў, а ён скажа, па якой такой справе і куды яны кіруюцца.

Пайшла дуброва, чысценькая, як парк. Гэта, што праўда, саджаная дужа даўно дуброва… І пад дубамі пасвіцца чарада кароў. Прыгожа — для кепскага мастака. І мароз па скуры — для лесавода, тым больш у запаведніку. Гэта ўжо (ад рэчышча Сцвігі) так званая буферная зона. Дый тая азначана хіба што на карце алоўкам, а больш, на справе, аніякай буфернай зоны не існуе. Я яшчэ буду казаць аб гэтым, а пакуль проста ўвайдзіце ў становішча ляснога чалавека. Як гэта яму: бачыць у дуброве замест травы і моху каровіны праснакі.

Ох гэта сіроцкая, сцюдзёная вясна! Мерзнуць буслы ў гнёздах. Матляюцца на ветры галіны дрэў і канцы ручнікоў, якімі густа ўхутаны крыжы на вясковых магілках… Перапоўскі Млынок — і злева, над халодным возерам, недаверлівыя да першых праблісkаў цеплыні дубы. Хто іх ведае, ці будзе яна, гэтая цеплыня. Кніжкі кніжкамі, прагнозы прагнозамі. Першых мы не чытаем, другіх не слухаем і слухаць не хочам. Мы слухаем сваіх бацькоў. Вунь той, малады яшчэ, два стагоддзі. А як было яму трыццаць шэсць — выпаў у чэрвені снег на чвэрць сажаня, а ў ліпені азёры пакрыліся лёдам, а лістота на ім счарнела… А вунь той — зусім смаркач, нейкія сто год. Дык у ягоным юнацтве здарыўся год — жыта жалі ў кажухах. Сонца сонцам, а пажывём — пабачым. Абяцанкі-цацанкі — э-хе-хе.

У Хлупінскім лесе перасеклі мяжу непасрэдна запаведніка, часта грабняк, і нічога адметнага. Ішла перад Хлупінам праходная

высечка лесу, далятаў зводдаль гук бензапілы. Арнітолаг пайшоў лугам на гукі шукаць палясоўшчыка Кадоліча, а мы стаялі каля машыны, і нам не дапамагаў нават тытунь. Адно станоўчае несла з сабою гэтая сцюдзёная вясна: параўнаўча мала было мошкі, гнюсі, гэтай атруты, яду паветра. Бо час, калі яна пануе, называецца тут кароткім і невыносным словам "з'яд". З'яд, калі яна арудуе паўсюль, калі яе можна наесціся разам з ежай, надыхацца ёю разам з паветрам аж да здыхоцця.

Стылая вясна зрабіла сваё: з'яд толькі пачынаўся. Але і такі выносіць, цярпець было цяжкавата. І чаго гэта дабротамі цеплыні перш за ўсё пачынае карыстацца розная навалач?!

…У Тураве, — калі гаварыць пра водаправод, — дужа брыдкая вада. Нейкая ржавая, з вялікім асадкам. І вось тут, у Хлупіне, я і адвёў душу, п'ючы са студні, нават калі ўжо не хацелася. Нясмела пачыналі цвісці над студняй яблыні, а вада была сцюдзёная, як начное паветра, смачная і празрыстая. І, відаць, моцна напірала яна з глыбінь, ці іншая была нейкая прычына, бо ўзровень вады ў многіх студнях быў на 30, на 40 сантыметраў, нават на метр вышэй, чым побач, у возеры.

Вялікая гэта даброта — вада, нават у такім вадзяным кутку, вялікае шчасце і ўдача — правільна знойдзеная вадзяная жыла.

І тут пачалася дуброва, дуброўка, дубровачка. Праўда, не спрадвечная, а вытворна-другаразовая, але ўсё адно, такі стары, высокабанітэтны лес, што скінь шапку (бо ўсё адно зляціць, як галаву задзярэш) ды маліся… Не ўжываю тут тэрмінаў "сніткавая, дуброва". Не па-беларуску гэта гучыць. А калі верыць Далю, то й не па-руску: "Как немцы-ботаники, работавшие за нас, записывали по наслуху русские названия… так мы их и приняли, исковерканными, во все учебники".

Проста лес. Дзіва лесу. Дубы-волаты. Часам трапляюцца клёны, ясені, грабы, адзінкавыя экземпляры ліпы, гіганцкія вольхі над ляснымі ручаінамі. І цяплей тут, не так адчуваецца стыласць вясны, і ласкавей тут, і паветра тут іншае.

Дарэмна гэта гаварылі, што поле — таксама расліны, што ніва на месцы зведзенага лесу — таксама, маўляў, кісларод. Не. Ніва — гэта страўнік зямлі. А лёгкія зямлі, лёгкія чалавека — толькі лес. І што ў смачным абедзе чалавеку пад час прыпадку астмы, калі ён задыхаецца? Не толькі хлеб перадумова жыцця.

Паветра і хлеб!

Але і тут, асабліва бліжэй да ўзлесся, пасвілі быдла. Але й тут іржавелі ў траве рэйкі вузкакалейкі, нібы залітыя крывёй: гэты лес яшчэ нядаўна пляжылі. Цвіла ля рэек суніца, і жоўты мар'яннік спяшаўся заснаваць сабою нядаўнюю брыду.

Стаялі на дубах калоды-свепеты. Спявала птушка-цвыркун.

Увогуле птушак спявала мала, але цвыркун чуўся да самых лясных глыбінь. Дзіва, але ў альшэўніках не было салаўя. Арнітолаг і тут паспяваў хутчэй за ўсіх заўважыць гняздо дразда-рабінніка, дзівосны клён, што цвіў адной вяршыняю (нібы залатою шапкай), хаця даўно павінен быў бы адцвісці. І я, што лічыў сябе лясным чалавекам, разумеў, што ў параўнанні з такімі людзьмі я ў лесе ўсё адно што сляпы.

Ледзь не ў другі толькі раз у сваім жыцці я ўбачыў вялізную і пачварную "вядзьмарчыну мятлу" на самым канцы грабавай галіны. Але тут увогуле была маса прыгожага старога грабу. А пасля на вымачыне, на пятачку падсохлай гразі, прамільгнуў след казулі і след ваўка, які ішоў за ёю. Не бег, а ішоў, таму што быў, відаць, сыты. Таму што вось трапіўся і ягоны памёт. Як валасатая яловая шышка. І валасы тыя былі шчэццю дзіка, якога воўк нядаўна з'еў. Есці са шчэццю — не ведаю, чый страўнік, акрамя ваўчынага, вытрымаў бы гэта.

І так мы ішлі нетрамі, назіралі за гульнёй двух змеяедаў у паветры і гаманілі аб аленях, якія з'явіліся тут невядома адкуль некалькі год назад. Спачатку іх было чатыры, пасля, гады два-тры, шэсць — пасля яны зніклі. Ці пайшлі кудысь, ці нехта знішчыў. З вучоных ніхто не бачыў, а мясцовыя жыхары казалі пра невядомага звера: "Рогі, як у лася" (у ласёў бываюць рогі сукавідныя і лапатавідныя, і ласёў апошняга тыпу ўсё меней і меней). Знайшлі, праўда, скінуты "быком" (самцом аленя) рог, які быў у чатырнаццаць сукоў.

І селі мы ў машыну, і паехалі мы па палясоўшчыка Кадоліча Уладзіміра Георгіевіча, "караля лесу", як гучыць ягоная мясцовая мянушка. І прывезлі яго дахаты, і чакалі, фатаграфуючы прадаўшчыцу і яе хлопчыка, і намазалі хлопчыку галаву сродкам ад мошкі, каб спакойна стаяў, і лепш бы мы не рабілі гэтага, бо выццё ягонае чулі, па-мойму, нават у Тураве. А пасля паплылі з Кадолічам возерам Обедзь, яно ж Хлупінскае, рэчышчам да ўрочышча Галава, у славуты першы квартал.

І яшчэ адзін добры чалавек быў падараны мне жыццём за гэтыя дні. Чалавек, які спакойна і проста разважае, што вось трэба спілаваць ссохлы дуб на поплаве, і ён бы зрабіў гэта, ды дацягнуў да вясны, а там пашкадаваў буслоў. Але як яны адлятуць у вырай, то спілаваць трэба будзе адразу. Таму што буслянка старая, важыць сама меней дзве тоны і трымаецца на слове гонару. І трэба ладзіць на новым дрэве падмост пад новую буслянку для новай вясны. Жывы яшчэ пакуль лес беларускі вось такімі людзьмі.

А пасля было дзіва. Неапісальнае. Мабыць, з апошніх такіх на нашай зямлі, хаця раней Дняпро, і Нёман, і Сож — гэта былі

пойменныя дубровы па берагах.

Вада яшчэ не зусім спала. І стаялі над гэтай высокай вадой дубы карказломныя, дубы-вежы, дубы, на якіх замкі можна было б будаваць, дубы-хмары ў палову неба, дубы-калоны, на якіх трымаецца неба над гэтай зямлёй.

Дубы, якія перанеслі вечнасць, дубы, якія кожнай галінкай сваёй былі як адмаўленне сцюдзёнай вясны і сцвярджэнне цеплыні і сонца.

Было мне кепска. Фізічна кепска. І яшчэ кепска ад адчування сваёй мімалётнасці. І што кожны такі мімалётны — можа быці мацнейшы за гэтую вечнасць. А я нічым не магу памагчы вечнасці, акрамя вечнага паўтарэння аднаго і таго ж, вечнага закліку да сумлення братоў. Заклінання, якое часам бывае марным лямантам у пустыні.

Я папрасіў аб пяці хвілінах самоты і атрымаў яе. І доўга шукаў месца, дзе сесці. Бо ўся зямля была спачатку ў незабудках, потым у ландышах (тут, ля берага, яны яшчэ не распусціліся, бо сцюдзёная вясна начамі, відаць, дыхала холадам ад вады, і толькі далей бачны быў суцэльны, адзін ландыш ля аднаго, белы дыван). Ландыш каля ландыша, гэта не перабольшанне. На адным квадратным дэцыметры не менш чым дзесяць — пятнаццаць раслін. І так наколькі вока сягае.

Ну і пусці сюды гандляра. Трыццаць капеек з дэцыметра. Трыццаць рублёў з квадратнага метра. Сабака, павешаны за тое, што не ўкусіў суседа.

…А тут скора зацвітуць ландышы. Не для рублёў, а для вачэй, для неба, для гэтай бярозы, што расце ў дубовым пні, нібы ў кадушцы, для рыбалова (зімародка), які нізкай стралою ляціць над вадой, для вераб'ёў палявых і працавітай галкі, што нясуць птушанятам ежу. Проста для таго, каб не паменела ў сэрцы шчырасці, каб чалавек не ляцеў, як на злом галавы, а часам сеў і падумаў.

Напрыклад, аб тым, што вось адкрываецца паляўнічы сезон і нахлынуць на той бок Прыпяці паляўнічыя аж з Кіева, аж чорт яго ведае адкуль, і на кожным кіламетры там будзе гучаць столькі стрэлаў, нібы кожны кіламетр гэтай зямлі — Барадзіно.

А тут ландышы. А тут ідуць за хмызамі па недалёкай Прыпяці судны і здаецца, што Прыпяць вышэй за паплавы. Тут будзе цвісці шыпшына, і тут ты не вынішчальнік, не забойца, а роўны сярод роўных.

Калі вярнуліся астатнія, я ўжо крыху акрыяў і падумаў, глянуўшы на іх: "Ды не, не дадуць. Не дадуць такія. Не дазволяць разбою".

І плылі мы назад па канале Рэчышча. І было ў дрэвах возера

Кругленькае, метраў гэтак на 12–13 з хвосцікам глыбіні. І неабсяжныя па таўшчыні і недасяжныя Іа вышыні вербы стаялі ў вадзе, і градамі на Прыпяць адсюль было не прайсці — гэтымі водамі і джунглямі многімі. І на адной вярбе быў дзівосны па форме нарост, і Кадоліч сказаў мне з усмешкай:

— Глядзі, мядзведзь сядзіць. Вада на дрэва загнала.

І тут урэшце была салаўіная краіна. Па дакладным падліку сем салаўёў на нейкія дзвесце метраў,

…Сядзелі мы ў двары ў Кадоліча, пілі бярозавік, вельмі смачны, бо настоены на грушах. Стаяла ў кветніку чаромха-венік: метр з нечым вышыні — і ўся ў белай квецені. На платах, на сцяне хаты была цямнейшая адмеціна: так стаяла ў повень вада. Вышэй яна была хіба што ў 1891 годзе. Ну і што? Людзі ведалі нораў Прыпяці, а Прыпяць ведала стойкасць людзей.

— Вы што ж — на гару перасяліліся?

— Чаму-у? У хаце. Я на ложку, жонка — на печцы. З ложка адразу ў высокія боты — і пайшоў.

— Дык вільготна ж.

— Ад сырасці грубку палілі… Шчупачок у хлеў заплыў.

— Што, байка пра сама ў печцы?

— Як-кая байка. Жыццё — байка. Рака… Сама байка… Бачыце на чым сядзім?

Сядзім мы сапраўды на крэслах-тронах, зробленых з цэльнага дубовага стаўбура: таўшчэзны пень са спінкаю. Такія ставяць у паляўнічых гаспадарках для розных там "ахвотнічкаў" — тых, што ахвотна п'юць на іх "ахвотнічую" гарэлку і з якіх смяецца славуты паляўнічы анекдот:

— Гэх, ахвотнічкі, не туды вы панюхалі!

І вось паводка распарадзілася па-свойму. Уначы вада ішла дваром з шумам.

— Ранкам выйшаў — думаў дзве калоды пчаліныя прынесла ў двор… Штурхнуў нагою, яна крутанулася — аж не… Дык вось і сядзім…

Прыпяць ведала, што робіць. Сама прынесла ў двор свой дар, трон для ляснога, для свайго караля.

І мы сфатаграфавалі яго на гэтым троне.

І носяць, і носяць нас ногі… Сёння, у гэты халодны шэры ранак, яны нясуць нас на паром. Быў тут калісьці мост. Спалілі ў вайну. І вось на многія кіламетры паром застаўся адзінай ніццю, што звязвае левы бераг з правым. Едзе тэхніка, едзе розны груз, трактары, легкавушкі, машыны тэхнічнай дапамогі, аўтобусы, грузавікі з трубамі, драўнінай. І людзі, розныя людзі.

Сноўдае туды-сюды за кацерам платформа ў пятнаццаць метраў даўжыні і вязе за кожным разам пяцьдзесят тон жалеза і

чалавечых лёсаў.

Прычал — "прыпарамак" з ушчэнт змачаленымі бярвеннямі і два паромы.

На рацэ Сіверка, над ракой шэранькі дзень і рэдкія, халодныя кроплі дажджу. Калі разварочваецца кацярок, то з-пад вінта б'е бура-празрыстая вада Прыпяці, вельмі падобная на піва. Змрочная вада. І невядома, чаго вязуць кудысьці ў такі сцюдзёны дзень малатарні, трактары з прычэпамі і тыпавыя платы для святкавання тысячагоддзя Турава.

Дошкі паромныя, залітыя саляркай, і ўсё адно ля чыгунных прычальных кнехтаў (такіх, як на караблі),

куды не заедзе кола машыны, зелянее траўка: неўміручая сіла жыцця.

Разяваць зяпу тут не рэкамендуецца. Я, напрыклад, ледзь не застаўся без азадка, бо панесла легкавік. Добра, што паромшчык у ватоўцы і кедах вельмі падобны на акцёра, які іграў у "Дзецях капітана Гранта" маёра Мак-Нарса (толькі што зарослы шчэццю), адцягнуў.

— Тут аднаму ледзь уласнай машынай хрыбет не скруціло-о.

Ён махае рукамі (узвалокваюць аўтакран), гаворыць нешта дзяўчатам, уладальніцам чысцейшага палескага дыялекту і торбаў з голымі негрыцянкамі, дае нейкую параду бабульцы ў фартуху, нешта даводзіць дзядзьку, апранутаму у сэнсе колераў проста з парыжскім густам.

Зялёны капялюх, сіні гарнітур, ліловы гальштук. Начальнік.

— Моро машын возім.

— Колькі?

— Лічылі раз, каб плаціць. Збі-ліса-а. Нам плоцяць па пяць капеек з машыны, і грошай нам хапае — во! Па семдзесят пяць рублёў плоцяць… Часам пытаюць: "Колькі?" Не, у нас бясплатно. У Петрыкове дзвіжэння нема. Машын дваццаць перавязуць за дзень, і ўсё. А ў нас… і ноччу часом по одной возім. Не сядзець жа. А ў нядзелю толькі вазі, толькі вазі. Моро.

Па пяць капеек. Іх шэсць чалавек. Калі нават лічыць толькі іхнюю зарплату, то перавозяць яны дзевяць тысяч машын у месяц. Трыста ў дзень А ў святы?

І таму круглыя суткі і ўвесь час вольнай вады крэйсіруе паромам, жартуе, рагоча, плача, заляцаецца і сварыцца на гэтым пароме жывое Палессе.

Едуць дзеці і дарослыя, едуць вазы з сенам, едуць спявучыя вяселлі. і слёзныя хаўтуры (і вецер развейвае чорныя стужкі на крыжах).

Паром гайдаецца ад машын. Едуць бабулі ў бурках, і дзяўчаты ў джынсах, і маладзёны ў куртках пад скуру і з кудламі да спіны.

Едуць вайсковыя, малады хлопец заляцаецца да гожанькай цыганачкі. Едзе шафёр у клятчастым пінжаку, доўгі, як страла ягонага аўтакрана. І едзе другі шафёр з вусатым партрэтам за шклом (лёгкая фронда з дуляю ў кішэні), з доўгімі бачкамі і тварам, падобным на дулю здароваму сэнсу.

І можна сабе ўявіць, што такое гэты паром у святы, на нейкі фэст (па мясцоваму "кермаш"), калі ён аж гудзе ад стракатых, як восы і чмялі, баб і мужыкоў, калі ён вясёлкавы ад дзяўчат і цыганоў.

Тут, на гэтым пароме, мацаеш пульс гэтай зямлі. Тут гарлае яе лужоная глотка, тут стукае яе няспыннае сэрца.

Вечар спускаецца на Струмень. Коні качаюцца ля хаткі бакеншчыка і ластаўкі чыркаюць ваду. Пастух на веласіпедзе гоніць пугай па мосціку (а пасля яны ўплаў плавяцца цераз Струмень на балонь) табун коней. Жарабятка, стоячы ў вадзе, смокча кабылу (бо там няма мошкі).

Сонца сядае ў жамчужную хмару, і водбліск ягоны ў вадзе таксама апалавы. Усё на дождж. І на дождж "цвеліцца" (брохае, гуляе) рыба. І ён прыходзіць уначы. Спачатку, невялічкі, цёплы, шапоча з лістотаю і травою. Пасля набліжаецца, моцны і ўсепранікальны, ох які патрэбны дождж!

Палессе і мокне і сохне. Як казаў Кадоліч, пыл за плугам там, дзе ўчора стаяла вада.

Шмат пішуць аб "утаймаванні" Прыпяці, гэта значыць аб дамбаванні яе. Ды яшчэ задаюць пытанні, ці не панясе страту ад гэтага "неапісальная" прырода краю, ягоныя "звонкія дубровы", усе гэтыя "пяцьдзесят відаў сысуноў і дзвесце пяцьдзесят відаў птушак". Адказаць можна без лішніх слоў, таму што ў повень пойма не толькі "№хаваецца пад вадой". Паводка ўгнойвае глебу, корміць пойму. Нічога не трэба вырашаць так, з маху, трэба вельмі-вельмі многа думаць, улічыць усё, бо паглядзіце на тыя "шматлікія прытокі Прыпяці", якія "разыходзяцца". Там ужо ў значнай ступені няма чаму "разыходзіцца". Дзівосная Случ у вусці — гэта ўжо не болей чым занесены пяскамі канал. У многіх драбнейшых былых прытоках маляўкі не знойдзеш.

Прыродныя сістэмы складаюцца і выпрабоўваюцца тысячагоддзямі, і нельга без незваротных страт стварыць новую сістэму за год-два. Мяса-малочная гаспадарка. Травы. Але глеба, на якой растуць тут травы, — алювіяльная глеба. Дзецішча ракі, дзецішча паводак маці Прыпяці. Без гэтых запланаваных прыродай паводкавых падкормак зямля поймы Прыпяці не будзе каштаваць нічога.

Я баюся гэтага, бо люблю гэтую зямлю. Мы можам пацярпець без гэтых гектараў, а тым часам яшчэ семдзесят разоў абдумаць,

чым разануць. Але мы хочам гэтыя гектары сёння, зараз. І мы заворваем неацэнныя прыпяцкія паплавы, заворваем пашу. А быдла пасвім у лесе, не выключаючы запаведнага. А тое знішчае ў лесе падлесак. Знішчае будучую змену гэтых велічных дубовых гігантаў.

Як бы вы паглядзелі на грамадства, якое, дбаючы аб сільных мужах і мудрых старых, зусім бы не дбала аб дзецях. Старыя мудрацы ў такім грамадстве вымерлі, сталыя мужы састарыліся б і памерлі таксама. І ніхто не заняў бы іхняга месца. І грамадства такое было б аддадзена тлену, асуджана на смерць…

Такое грамадства — прыпяцкія пойменныя дубровы.

Гэта грамадства я люблю і таму ўзвышаю свой слабы голас у ягоную абарону, бо хачу сам бачыць першы квартал і хачу, каб далёкія нашчадкі бачылі яго. І таму кажу:

— Падумайце. Падумайце тысячу разоў. На тое вы — людзі, якія жывуць не адно сённяшняй хвілінай, а там хаця і трава не расці.

Падумайце над кожнай былкай, падумайце над дубам, які церпіць паводку, але не доўгую. Падумайце, пакуль пыл у два сантыметры (а таму ўжо ёсць прыклады) не лёг на сакавітыя паплавы. Падумайце, каб Палессю не засталося, як на апошнюю літасць, спадзявацца на дождж.

…Якое шчасце! Ідзе дождж. Кроплі сплываюць з лісцяў шыпшыны, белы снег абсыпанай квецені пад яблынямі.

Падумайце над апавяданнем Роберта Янга "Ссячы дрэва". Лепей пра ўзаемаадносіны з лясамі і прыродай не скажаш.

Падумайце і не суцяшайце сябе тым, што поле гэта — той самы комплекс раслін, што і лес, што гектар кукурузы неяк заменіць гектар лесу, зойме яго месца ў біясферы.

Не, не заменіць.

Падумайце, бо іначай атрымаецца, як з янотам-паласкуном. Не падумаўшы завезлі, і вось той знішчае птушыныя яйкі. Не толькі на зямлі, але ў дуплах, бо цудоўна лазіць. І гэта, побач з неабдуманай меліярацыяй, адна з прычын вялікага падзення птушынага пагалоўя на Прыпяці.

Падумайце над тураўскай гісторыяй. Бо вось збудавалі на адной палове гарадзішча дзіцячую пляцоўку з прыбіральняй на роту салдат, завялі гароды (цыбуля на былой славе), укапалі (кіношнікі) у зямлю мёртвыя дрэвы, пашкодзіўшы культурны слой, разрылі земснарадамі бераг Струменя пад гарадзішчам. І там цяпер ляжаць уроссып згубленыя для вучоных прылады працы продкаў, іхнія ўпрыгожанні, арабскія дыргемы і дынарыі, медныя іконкі і свінцовыя пломбы, кавалкі шкляных бранзалетаў і баявыя сякеры.

Усё, чым жылі прашчуры.

Падумайце аб лёсе песні палескай. Бо вось рукой падаць да Тонежа, а з цеплахода абражае хаты і Прыпяць надрыўны барабанны пошчак і голас: (ну дакладна, як у тым віску) "Гю-ю-ю-ййы". А пасля невялічкага перапынку нешта яшчэ:

Вы слыхали, как поют дрозды?
Нет, не те дрозды, не полевые,
А лесные, русские дрозды,
Певчие избранники России.

Тут проста ў кожным слове абраза здароваму сэнсу. Нават навуцы аб птушках. Таму што няма ні стэпавых, ні палявых драздоў. Усе яны — лясныя. А палявы дрозд — такая самая абракадабра, як ледніковы заяц або горны гіпапатам.

Ад паэтаў, вядома, цяжка патрабаваць логікі. Глушэц "шчоўкае" і "скшыжыкае", але ніяк не "плачет со звонами". Гівал (івалга), хоць усё жыццё чакай, не "схоронится в дупло" і не стане "плакать".

Але тут ёсць адна вялікая розніца. Гэта Ясенін, паэзія, і "што вольна ваяводзе, то…".

Падумайце аб тым, што знікае ў нябыт, і аб тым, што ёсць і што будзе. Падумайце, што яшчэ ў дваццатыя гады дзевятнаццатага стагоддзя К. Контрым гаварыў аб спробах знішчыць тураўскія лясы (выкупілі іх за 64 тысячы рублёў і хацелі сплавіць па Дняпры), што ўжо тады гаварылі аб знікненні многіх жывёл і птушак (і спасылаліся пры гэтым на старыя дакументы).

Падумайце аб душы народа, які ўзрастае сярод гэтых дуброў і на гэтых водах, вучыцца плаваць па іх раней, чым навучыцца хадзіць, не ўмее бегаць, а ўжо грабе. Аб дзіцяці, якое ў адказ на прапанову пешай прагулянкі, раве на ўсю глотку:

— У ёдку хацю!

Аб людзях, якія ўзраслі на гэтых берагах такімі, якія яны ёсць, якіх за гэта трэба паважаць і з думкай якіх трэба лічыцца.

Падумайце, як думалі аб усім гэтым мы, ад'язджаючы шэрым ранкам ад гэтых хат і садоў, развітваючыся з суровай Прыпяццю, з гэтай зямлёй, якая адарыла нас вышэйшым шчасцем І гонарам нарадзіцца на ёй і якой мы таму павінны адплаціць працай, даверам, павагаю і ісцінай.

Тысячу стагоддзяў табе!

…Над гарамі дождж. Над гарамі гнілы — іначай не скажаш — лютаўскі туман. Кіпарысы абвіснулі. Мокнуць пад злівай нахохленыя чорныя дразды. Хваля матляе ў бухце судны, і яны крэсляць мачтамі пахмурнае неба. І ў такія хвіліны міжволі думаеш: а які ж чорт занёс цябе сюды, чалавеча?!

Не сюды трэба было ўцякаць, калі ўжо надакучыў табе Мінск. Некуды на Дняпро ці на Дзвіну. Некуды на Невельска-Віцебскую граду, дзе дрэмлюць густа аснежаныя хвоі, дзе на грывах стаяць лілаватыя лясы. На дзве, здаецца, з лішкам, тысячы паўночных беларускіх азёр. На віцебскія, дзе па святах сядзяць на лёдзе падобныя на пінгвінаў рыбакі, але дзе ёсць і такія азёры, да якіх амаль не дабіраецца чалавек.

А ўрэшце, чаму і не ў сам Віцебск уцячы? У цяперашні, няхай сабе і падобны на іншыя гарады, ушчэнт выпаленыя вайной і адноўленыя па тыпавых праектах, — галоўнае — адноўлены, галоўнае — свой, зялёны, гаманлівы, часам аж да крыку, вясёлы, адбіты ў плынях Дзвіны, аточаны лясамі.

Або ў горад, які я памятаю з дзяцінства, з арачным мостам над Віцьбай, са стрэламі званіц, з вулачкамі, што збягаюць да Дзвіны, суматохлівы і, як мне тады здавалася, надта ж ужо вялікі.

Хадзіць пад снегам ці нават — няхай! — пад дажджом, або, лепей, летам стаяць над вялікай ракой, швэндацца паркамі, дзе ў дажджлівыя ночы стаяць вакол ліхтароў вясёлкавыя кругі. І ўспамінаць, шмат успамінаць, хаця з таго, што ўспамінаеш, мала чаго засталося, хаця там цяпер усё новае.

Шматпакутны тысячагадовы прыгажун! Колькі ж разоў даводзілася табе за гэтую тысячу гадоў твайго жыцця ператварацца ў прысак і ўваскрасаць з гэтага прыску! І хай мяне шасне пярун, калі я, нягледзячы на трывіяльнасць такой паралелі, успомніўшы пра ўсё гэта, не ўспомніў фенікса.

Тысяча гадоў… Калі табе споўніцца дзве тысячы, ад нас нічога не застанецца, але і тады наша любоў да цябе будзе нячутна блукаць вуліцамі тваімі, горад, і жыць у вачах і душах новых тваіх грамадзян.

Ёсць шмат тысячагадовых гарадоў. Часам куды галаснейшая іхняя слава. Таму што там галоўным быў меч, а рукі — толькі пасля. А ў цябе былі залатыя рукі тваіх творцаў, тваіх грамадзян, якія толькі па крайняй неабходнасці браліся за меч. А гісторыя чамусьці болей аддавала ўвагі заваёўнікам, а не тым, хто мірна ткаў палотны, рабіў па золаце і срэбры, араў, гарбарнічаў —

словам, рабіў простую і сумленную справу, працу, без якой чалавек даўно б перастаў быць. Праўдзівей, проста не стаў бы чалавекам.

Гэтыя рукі і выкапалі тут тысячу гадоў назад першую напаўзямлянку, звалілі першую залатую хвою, паклалі камень у падмурак першай хароміны і, мабыць, высеклі на камені пасярэдзіне Дзвіны, ля Забежжа (відаць, каб першыя ладдзі ведалі фарватар), глыбокі шасціканечны крыж. Не ведаю, ці ляжыць той камень і зараз. Калі так, то ён памятае ладдзі з лебядзінымі цыямі і барвянымі ветразямі, а ў іх — суровых людзей, першых віцьбічаў, а магчыма, і саму княгіню Вольгу, якая (прынамсі, так кажа пазнейшае паданне) заснавала горад.

Не ведаю, ці так гэта. Ды, урэшце, такая жанчына, перад якой схіляліся плямёны, чалавек падступнага сэрца і дзяржаўнага розуму, па слове якой сутыкаліся народы і звінела "варажская сталь у візантыйскую медзь", у сэрцы якой ужываліся разлік і каханне, здрадніцтва і вера, — жанчына гэтая магла не толькі паліць, але і будаваць гарады.

Як далёка відаць з узвышша! Які кашлаты дыван лясоў, разарваных толькі Дзвіной ды малой Віцьбай. Да самага небасхілу. І толькі у-унь там адна нітачка дыму. І цішыня.

І першы ўдар сякеры аб камель дрэва. І ўпершыню спалоханая сойка заверашчала і рванулася з яго прэч.

Што думаў, што мог прадбачыць у будучых стагоддзях, у шалёным іхнім пажары і дыме гэты не вядомы нам чалавек?

Па-першае, ён ужо ведаў, што назва гораду будзе тая, якой мы завём яго і зараз. Чамусьці амаль заўсёды менавіта маленькія, а не вялікія рэкі даюць назву вялікім гарадам.

Па-другое, ён ведаў, што месца вольнае, адкрытае вятрам, высокае, а значыць, здаровае і бяспечнае і нашчадкам ягоным някепска будзе тут жыць.

Па-трэцяе, ён беспамылкова ведаў, што гораду шырыцца, і расці, і багацець. Таму што тут вялікі ўсходні рачны шлях: Балтыка, Дзвіна, Каспля, Дняпро. А па Дняпры — хочаш у грэкі, а хочаш і на ўсход, у Булгары Волжскія. А колькі сухапутных шляхоў! Увесь свет перад табою, чалавеча. Уцвярдзіся і стой. Давеку.

І ён уцвярдзіўся. І, мабыць, досыць хутка між Віцьбаю, Дзвіною і Ручаём з'явіліся зямлянкі і хаты, а там забялелі і першыя частаколы, якія потым, вельмі хутка, пайшлі расколінамі і пацямнелі пад сонцам, і ветрам, і завеямі, што наляталі з Дзвіны. Тут вось і ўсталі пасля два замкі — Верхні і Ніжні. Але пасля прагны — увесь рух і рост — горад зрабіў крок праз Віцьбу, і там стала Узгор'е, і там стаў гандлёвы цэнтр, і адабраў імя

"места" ад старэйшых сваіх братоў.

А пасля пайшло. Задунаўе, Задзвінне. Паўсюль вырасталі звонкія хаты, млыны, званіцы, склады для сваіх і іншаземных тавараў, закураныя буды. Паўсюль з'яўляліся ў дрымучых пушчах лапікі палёў, дыміліся ляды, звінеў пасля на іх месцы блакітнымі завушніцамі авёс і гразіліся дзідамі жыта і ячмень.

Словам, стаў Горад. А паколькі стаў Горад, то з'явіліся і князі з дружынамі… А з імі разам прыйшло тое, што летапісцы звалі: "і ўста род на род, і племя на племя". І заспявалі па ярах Віцьбы, па гарах Места, па пясках і хвалях Дзвіны мячы. Брачыславы, Ізяславы, Давіды — хто іх там разбярэ з іхнімі сварамі, перадачай гарадоў з рук у рукі і іншым такім.

А горад ведаў: трэба працаваць, нягледзячы на князёў, трэба ўзвышаць адзінае, што яны лічылі сапраўды каштоўным: свой Вітбеск, сваю родную зямлю, цягнуць ніці гандлю ўсё далей на захад — да Любека, Данцыга, Мюнстэра, Брэмена, усё далей на поўдзень — да Кіева і Царграда, усё далей на ўсход — да Масквы, да Суздаля і Уладзіміра і далей, далей…

Трэба, каб па-ранейшаму на віцебскіх прыстанях чуліся галасы іншаземных купцоў, жаўцелі колы воску і залаціўся ў бочках бурштынавы мёд, трапяталі ветразі, іскрыліся пад рукой футры, кашлаціліся аўчыны, пераліваліся індыйскія і арабскія тканіны, звінелі скандынаўскія бронза і срэбра, свяціўся прыбалтыйскі бурштын. Каб было золата і, побач з ім, яшчэ даражэйшая пры патрэбе соль, і нямецкія віны, і галандскія сукны, і імбір, і мігдал немаведама адкуль, і ўсё-ўсё. І каб гучна, як на імшу, перазвоньваліся раніцамі кузні, цягнула гараю з домніц, смярдзела скурамі, дубовай карою, рогам.

Нехта падлічыў на пачатку нашага стагоддзя, што горад плаціў князям у 1-й палове XII стагоддзя ў якасці падаткаў і пошлін да 600.000 рублёў. Сума па тых часах астранамічная…

Беды да часу абыходзілі горад бокам. Татары — блізка не падышлі. Іх сваімі мурамі, сваімі шчытамі, рэкамі крыві адкінулі Крычаў і Слуцк, Бярэсце, Тураў і Крутагор'е. Удалося, праўда, на некаторы час уварвацца ў Віцебск і сесці ў ім Ярдзвілу, сыну Рынгольта, аднак праз некаторы час віцьбічы турнулі яго так, што… Ну ды што казаць: многія ведаюць, як могуць турнуць віцьбічы.

А браць у рукі меч віцьбічам даводзілася часта, бо на доўгія гады горад апынуўся на пярэднім краі, на фарпосце.

Пачалося з Літвы, якая дзе сутычкай, дзе ўмовай, дзе дынастычнымі сувязямі паступова падбіралася да Віцебскага княства. Урэшце, у 1318 годзе Альгерд, ажаніўшыся з адзінай дачкою апошняга віцебскага князя Яраслава Васільевіча, прыняў

веру, што панавала ў горадзе, а праз два гады, пасля смерці цесця, сеў на Віцебскі стол.

Праўда, у горадзе мала што змянілася. Віцебск не на апошнім месцы сярод пятнаццаці самых значных і вялікіх гарадоў княства.

Змянілася, бадай, адно. Горад атрымаў два паясы: адзін каменны, а другі — драўляны.

Каменны, з васьмю вежамі, сярод якіх асабліва моцныя былі Усцянская, Прачысценская і Замкавая, абхапіў Верхні Замак, узнёсся над Дзвіною і Віцьбай, прыўкрасіўся каменнымі ж княжымі палатамі (на жаль, ужо ў XVII ст. ад іх застаўся толькі адзін мур са сходамі). Ніжні Замак быў ахоплены падвойнаю — з засыпкаю з каменю і зямлі — дубовай сцяной. У ёй было пятнаццаць вежаў.

І ганарыста працягнулася праз увесь горад, ад Заручэўскай брамы, паўз каменны цуд Благавешчання (якое Альгерд таксама абнавіў), да каменнай Замкавай брамы і там, раздзяліўшыся на дзве, — да брам Завіцебскай і Задунаўскай, — Вялікая вуліца.

Удзень і ўначы, ад першай чыстай вады і да ледаставу, прыходзілі пад гэтыя муры людзі, стругі і паўстругі, люзы, баркі, бяспалубныя ганчакі, лайбы, барліны, часам да пяцідзесяці метраў даўжынёю. Зімою валілі абозы. А гандаль ішоў круглы год.

Ды час быў суровы, жорсткі і вераломны. Асабліва даставалася гораду ад усобіц.

Пачынаецца, напрыклад, звада Свідрыгайлы. За ім стаяць лівонскія рыцары. Яны бяруць горад, хапаюць намесніка Фёдара Вясну і кідаюць яго з Замкавай вежы ў Дзвіну…

Потым Вітаўт цэлы месяц штурмуе Ніжні замак і, уварваўшыся ў яго, ставіць гарматы ля царквы Благавешчання і ўдзень і ўначы, без хвіліны адпачынку, садзіць па каменных мурах і вежах і па самім Верхнім замку. Узніклі пажары, быў моцна разбіты палац Альгерда.

Горад пераходзіць з рук у рукі…

Ох, як набрыняла зямля твая крывёю, мой Віцебск! Ты — памежная крэпасць, і вечна ля тваіх брам хмары парахавога дыму, крыкі, гігатанне коней і шалёны ломат сталі. Адны прыходзяць і адыходзяць, другія — за імі. А ты застаешся на месцы, ты мусіш стаяць на месцы, часта зусім без ніякай абароны (толькі напаўразнесеныя муры ды сэрцы абаронцаў).

Ты мусіш стаяць.

1516. Па горадзе і пасадах вецер ганяе чорны попел.

1519. Пасады гараць. Людзі пабітыя.

1534. Усё навакольле выпалена.

1536. Замест пасадаў — жар. Людзей цягнуць у палон.

1568. Адбіліся…

І далей, і далей, і далей. І ўжо страшна і сумна пералічваць.

А як перажываць самому? Як бачыць, што вось военачальнікі глядзяць з муроў у даўжэзныя трубы, а там, куды глядзяць, — пыл і крыкі, і яны ані д'ябла не бачаць, а ты ведаеш, што гарыць твой дом, што гэта дакладна ў тым месцы, дзе ён, і гарыць тваё беднае майно, і карова, на якую ледзь узбіліся, і, магчыма, сын, які пагнаў тваю карову пасвіць, і сваякі, і ўвесь твой маленькі свет, які не ты стварыў і не ты насяліў несправядлівасцю і вайной?!

Але ты мусіш. Мусіш біцца да апошняга, а пасля, калі ацалееш, зноў узводзіць дамы, проста жыць, бо ты — гэта і ёсць горад. Ты, а не тыя, з трубамі. А горад мусіць стаяць.

Што толку ў тым, што яму дадуць першы герб: на блакітным полі — галава Спаса, а пад ёю — акрываўлены клінок? Ты занадта добра ведаеш, што гэты акрываўлены клінок можа ўпасці перш за ўсё на тваю шыю, што гэта штодзённы сімвал твайго жыцця. Але ты ганарышся і ім, і сваёй ратушай, і сваёй самай дакладнай "важняй", і сваім вечавым звонам. Ты не ведаеш, што ў цябе лягчэй лёгкага адабраць гэта, але ты ганарышся сваім Магдэбургскім правам.

Бо ты сын гэтага, для цябе найлепшага ў свеце, горада.

Не ты адзін так думаеш. У 1413 годзе саратнік і ўлюбёны вучань Яна Гуса Геронім Пражскі пабывае ў Віцебску. Пазней на працэсе, пасля якога яго спаляць, адным з галоўных абвінавачванняў супраць яго будзе тое, што ён прылюдна заявіў у Віцебску аб тым, што віцьбічы добрыя хрысціяне і добрыя людзі.

І ты не ведаеш, што на цябе насоўваецца яшчэ больш страшная кара. Можа быць, менавіта за тое, што ты любіш волю і што ты харошы чалавек…

Стылае світанне на 12 лістапада 1623 года. Усё вырашана ўжо напярэдадні. Ужо напярэдадні мяшчане пакідалі ў адну купу ўсе шапкі на знак таго, што будуць стаяць, як адна галава. На дапамогу падышлі палачане, вільняне, аршанцы. Нельга цярпець. Бо зачыняюць школы, бо пячатаюць цэрквы і засталіся толькі два буданы, у якіх людзі слухаюць сваё слова: у Заручаўі і ў лесе за Дзвіной. Але падбіраюцца і да іх. І паўсюль абражаюць цябе за тое, што ты — гэта ты. І нават нябожчыка бацьку дазваляюць вывозіць толькі праз тую браму, якой вывозяць "смрад і смецце ўсякае".

І вось калі арцыбіскуп Іосафат (а ты завеш яго "Ізахват" і "Душахват") Кунцэвіч вяртаецца ад ютрані з царквы Успення маці божай (прачыстай), што на Узгорскім пасадзе пры ўпадзенні Віцьбы ў Дзвіну, у свае Віцебскія палаты, што там жа, зусім непадалёк ад царквы, — над горадам гучыць набат і робіцца раптам светла: зашугала полымя.

Мноства народу кінулася да палатаў, збіла шматлікіх служак біскупа, змяла іх, кінулася на чалавека, які ўвасабляў у іхніх вачах усё зло. Яго забілі ўдарам баявой сякеры-гізаўры ў галаву, дастрэлілі з пішчалі, пацягнулі за ногі па горадзе, забілі ягонага сабаку і кінулі на ягоны труп, кінулі з адхона ў Дзвіну, а там рыбакі, наклаўшы яму за вопратку каменняў, павезлі труп і ўтапілі яго ля Пескаваціка.

Віцебск адстаяў гонар цэлага народа. І Віцебск паплаціўся за гэта.

Сто гараджан былі прысуджаны да пакарання смерцю. Галовы зляцелі толькі ў дваццацёх, бо астатнія паспелі ўцячы. Вось імёны страчаных: Навум Воўк і Сымон Неша, Янка Гужнішчаў, які біў у вечавы звон, Грышка Скарута, Гаўрыла Раманавіч, Іярмак Гайдук, Фурса, Шапавалаў сын, Багдан Кузнец, Грышка Бібка, Гаўрыла Пушкар, Ісак Любчын, Іван Аквін, Раман Даніловіч, Фёдар Казак, гаршчэчнік, Фёдар Цацэка, Якаў Шынкар, Сцяпан Труховіч, Пятро Васілевіч Палачанін. Акрамя таго, яшчэ двух абмазалі цамянкай і зрабілі дзве жывыя статуі. Жывыя, вядома, толькі спачатку.

Герб з крывавым клінком выявіўся прарочым. Горад быў аддадзены страшэннаму пагрому…

Чаго толькі не адбывалася з тых часоў! Казакі Пятра І падпалілі яго з усіх бакоў (той выпадак, калі дзейнічаў не дзяржаўны розум цара, а, па словах Пушкіна, "указы, писанные кнутом"). Агнявой лавінай пракаціўся па ім Напалеон.

І ўсё адно знішчаны, здавалася б, горад уставаў, аздабляўся садамі, гудзеў па рацэ параходамі, на сушы — цягнікамі, выцягваўся ў вышыню, прыгажэў будынкамі. Віцебск умеў не толькі пратэставаць, не толькі — пры патрэбе — паўставаць. Віцебск, перш за ўсё, з самага пачатку, умеў працаваць і ствараць. Менавіта ў гэтым была ягоная неадольная сіла. Менавіта таму ніякім каралям, біскупам, царам і фюрарам ніколі не ўдавалася нічога з ім зрабіць.

Нават тады, калі праца была замаскаваным сродкам рабунку.

Ёсць у беларусаў такі не дужа разумны (а можа, і разумны ў вышэйшым сэнсе) звычай: ставіцца да сябе, да сваёй вёскі, да свайго горада з некаторай іроніяй (гэта пакуль той горад не зачэпіць нехта іншы).

Дзед мой, са слоў свайго бацькі, казаў, што калі праз Віцебск была праложана першая чыгунка, то ў першым буфеце на гэтай першай станцыі на ўсіх сталовых прыборах было выгравіравана: "Украдено на станціи Витебскъ".

Ну і няхай сабе не дужа разумна. Але ж затое яшчэ тады, у даўнія часы, горад звязаў сябе сеткаю чыгунак з Рыгай, Арлом, Масквой, Пецярбургам, Кіевам, Брэстам.

І яшчэ тады рукі яго грамадзян умелі плавіць шкло, ліць чыгун, спускаць на ваду параходы і шліфаваць лінзы. Дый ці мала яшчэ чаго?

І, амаль адначасова з гэтым, горад стварыў тое, што маглі сабе дазволіць вельмі нешматлікія гарады: сваю мастацкую школу, якая заняла неаспрэчнае месца не толькі ў гісторыі мастацтва Беларусі. Якія б назвы яна не насіла: "Школа Ю. Пэна", "Народна-мастацкая школа", "Віцебскае мастацкае вучылішча" — школа гэтая была месцам, дзе выкладалі сапраўдныя мастакі і дзе такія ж сапраўдныя мастакі выхоўваліся. І калі гавораць пра ілюстрацыі М. Дабужынскага да "Белых начэй", або пра "Здраўнеўскі цыкл" І. Рэпіна, карціны К. Малевіча або М. Шагала — усім нам трэба памятаць, што гэта не толькі сусветная вядомасць, але гэта яшчэ і Віцебск.

Віцебск 17 кастрычніка 1905 года вывеў на плошчу перад ратушай дваццаць тысяч сваіх грамадзян (загінула ад куль — васемнаццаць). А наступнага дня выйшла на вуліцы ўжо сорак тысяч. І была ўшчэнт разнесена турма і вызвалены палітзняволеныя.

1 сакавіка 1917 года вулкамі і плошчамі Віцебска пракаціласа вестка аб звяржэнні самаўладства.

4 сакавіка бальшавікі правялі сход і стварылі на ім Савет рабочых дэпутатаў і прафесійныя саюзы.

Адначасова (6–7 сакавіка) быў створаны Савет салдацкіх дэпутатаў. Пазней абодва Саветы аб'ядналіся, сталі Саветам рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Калі падыдзеш да дома № 2 па вуліцы Пушкіна, то ўбачыш мемарыяльную дошку, устаноўленую ў памяць аб дзейнасці першага Савета, які ўвёў васьмігадзінны рабочы дзень, шмат зрабіў для паляпшэння становішча самых бедных працоўных, стварыў народную міліцыю і г. д.

У тым жа "доме першага Савета", па Пушкінскай, адбылася (з 1 па 3 кастрычніка) І Віцебская губернская канферэнцыя бальшавікоў. Заслугаю віцебскіх бальшавікоў было тое, што ўсяго праз два дні пасля перамогі ў Петраградзе рэвалюцыя перамагла і ў Віцебску.

Віцебск ляжаў на шляху, які вёў ад стаўкі на Петраград. Стаўка і штаб Заходняга фронту паслалі каля 20 тысяч войска (салдаты і казакі), каб затаптаць у сталіцы агонь рэвалюцыі. За 11 дзён (з 28 кастрычніка па 7 лістапада) віцебскія бальшавікі і чырвонагвардзейцы раззброілі ўсе гэтыя 20 тысяч.

Пачаўся новы этап: грамадзянская вайна, у якой жыхары Віцебска таксама прынялі актыўны ўдзел. На ўсіх франтах. Ад Архангельска да Крыма і ад Варшавы да Уладзівастока.

У чэрвені 1919 года прыбыў у Віцебск з агітацыйным цягніком "Кастрычніцкая рэвалюцыя" М. І. Калінін. Ён выступіў тут на пасяджэнні партыйных, прафсаюзных і заводскіх камітэтаў, на мітынгу воінскіх часцей, перад рабочымі фабрык і заводаў горада, на шматтысячным мітынгу чыгуначнікаў. Радзіма ў небяспецы. Усе — на адпор. Чыгуначны транспарт павінен дзейнічаць бесперабойна. Таму што рабочыя галадаюць, таму што ў арміі цяжка з ежай, таму што гарады і прамысловасць замярзаюць, паміраюць без паліва.

Ужо 14 чэрвеня прыйшлі і сталі пад ружжо першыя шэсцьсот жыхароў Віцебска.

Скончылася перамогаю вайна. Паўсюль яшчэ віраваў бандытызм, успыхвалі сям-там мяцяжы. Але самым страшным ворагам была разруха, амаль поўнасцю знішчаная гаспадарка, мёртвыя заводы, іржавыя рэйкі чыгунак. Віцебск у гэтым сэнсе не быў выключэннем. Невядома было нават, з чаго пачынаць, з якога канца прыступіцца. Але горад, як і ўся краіна, хацеў хутчэй забыць старое, цягнуўся да ведаў і працы, да новага.

Горад пачаў з асветы. 1 кастрычніка 1918 года адкрыліся дзверы педагагічнага інстытута. Новаму грамадству перш за ўсё быў патрэбны новы, адукаваны чалавек.

Рукамі гараджан, іх працаю горад і яго прамысловасць паступова пачалі ажываць. Зацеплілася, слабое пакуль яшчэ, жыццё на старых, дробных прадпрыемствах (на базе многіх з іх выраслі пазней такія буйныя станкабудаўнічыя заводы, як імя Кірава і "Камінтэрн"). У гады першых пяцігодак былі пабудаваны швейная фабрыка "Сцяг індустрыялізацыі" (уведзена ў строй 7 лістапада 1930 года) і панчошна-трыкатажная фабрыка "КІМ" (будавала яе моладзь у 1929 — 31 гадах).

Віцебск прыўкрасіўся новымі будынкамі. Людзі тых гадоў памятаюць, як ганарыўся горад дамамі-камунамі на цяперашніх вуліцах Суворава і Горкага, домам спецыялістаў, новай трамвайнай сеткай, новым вадаправодам. І як ганарліва задзіраліся віцебскія насы з кожным новым інстытутам ("як жа, наш!") — ветэрынарным (1924), медыцынскім (1934). А тэхнікумаў і не злічыць: палітэхнічны, фінансава-эканамічны, сельскагаспадарчы, кааператыўны, ветэрынарны, швейнатэкстыльны. І мастацкае, музычнае, педагагічнае вучылішчы. І сорак тры школы, не лічачы фармацэўтычнай, школы медсясцёр, школы лабарантаў, школы фельчарска-акушэрскай.

У горадзе, як і паўсюль, чынілася другая рэвалюцыя, не менш важная за першую: рэвалюцыя духу, псіхікі, культуры. Людзі думалі не толькі пра хлеб і сталь, а і пра яе, культуру — часта

раней, чым пра хлеб, — і гэта, між іншым, сведчыць на іх карысць.

Чэрвень 1919 — ратуша аддадзена краязнаўчаму і мастацкаму музею. Зараз ён — адзін з лепшых у рэспубліцы.

21 лістапада 1926 года — упершыню ўзнеслася заслона Другога Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра. Не заўсёды другога па якасці пастановак і таленту акцёраў. Часта — першага.

Свае літаратары. І, сапраўды, першая і лепшая мастацкая школа…

Пасля пачаўся час выпрабаванняў, пакут і смерці, час барацьбы не на жыццё, а на смерць.

11 ліпеня 1941 года немцы ўварваліся ў Віцебск. Запанавала тое, што пастрашней за самую лютую і задушлівую ноч: фашысцкі "орднунг". На цэлыя тры гады.

Не яны, вядома, выдумалі каменданцкую гадзіну і расстрэл за яе парушэнне. Але вось расстрэл за тое, што ходзіш каля чыгункі або выйшаў у лес назбіраць грыбоў, прэвентыўны расстрэл, або расстрэл заложнікаў, - гэта ўжо выдумалі яны. Пойма Віцьбы за педінстытутам, Ілаўскі і Духаўскі яры, — паўсюль штабелі або проста завалы трупаў, скупа засыпаных зямлёй. І лагер смерці ў пасёлку Лучоса. І гета ў раёне клуба металістаў.

Падвалы СД па вуліцы Політэхнічнай, залітыя крывёю. Шыбеніцы перад ратушай, і на Смаленскім рынку, і ледзь не паўсюль. Амаль 110 тысяч забітых, закатаваных.

І аднак увесь час у Віцебску жыло, дзейнічала, змагалася падполле. Шмат груп. З ліпеня 1941 — група А. Я. Белахвосцікава; з лета 1941 — група М. Я. Нагібава; з вясны 1942 — групы І. А. Бекішава, В. М. Арлоўскага, М. А. Журынскай, В. С. Кулагінай, А. А. Сакаловай; з верасня 1942 года — група А. С. Вінаградавай. На пачатку лета 1943 года ў Віцебску было больш за 60 падпольных груп. А калі ў красавіку 1943 года быў створаны Віцебскі падпольны гарком партыі на чале з В. Р. Кудзінавым — пачалося стварэнне адзінага нелегальнага цэнтра кіраўніцтва падполлем горада.

Агітацыя, праўдзівае інфармаванне людзей аб тым, якімі шляхамі ідзе барацьба, збор зброі і медыкаментаў, дыверсіі і сабатаж на прамысловых і ваенных аб'ектах, вярбоўка надзейных людзей для лесу і для падполля, тэрарыстычныя акты супраць найбольш заядлых і азвярэлых прадстаўнікоў адміністрацыі захопнікаў і іхніх прыспешнікаў — гэта рабілі падпольшчыкі.

У Віцебску загінула Вера Харужая са сваёй групай. Тут загінуў у бітве, якая часта бывала няроўнай, кожны трэці падпольшчык…

У ноч на 26 ліпеня 1944 года войскі І-га Прыбалтыйскага фронту (генерал арміі І. Х. Баграмян) і 3-га Беларускага (генерал-

палкоўнік І. Д. Чарняхоўскі) распачалі нечуваны па ўпартасці штурм горада і раніцаю вызвалілі яго.

Мёртвы горад. Сустрэць сваіх пашчасціла ста васемнаццаці жыхарам.

Бадай што лягчэй было будаваць горад на новым месцы, пакінуўшы горы бітай цэглы, жвіру і попелу, парослыя бур'янам і пустазеллем. Але хто б сказаў гэта ўцалелым яго жыхарам, якія паступова сцякаліся на папялішчы? Хіба той, хто ніколі іх не ведаў. Не ведаў іх характару, іхняй упартасці, іхняй працаздольнасці, іх жадання бачыць свой горад зноў жывым, яшчэ лепшым.

Такім, якім мы бачым яго сёння.

270 тысяч чалавек. Трэць усёй прамысловай прадукцыі вобласці. Дываны ягоныя пабывалі на міжнародных кірмашах і выстаўках у Балгарыі, Бразіліі, Венгрыі, Галандыі, Інданезіі, Італіі, Сірыі, Турцыі, Швецыі і ў шматлікіх іншых краінах. Высокадакладныя зубаапрацоўчыя станкі, зробленыя віцяблянамі, купляюць у нас Бразілія, Балгарыя, Мексіка, Іран, Алжыр і іншыя дзяржавы. Трыццаць краін свету купляюць станкі завода заточных станкоў імя XXII з'езда КПСС.

Радыё- і гадзіннікавыя дэталі, электравымяральныя прыборы. Апрацоўка дрэва і харчовая прамысловасць.

Шматлікія інстытуты, тэхнікумы, школы, бібліятэкі, кінатэатры і музеі, дзяржаўны драматычны і два народныя тэатры.

Не толькі горад магутных, усё здольных зрабіць рук, але і горад высокага інтэлекту, ведаў, таленту.

Горад новых прыгожых будынкаў. І горад выключных людзей, якія не толькі ўмелі трымаць у руках зброю пад час рэвалюцый і войнаў, але і ўмелі працаваць і адраджаць з руін свой вечны, старажытны горад на сіняй Дзвіне.

…І вось я блукаю па вуліцах сучаснага горада. Іду пад ягонымі каланадамі, выходжу на зялёныя рачныя адхоны.

Мне крыху шкада яго, старога, шкада ягоных вулачак — ну дакладна, як на карцінах мастакоў старой і цудоўнай Віцебскай школы. Шкада нават рамізнікаў, хаця я разумею, што гэта несусветнае глупства. Шкада — і гэта ўжо не глупства, — што недастатковая ўвага да камянёў, што памятаюць Неўскага.

Але бачу я твары людзей, іхнія ўсмешкі, іхнюю павагу да цябе, людзей, якія раскажуць аб сённяшнім дні горада лепей за мяне, і я разумею, што галоўнае — засталося. Людзі. Пакуль яны ёсць — горад будзе. Гэта словы паўстанцаў 1623, да якіх нічога не прыбавіш: "Нельга зрабіць так, каб у Віцебску не было Віцебска".

Хай нашы далёкія пранашчадкі памятаюць, што мы, не

ведаючы, любілі іх, што нашы думкі, уздыхі і словы лунаюць вулкамі і гэтага вялікага, прыўкраснага горада, што і нашы рукі крыху дапамаглі яму зрабіцца такім, што нашы сэрцы ўсё яшчэ грукочуць ва ўнісон з іхнімі сэрцамі і сэрцам горада, што праз нашых прашчураў і наш прах змяшаўся з віцебскай зямлёй, і яе стала крыху болей.

Што яны — гэта крыху і мы, што мы — з імі, што і мы адваявалі для іх гэты вялікі і вечны горад, якому стаяць не тысячы гадоў, а тысячы стагоддзяў.

Гэта нічога, што мы калісь пойдзем, Віцебск. Мы — сыны твае. І ты, колькі б ты ні пражыў, - гэта мы.

Абраная

"Смерць і жона ад бога суджона".

"Суджанай ды каханай і на крывых аглоблях не аб'едзеш".

…Фаталізм? Ды не, фаталізм — рэч малапачцівая. І народ, які прыдумаў гэтыя дзве прыказкі і да якога я маю гонар належаць, аніякі не фаталіст. Проста калі ўжо нешта здарылася, нам цяжка ўявіць, што гэта магло б адбыцца неяк іначай, і мы схільныя ва ўсім вінаваціць лёс: "бач ты, меўся ўтапіцца, а трапіў на шыбеніцу", "і ўсё ж яго да Мар'і вяло, а тут крутанулася жыццё — і ён з Наталяй. Лёс".

І каб наадварот здарылася — таксама быў бы лёс. І ў абодвух выпадках памяць падсоўвала б тысячы фактаў з жыцця, якія б неабвержна сведчылі, што павінна было здарыцца якраз так, а не іначай.

Дзядзька мой быў досыць буйным дзеячам асветы на непісьменнай тады Камчатцы, і таму дом наш быў повен, між іншым, малюнкаў, фатаграфій, кніг аб ёй, паробкаў з маржовай косці. Каб мяне занесла туды (а хацеў!) — усё гэта таксама было б наканаванне, лёс, праройства аб будучым. Памяць на такія рэчы паслужлівая.

І тая самая памяць падсоўвае паслужліва сотні сведчанняў аб тым, што лёс мой павінен быў пайсці іншай сцяжынай. Нібы сотні ўражанняў, сустрэч, выпадкаў штурхалі мяне якраз туды, на Украіну.

На Украіну.

…А можа, і сапраўды лёс? Як ні хочаце, а ёсць тысячы дробных здарэнняў, якія, спалучаючыся, бяруць вас за руку і ўладна вядуць у той бок, у які вы на хвіліну перад гэтым і не думалі ісці.

Дзедаў дом у Рагачове і бацькаў у Оршы (апошні, не той, дзе я нарадзіўся, а той, што згарэў у вайну) былі ля Дняпра. Агульнага — рускага, беларускага і ўкраінскага. Нашага. Бацькаў дык увогуле стаяў над самай стромай, аддзелены ад ракі садам і стогадовымі ялінамі. І вада маёй ракі сплывала і сплывала туды, на Украіну, разам з нашымі песнямі. А адтуль плылі іхнія песні. Траплялiся і рэчы адтуль. Памятаю, напрыклад, у дзедавай хаце доўгі вышываны ручнік. На адным канцы ягоным казачка праводзіла казака ў паход і быў надпіс, якога я не помню. І чаканне яе было бясконцае, як той ручнік, бо на другім канцы той самы казак вяртаўся ўжо стары і быў вышыты надпіс: "А оце мій Грицю іде". Дзіва, але ручнік гэты перажыў і дзеда і вайну, толькі

вышыванне выцвіла і надпісы ўжо амаль не чыталіся.

І яшчэ ў кніжных шафах бацькоў і дзеда, акрамя мноства кніг беларускіх, рускіх, польскіх і французскіх (збольшага, відаць, "раманаў" не з лепшых, бо і адкуль было трапіць лепшым у беларускую глуш?), шмат было і ўкраінскіх кніг, пераважна дарэвалюцыйных. Дзед, які іранізаваў з усяго, у тым ліку і са свайго паходжання, купляў аднак усе беларускія і ўкраінскія кнігі, якія толькі траплялі да рук. Купляў з прынцыпу, нават калі на працягу многіх старонак у кнізе толькі і рабілася, што плакала нейкая небарака Катруся.

Таму Шаўчэнку і Лесю Украінку (многае на памяць) ведаю яшчэ з самых малых год. А ўжо студэнтам, чытаючы, напрыклад, "Чорну раду", "Народні аповідання Марка Вовчка" або "Захара Беркута", я пераконваўся, што ўсё гэта чытаў раней, не памятаючы, вядома, аўтараў. Чытанне, як бачыце, не адпавядала ўзросту, але не прынесла, па-мойму, ніякай шкоды, бо сапраўдныя пісьменнікі ніколі не пісалі такіх "дарослых" кніг, якія сорамна было б даць дзіцяці.

Так званы "лёс" заўсёды вяршыцца праз сустрэчу і іначай не можа. З многіх сустрэч адна становіцца самай вагомай, і выпадковасць ператвараецца ў заканамернасць, і вось ёсць два чалавекі і ёсць ты, трэці, і ёсць месца, дзе суджана было табе нарадзіцца і якое робіцца самым значным і вялікім, што дадзена табе ў жыцці.

Радзімай. Вадой і хлебам, без якіх чалавек памірае. Болей таго, паветрам, без якога не пражывеш і пяці хвілін.

Адзіная зададзенасць — Радзіма, Бацькі, Родны Кут. Астатняе — тое, што прыходзіць, той пясок, што наносіць на перакат рака твайго жыцця. Астатняе, у значнай ступені, справа выпадковасці. Сустрэча з жанчынай, без якой чалавек не можа мысліць свайго жыцця, сустрэча з зямлёй, што робіцца табе дарагая, амаль як свая. Другая пасля Маці. Другая пасля Радзімы. І абедзве неабходны. І абедзве прыходзяць праз сустрэчу. Сустрэча магла не адбыцца. А значыць, і любові не было б. І таму дзякуй лёсу, які тую сустрэчу зрабіў.

Вось пра гэтую другую любоў я і раскажу. Без гучных слоў.

Я хачу прывесці некалькі звычайных выпадкаў са звычайнага жыцця, якія, магчыма, скажуць больш пра наша братэрства, чым усе оды на зямлі.

Упершыню тварам у твар сутыкнула мяне з Украінай вайна, зноў жа выпадковасць. Бацька вызваўся ехаць з Чкалава на Беларусь адразу ж, як толькі былі вызваленыя два маленькія лапічкі яе тэрыторыі (гэтыя лапічкі быў дом, свая зямля, няхай сабе пад абстрэлам). У гэты час ехаў з Далёкага Усходу мой

дзядзька, прызначаны начальнікам штаба чыгуначных войск Першага Беларускага фронту, і ўзяў мяне і маці з сабой, пасяліў у Кіеве. Цяжка цяпер сабе ўявіць, як імкнуліся людзі ў небяспеку і разбурэнні, абы толькі быць бліжэй да дому, няхай сабе яшчэ і захопленага ворагам.

Украінскія хаты паўсталі ўпершыню перад маімі вачыма не бялюткімі (такіх было мала, там, дзе людзі вярнуліся, і там, дзе ў іх ужо крыху даходзілі да гэтага рукі), а рабымі, нават сям-там чорнымі ад куродыму і агню. І гэтае відовішча чорных украінскіх хат, такое ж ненармальнае і ненатуральнае, як нявеста ў глыбокай жалобе, запомнілася мне назаўсёды і назаўсёды шчыміць. І, паверце мне, пірамідальная таполя, якая аджывае ад агню, выпусціўшы першы зялёны парастак, такі слабенькі, выклікае ў сэрцы пачуццё такога самага жалю і смутку і палёгкі, як першы парастак, які выгнаў для жыцця абсмалены беларускі дуб.

Горад быў ціхі, амаль бязлюдны. Горад прачнуўся ад страшнага сну. Вонкава цэлы, ён толькі пры набліжэнні да Крашчаціка адкрываў воку сваё знявечанае, абвугленае, узарванае, прастрэленае сэрца. Чалавек з прастрэленым сэрцам памірае. Горад і краіна не паміраюць, пакуль б'ецца сэрца хоць аднаго іхняга сына і дачкі.

Было цяжка і не дужа сыта, і ўсё ж у гэтых руінах быў вялікі аптымізм і вялікае абяцанне шчасця і для тваёй Беларусі, бо гэта была ўжо свая зямля, і твая Беларусь, пакуль што здратаваная і загнаная пад зямлю, павінны была ўжо вось-вось таксама зрабіцца сваёй. Хоць яшчэ мора крыві і роспачы трэба было перайсці, каб назваць яе сапраўды сваёй.

Ногі мае і тады і пасля насілі мяне па ўсім горадзе і асабліва часта заносілі туды, дзе гісторыкі, археолагі пачыналі расчышчаць, аднаўляць, капаць. Які нюх у мяне быў на гэта. Я ведаў, хто, дзе, калі і што робіць, і прыставаў да гэтых людзей, як смала. Часцей за ўсё з голага энтузіязму. І так вось праз раскопы і расчысткі, праз задуменныя каштаны на Сафійскім падвор'і, праз друз Успенскага сабора, праз кашлатыя арэхі ля Спаса на Берастове і глухую лагчыну Выдубецкага манастыра я паступова адчуваў галоўнае — прыналежнасць да Вялікай Гісторыі Славян. Уваходзіў у галоўную справу майго жыцця: асэнсаванне нас, сённяшніх, асэнсаванне таго, хто мы ёсць сёння і куды мы ідзём, праз асэнсаванне нашага ўчора.

Хто хоча ведаць, як там, у Кіеве, калі яшчэ ішла вайна, нараджаўся чалавек і як ён толькі дзівам не загінуў на парозе нараджэння, хай прачытае маю аповесць "Лісце каштанаў". Гэта адна з нешматлікіх маіх рэчаў, якія на дзевяноста пяць працэнтаў

— праўда, да дробных рэалій, якія могуць засведчыць усе кіяўляне, што былі ў той час у горадзе.

Праўда аж да шыльдаў, аж да закладзенага цяпер пад'езда, аж да аднавокага бандурыста, аж да двара дамоў нумар 48–50 па вуліцы Леніна, дзе жартавала, геройствавала, спаборнічала ў высакароднасці наша мушкецёрскае войска, аж да таго, што я мог там памерці… Ну так, некалькі разоў мог. Адзін ці два разы ў вайну. А яшчэ раз студэнтам, калі мяне напярэдадні стыпендыі высадзілі з трамвая, а той пайшоў па схіле ўніз і разбіўся. Некалькі вось такіх дзіўных выхадак лёсу, пасля кожнай з якіх я мог зрабіцца ўкраінскай зямлёй, як калі-небудзь — аднаго хачу — зрабіцца зямлёй беларускай.

Сяброўства, небяспека, намёк на абуджэнне сэрца і намёк на будучы шлях — вось колькі ўсяго шчодра адваліла мне Украіна.

Няма чаго здзіўляцца, што ўспаміны аб вайне, сябрах, успаміны аб тым, як нарадзілася пачуццё прыналежнасці да мінулага, дзіўнае адчуванне, што ты жывеш усярэдзіне яго, прывялі мяне, калі прыйшоў час, зноў на Украіну, у Кіеўскі універсітэт. І я, відаць, не дужа памыліўся, прадчуваючы, што менавіта там мне ўдасца лепей зразумець мінулае ўсходнеславянскіх народаў, чым яно ў кожнага народа падобнае і чым адметнае. Там былі лепей упарадкаваныя бібліятэкі (асабліва аддзелы рэдкіх кніг і рукапісаў) і архівы. Акрамя таго, там ніхто не здзіўляўся, што я чытаю, напрыклад, Максіма Гарэцкага (быў 1949 год), літаратуру аб паўстанні 1863–1864 гадоў або, скажам, справу забойцы Лермантава М. С. Мартынава (ён сядзеў тры месяцы на гаўптвахце ў Кіеўскай крэпасці і ў Кіеве ж павінен быў адбываць царкоўнае пакаянне). Або разнастайныя старадрукі ці перыёдыку 20-х гадоў. Гэта прыводзіла часам да дзіўных вывадаў. Да таго, скажам, што я здзіўляўся, чаму паўстанне Каліноўскага называюць сялянскім, калі яно было — статыстыка! — разначынна-шляхецка-сялянскім. Калі пазней гэты погляд — падзякуем Г. В. Кісялёву — стаў агульным, я ўспрыняў яго з радасцю, як заўсёды з радасцю ўспрымаем такую падзею, калі розум і вернасць ісціне бяруць верх над прадузятай думкай.

І такіх адкрыццяў было шмат. На жаль, я працаваў без усякай сістэмы, не выпісваў часам імя вучонага, назвы твора, адкуль дакумент і г. д., так што цяпер часам і не помню, адкуль браў тое ці іншае. Нічога, для літаратуры гэта не так важна — спасылка на крыніцу. Пасля яе знойдзе гісторык-архівіст, пацвердзіць, што напісанае недзе дакументальна абгрунтавана, што ты не адступіў ад праўды.

Чырвоны корпус універсітэта (старая, яшчэ царскіх часоў, бунтарская чырвань — легенда казала, што так пафарбавалі

будынак пасля студэнцкіх хваляванняў — настойліва лезла праз менш якасную новую), маладзенькія пірамідальныя таполі перад порцікам (цяпер яны засланілі ўвесь фасад, ды і ўвогуле зеляніна кіеўская разраслася так неўтаймавана, што схавала ад вачэй маіх абліччы многіх родных дамоў, і я не пазнаю іх у твар, а куткі, дзе я ведаў кожны камень, здаюцца мне чужымі), доўгая магіла кітафінвала на універсітэцкіх задворках (першая кітабойная флатылія падарыла яго універсітэту), а побач, між "кітовым капцом" і акадэмічнай бібліятэкай, у татарніках, чамусьці вялізная конная статуя Суворава: кліча ў паход на бібліятэчны мур.

Залы акадэмічнай бібліятэкі, ад строгай вялікай і да ўтульнай малой залы мастацкай літаратуры, дзе на стале ў яблычна-аранжавай, крыху спляшчанай зверху і знізу вазе стаялі нейкія барвяна-індзейскія галіны з лісцямі (за вокнамі даўно снягі, а тут была восень і яе лёгкі, празрысты настрой)…

Кнігі… Старыя, пульхныя, у скураных адзеннях, чорных і рыжых, з валікамі на карэньчыках, сухая сітаватасць паперы XVIII стагоддзя, альманахі часоў Міцкевіча і Пушкіна, "Жалейка", прыжыццёвыя выданні Лесі Украінкі, "Матчын дар" (па вонкавым выглядзе кнігі адточанае вока можа меркаваць пра эпоху, у якую яна выйшла, часам не менш, чым па яе змесце). Кнігі, залашчаныя сотнямі рук, і кнігі (часта не менш цікавыя), якія за сто год не разрэзала нічыя рука, і тады ты першаадкрывальнік.

І — некалькі разоў — ледзь не выключэнне з універсітэта за тое, што я не хаджу на многія лекцыі, а замест гэтага прападаю ў бібліятэцы.

Неяк абыходзілася, і я зноў браўся за сваё. Ого! Стаў бы я замест скарбаў, якіх я так даўно чакаў і да якіх урэшце дарваўся па спецыяльнай просьбе акадэміка А. І. Бялецкага (першыя тры, здаецца, курсы ў "тайнае тайных" не пускалі), стаў бы я замест гэтай любоўнай, п'янай асалоды хадзіць на лекцыі і ў соты раз слухаць тое, што ўжо даўно ведаю і што мне даўно ўжо абрыдла!

Украіна пасадзіла мяне за раскошны банкетны стол — яна знайшла мне і настаўнікаў, якія ненавязліва, часта канфідэнцыяльна, з павагай "толькі рэкамендавалі і раілі, калі гэта мне падыдзе", які келіх піць з гэтага разліўнога мора ідэй і тэорый. Звярталі ўвагу на тое, які іранічны парадокс варты цэлай сістэмы, і якая дужа сур'ёзная кніга, высока ацэненая тым і тым, вартая прачытання толькі каб ведаць яе, не паступаць так, як раіць яна, і, калі нехта ўжыве яе як зброю, мець супраць яе надзейны шчыт: ведаць на тры метры пад аўтарам, чаго ён хацеў і чаго дабіваўся.

Гэта быў асцярожна-іранічны і пры гэтым надзіва адкрыты і шчыры А. І. Бялецкі, непрыкметны, а між тым шырокі эрудыт А. А.

Назарэўскі, сівы С. І. Маслаў. І прафесар Шамрай (на жаль, рана пайшоў) з яго сарказмам. І паэт Рыльскі, заўсёды паглыблены ў сябе. І "святейшая" наша Л. А. Панамарэнка…

Украіна, Кіеў — гэта былі не толькі кнігі і архівы, не толькі лепшыя з настаўнікаў, якія разам са мной узважвалі меру дабрыні і зла, гэта былі археалагічныя раскопы, дзе я працаваў, музеі, опера і сімфанічныя канцэрты. Тады з вясны да восені чалавек з малымі грашыма (а адкуль яны ў студэнта?) мог праслухаць усю сімфанічную класіку бясплатна з эстрады ў парку над Дняпром.

Лёс зводзіў мяне з многімі людзьмі мастацтва, ды так, што абставіны знаёмства маглі б здацца нейкай містыкай і хто-ніхто з крытыкаў абавязкова кінуў бы свой дзяжурны сказ: "Караткевіч выдумае, а пасля сам жа ў гэта і паверыць". Па-першае, гэта не абраза: значыцца, выдумана дыхтоўна, з шырынёй і фантазіяй, так, што не толькі чытач хочаш не хочаш, а паверыць, але, з цягам часу, і сам аўтар. А па-другое, можна, вядома, правесці дні 8–9 студзеня гэтага года так: пайсці на працу (ці працаваць дома), пасля на пасяджэнне (сход, праўленне ці што там яшчэ), паглядзець тэлевізар (пачытаць кнігу), легчы спаць, паўтарыць тое самае на наступны дзень і вечарам пайсці ў госці. Гэта лічылася б нормай. Але такая норма, такі жыццёвы рэалізм не па мне. Па мне — паехаць у гэты дзень у Мсціслаў, дарогаю (пры трыццаці градусах марозу) трапіць у буран, калі снег ад зямлі да неба, блукаць, бо за метр ужо не відаць нічога, некалькі разоў думаць, што ўжо — канец (тым больш што праз нябачныя шчыліны ў машыну насейвае снег, а матор глухне, мабыць, у Беразіно заправілі бензінам з вадой), выбіцца ўрэшце на аўтакалону, што таксама засела, капаць, выцягваць і вылезці-такі ў дзве гадзіны ночы з дапамогай бульдозераў. А назаўтра, ідучы Мсціславам, бачыць у лютым марозным небе каляровую і вялізную, на палову неба, вясёлку. І ноччу пабачыць яшчэ, як памірае поўня пад час месячнага зацьмення.

Вось гэта сапраўдны рэалізм. Мой. Бо іначай жыць, іначай пісаць я не магу.

…Але досыць пра крытыкаў. Вернемся да нашай тэмы.

Дык вось, не памятаю ўжо, на якім курсе было, падыходзіць да мяне ў зале акадэмічнай бібліятэкі мілая жанчына і шэптам просіць выйсці, а ў калідоры тлумачыць, што яна біёлаг ці псіхолаг (не памятаю), піша навуковую працу аб стамляльнасці і, паколькі з прысутных у залах я працую больш за ўсіх, мэтанакіравана і ўтрапёна, то ці не згаджуся я ёй дапамагчы. Я згадзіўся.

І вось да таго як засяду за кнігі, у сярэдзіне дня і пасля працы я іду ў маленькі пакойчык, вызвалены для яе машын, там мне

надзяваюць на галаву марсіянскі шлем, наклейваюць на павекі розныя датчыкі, дзьмухаюць у вока струменьчыкам паветра, а на экране ў гэты час скачуць зайчыкі рознай формы, даюць рашаць пад секундамер розныя тэсты, а пасля выкладваюць яшчэ пятнаццаць рублёў. Не чакаючы, што такое цікавае мне прапануюць яшчэ і за грошы, я стаў адмаўляцца, але ўгаварылі. Час быў для мяне вельмі скрутны, і з гэтымі грашыма я мог працаваць тут, а не хадзіць разгружаць вагоны.

Працавала тая жанчына ўсю зіму. І вось, здаецца праз год, неяк у вясну, студэнты задумалі запрасіць на выступленне Барыса Раманавіча Гмыру, тады ўжо народнага артыста. На чале дэлегацыі дзяўчат накіравалі мяне (лічылася, што калі я захачу і калі гэтага дужа патрабуе справа, я магу "прывесці ў выгляд, зручны для лагарыфмавання, самага складанага і цяжкага чалавека, абы разумны быў").

Пазваніў… Адчыніла мне дзверы… тая самая мілая кабетка з бібліятэкі. Абое мы разгубіліся: я падумаў, што памыліўся дзвярыма, яна… не ведаю, што падумала яна, ды яшчэ ўбачыўшы мяне з такім эскортам.

Выявілася, што гэта жонка Барыса Раманавіча (добра, што я не задаў пытання накшталт: "А вы як тут?"). І ўжо як яна пасля ні ўгаворвала выступіць, на жаль, было нельга: Гмыра напярэдадні пайшоў у адпачынак і даў сабе волю: з'еў сем порцый марожанага. Але канцэрт быў. Гэты дзядзька з-пад Харкава, даведаўшыся, што я беларус, сказаў, што ў яго нехта з бацькоў (ці дзядоў, не помню) таксама з Беларусі, і ўсю рэштку дня да ночы мы спявалі беларускія народныя песні, якія ён памятаў. Не думаю, што ён сказаў пра продка беларуса з ветлівасці, бо песні ён ведаў сапраўды глыбінныя, неапрацаваныя, якія і цяпер спяваюць пад Туравам або Рагачовам ці Астраўцом.

…І, вядома, сябры, з якімі вучыўся. З усіх факультэтаў і "відділов", у прыватнасці з украінскага. Чытаеш цяпер кнігі, бачыш: "укладальнік такі", "прадмова такога", "пераклад з іспанскай і каментарый таго і таго", а сам успамінаеш, як жылі ў адным калідоры, па суседству, як здабывалі на хлеб, як разам спявалі, як вырашалі сусветныя праблемы, як зацята спрачаліся аб паэзіі, праўдзе, любові да радзімы і проста любові, і зноў, і зноў аб паэзіі.

Многія з нас не ведалі, што іншыя пішуць вершы, многія нікому і не адкрываліся ў гэтым, так што даведваліся мы аб гэтым куды пазней. Але над нашымі галовамі лунала Маці-Паэзія, і з ёю нам чорт быў не брат.

Можаце здзівіцца, але са мною ў адным пакоі жыло, як пазней выявілася, — аж пяць, здаецца, вядомых цяпер паэтаў. А колькі іх

было ў суседніх пакоях, на іншых курсах!

Адкуль я мог ведаць, што вось гэты іранічны хлопец (як рана ён пайшоў ад нас!) — бліскуча таленавіты паэт Васіль Сіманенка. Адкуль я мог ведаць, што вось той, за ложак-другі ад мяне, белазубы і русявы юнак, які ўсміхаецца, трасе чупрынаю і запрашае ўсіх да сябе пад Бравары "копацьця в ставку, бо краще нема", — што гэта будучы паэт Мікола Сом. І што паэт — вось гэты крыху замаруджаны Толька Шаўчэнка. І што флегматычны Толька Маскаленка, і Васіль Дзідзенка, дзівак з дзівакоў, і Тамара Каламіец, перад якой самыя грубіяны трымалі сябе як выхаваныя лорды, і Барыс Алейнік, і дзесяткі іншых, што яны — сабраты, паплечнікі, паэты.

А каб вас бог любіў. Гэта для іншых яны — сузор'е. А для мяне яны — хатнія, з якімі мы дзяліліся хлебам і салам, калі было, і пра якіх мне няма чаго казаць гучныя словы.

…А пасля было настаўніцтва ў глыбінным украінскім сяле (тады нават без электрычнасці), у Лесавічах пад Тарашчай, дзе я зведаў, чым дыхае самая глыбінная частка гэтага народа. Жыў з сялянамі, смяяўся і перажываў з імі, працаваў, святкаваў у гадавым кругазвароце ўсе вясковыя святы.

Да прыроды мне там прывыкаць не прывялося. Каб не беленькія хаткі і не перавага лістоўных дрэў, то дужа лёгка і проста было ўявіць сябе недзе на старой дарозе паміж Навагрудкам і Любчай. А каб гэтыя лістоўныя дрэвы нам, то гэта былі б проста нейкія там лясістыя грывы пад Лагойскам ці Оршай.

Карыта паміж узгоркамі — пойма рачулкі, не, ручая Катлуй, ператвораная грэблямі ў некалькі ставоў, а вакол вербы, і сады, і хатнія стрэхі. Вёска была доўгая-доўгая між гэтых узгоркаў і над ставамі, і настолькі маляўнічая, што менавіта яе калісь выбралі для здымкаў фільма "Воўчыя сцежкі". Я гэтага фільма не бачыў, але жыхары памяталі: як жа, такая падзея.

Усё там у мяне было: старая земская школа, дрымучы, белы ад квецені сад каля яе, бакоўка і ў ёй газавая лямпа або свечка, дрыготка радасці ад прадчування будучыні, вершы, якія аж сплывалі з пяра і якія я ўрэшце (пасля дзесяці год пісаніны) адважыўся аддаць у друк, украінскія песні — сапраўдныя даўнія і горкія песні і думы.

І мова іхняя там адкрылася мне, як жывы струмень. І я гаварыў ёю, як яны. І спяваў на радзінах, і тужыў на радаўніцу на могілках, а вакол была мяккая зямля і неба нясмела-блакітнае над векавымі, бялютка пабеленымі чарэшнямі.

І тут была Гісторыя. Ды яшчэ якая! Блукаючы з кіем па бясконцых дарогах, я сустракаўся з ёю на кожным кроку. Вось Выблаў лес і не так далёка Умань, і зусім побач Лысянка, дзе

нарадзіўся Міхайла Хмель, бацька Багдана Хмяльніцкага, і дзе Максім Жалязняк учыніў з гайдамакамі разню ў 1768 годзе. І там, на дарозе, я зразумеў, што трэба бараніць свой народ, калі яму скрутна, але калі твой народ не мае рацыі — набярыся смеласці і скажы яму аб гэтым, як мелі мужнасць сказаць такое Шаўчэнка і Талстой. Набярыся мужнасці сказаць яму гэта, нават калі ты ў гэтым сваім учынку адзіны, як перст.

…Але там была не толькі гісторыя. Там была будучыня, былі дзеці, такія самыя цудоўныя на Украіне, як і паўсюль, і я аддаваў ім усяго сябе. І цяпер часам шкадую, што кінуў іх і гэтую працу, бо ўнутрана прызнаюся, што настаўнік з мяне быў сапраўдны.

Адзінае, чым магу ганарыцца, — выйшлі з іх людзі: інжынеры, земляробы, настаўнікі, лекары. Паэтаў не атрымалася, ды яно можа і лепей, лягчэй жыць. Але што кожны з іх любіць літаратуру — за гэта паручуся. І, як памяць аб настаўніцтве, я напісаў для дзяцей іхніх дзяцей кнігу пра Беларусь — "Зямля пад белымі крыламі". Яна і была напісана для ўкраінскіх дзяцей (паспрабаваў сплаціць частку доўгу, бо яны ж, гэтыя дзеці, таксама вельмі многаму мяне навучылі), выдадзена на Украіне, і толькі пасля выйшла на Беларусі, для дзяцей беларускіх.

Лёс часам падкідае розным людзям і ў розныя часы амаль зусім аднолькавыя выпадкі і сітуацыі. Вы памятаеце "Далёкія гады" К. Паўстоўскага? Там малады чалавек, спяшаючыся да бацькі, які памірае, ледзь не гіне ў паводку на грэблі цераз Рось. Смешна і неверагодна, але тое самае здарылася і са мной на пачатку вясновых канікул недзе ў 55-м або 56-м годзе. Ехаў у Кіеў, не ў брычцы, а ў кузаве грузавіка, вядома. І грэбля была не земляная, а бетонная, з занадта вузкім вадасцёкам. Але была тая самая рака Рось і тая самая Белая Царква, і паводка, мабыць, яшчэ больш моцная, і такое ж вясновае расторганае неба, і вада валіла паўзверх грэблі магутным пластом. Грузавік, па згодзе ўсіх, хто ехаў, увайшоў у яе і пачаў рухацца, і вось, недалёка ўжо ад берага, машыну пачало павольна, мякка і ўладна валачы задам да краю грэблі, адкуль падаў уніз таўшчэзны шкляны пласт вады. Зеленавата-шэры, бязгучны там, дзе зрываўся ў прорву, ён унізе, вельмі далёка, вантробна і драпежна бурчаў.

Не памятаю, ці падумаў я тады, што гэта канец нават для мяне, які плавае вельмі добра. Канец, бо апрануты я цяжка, бо гэта падзенне разам з машынай і людзьмі, сярод якіх былі кабеты, бо ўнізе яшчэ могуць быць і камяні.

Памятаю толькі, які страшны крык узнялі людзі на берагах, хоць крычаць, уласна, належала нам, якія маўчалі.

Машына павольна, сантыметр па сантыметры, ужо звісаючы адным колам над стромай і нібы на апошніх ударах сэрца, усё ж

паўзла, бясконца паўзла і — выпаўзла…

Бачыце, як багата ўсяго было там перажыта?! Вайна, сяброўства, каханне, некалькі разоў смяротная небяспека, кнігі, пазнанне праўды і зла (і такое было!), настаўнікі і вучні, - вось што такое для мяне (і для многіх тысяч іншых) гэтая зямля.

Перш за ўсё, вядома, я абавязаны жыццём і ісцінай свайму куту, свайму краю, сваёй Беларусі. Але як жа я абавязаны добрай цётцы маёй Украіне, якая не шкадавала для мяне ні піражкоў, ні шлапакоў, ні ўшчування, ні добрай парады.

То ж я павінен быць удзячны не толькі маці, але і ёй. І як ёй аддзячыць? Хіба што адказваючы любоўю на любоў. А большага яна і не патрабуе.

І яшчэ адно, самае галоўнае. Красою і высакароднасцю сваёй яна зрабіла на мяне адваротны ўплыў. Паспрабую растлумачыць.

Бяру лепшы прыклад — Шаўчэнку. Што такое ўсе яго вершы першага перыяду? Гэта містэрыі, легенды, камедыі і трагедыі, гэта геніяльныя абстракцыі, з якіх паўстае перад намі не менш абстрактная Украіна.

А дзе яна пачынае паўставаць перад вачыма раем пад вечнай вясёлкай? У Орскай крэпасці, на берагах Каспія, што рыпяць ад сухасці, як вярблюджая калючка, на рыжых узгорках Кос-Аралу. Менавіта там напісаны вершы, якія будуць жыць, калі знікне варожасць, вершы для свабодных людзей на прасветленай зямлі. Гэта "Садок вишневий коло хати", "Мені тринадцятий минало", "Зацвіла в долині", "На великдень на соломі".

Здалёк свой край здаецца азораным ззяннем вечнага незгасальнага дня. І так ён пачынае здавацца самым гожым на свеце (а быў — "нічога асаблівага"). І так нараджаецца вышэйшая ступень любові да бацькаўшчыны.

Украіна ў зялёнай, залатой і сіняй сваёй красе зусім не падобная на пустыню, яна не так і адрозніваецца ад маіх родных мясцін. Але менавіта на Украіне мне суджана было пазнаць апошнюю любоў да самай жалю вартай былінкі на ўзбочыне самай запыленай нашай дарогі.

Я не скажу, што вучыў бы любові да гэтай былінкі, ссылаючы кагосьці ў пустыню. Ссылаць людзей нельга, тым больш у пустыню. Нават калі б яны трапілі ў Італію ці на востраў Таіці, то як бы яны там праз пару год узвылі без карычнявата-чырвоных баравікоў у бэзавым верасе, як бы заплакалі пад кіпарысамі аб ядлоўцы на пустках, аб дымах у марозным небе, аб драздах, якія латашаць чырвоныя арабіны над плотам, аб срэбрачаканым слове сваім і аб песні, аб тумане ранішнім над цёплай вадой возера.

Вось такі, апошні падарунак мне зрабіўшы, і выправіла мяне ўкраінская зямля на радзіму, калі прыйшоў час справы.

Пасля было яшчэ шмат сустрэч. Была ружовая і бэзавая Адэса з карункавым ценем акацый на бруку і сінім прывідам мора, былі скамянелыя хвалі Львова, была Палтава з пляміста-чорнымі ад раздушанай шаўковіцы тратуарамі, Палтава, у якой некалі вянчаліся мае бацькі.

І кожны раз я вяртаўся дамоў узбагачаным, яшчэ цвярдзей абапіраючыся на свой дарожны кій.

Вось так. І пры чым тут гучныя словы? Я сказаў бы: калі ведаеш чужое як сваё, тады слоў не трэба. І каб усе ведалі пра ўсіх усё, як пра сябе, — не было б глебы для варожасці. На жаль, гэта далёка не так.

Дзіўны сум навеяла мне апошняе спатканне з Кіевам. Дамы нібы змарнелі, дрэвы разрасліся, нібы лес, там, дзе былі паляны майго юнацтва. Двор "лісця каштанаў" забудаваўся і паменеў, стаў цацачны; даўно ляжыць брук на месцы старых раскопаў непадалёк ад доміка М. Булгакава; фантаны майго юнацтва стаяць бязводныя і забытыя ў густых хмызах; стары зялёны тэатр падобны ўначы на марсіянскі цырк і не мільгнуць за рогам вуліц абліччы многіх маіх сяброў і дзяўчат. Горад, які я ведаў да апошняга каменьчыка, цяпер разросся і напалову невядомы мне.

Але ўсё адно душа мая, вершы мае, складзеныя там, словы мае да блізкіх блукаюць паркамі, бульварам Шаўчэнкі, начнымі вуліцамі, Пячэрскам, як каханне маё, незабытае і незабітае ні пуцявінамі, ні холадам год.

Але ўсё адно я стаю на беразе майго і твайго Дняпра і малюся не толькі за свой кут, але і за цябе. І жадаю табе таго, чаго пажадаў бы і свайму народу: адсутнасці гардыні, фанабэрыі і зазнайства ў час трыумфу і неадольнай, мужнай і спакойнай стойкасці ў бедах.

Малюся за цябе, Украіна.

Твой зорны шлях

Зорным часам аўстрыйскі пісьменнік Стэфан Цвейг назваў кульмінацыю, вышэйшы пункт кожнага чалавечага жыцця, тую вяршыню, вышэй за якую чалавек часам і не ўзнімаецца. А можа, і мог бы ўзняцца, ды не ведае пра гэта.

А павінен быў бы ведаць, павінен быў бы верыць у свае сілы, асабліва калі ён чалавек малады. Бо маладыя больш за іншых жывуць запалам свайго маладога сэрца, сваёй душы, свайго сумлення. Бо маладому ў вышэйшай ступені ўласцівая вера ў свае сілы, і, як вынік гэтага, — прадчуванне сваіх вялікіх здзяйсненняў.

Зорным часам для мараходаў было ў свой час адкрыццё Амерыкі і выхад на бераг Ціхага акіяна, для вучоных — адкрыццё электрычнасці і атрыманне радыю, для паэтаў — напісанне "Барыса Гадунова" і "Кургана".

Сёй-той, вядома, можа сказаць, што ён не Купала, не Кюры-Складоўская і ўжо аніяк не Калумб. І, аднак, ён не поўнасцю будзе мець рацыю. Амерыкі адкрыты, але мы дагэтуль не ведаем, як мігрыруюць птушкі і рыбы, хто насяляе глыбіні акіянаў. А гэта для нас, магчыма, не менш важна, бо няважных таямніц няма, і кожная патрабуе свайго героя, свайго Калумба.

Таму кожны павінен працаваць на карысць грамадства, бо яму без яго — без мяне, без цябе (так, менавіта без цябе, друг!) — абысціся нельга. Нельга абысціся без тваёй працы, без тваёй адданасці і адказнасці.

Антуан дэ Сент-Экзюперы сказаў:

"Быць чалавекам — гэта адчуваць… што, кладучы сваю цагліну, і ты дапамагаеш будаваць свет".

І гэта трэба памятаць, як і тое, што тваёй цагліны не падыме больш ніхто. І, значыцца, ні табе, ні мне, нікому на зямлі нельга кінуць справу сваю, нельга пазбыцца адказнасці за яе.

Нехта спытае: "А што мне да зорнай гадзіны? Я спакойна і сумленна раблю сваю справу. Я не рэкардсмен. Я не збіраюся быць чэмпіёнам. Я звычайны сярэдні ігрок, што акуратна з'яўляецца на спаборніцтвы, каб мая каманда не страціла ачкоў. Патрэбны і такія".

Так, патрэбны. Але як нецікава ім жыць. Добра яшчэ, што амаль ніякая каманда без іх "не абыходзіцца".

"Не абыходзіцца…" У самім гэтым слове закладзен той сэнс, што можа і "абысціся", што ўсё роўна, амаль усё роўна, ёсць ты або цябе няма.

Да чаго гэта нудна і прыніжана! А дзе весялосць і азарт, гордасць за сябе і за іншых, дзе чалавечая годнасць быць неабходным?

Адкуль ты ведаеш, дружа, што ты не здатны да таго, каб ісці першым? Чаму загадзя згаджаешся, што месца тваё не наперадзе? Проста дагэтуль нават ты сам не ведаў сіл, схаваных у табе, не бачыў жадання прынесці ўсё сваёй грамадзе, свайму народу, свайму чалавецтву штосьці вялікае, непаўторнае.

Інертнасць дужа небяспечная рэч. Часам яна нараджае зло, таму ніколі не забывай аб гэтым. Вось чаму ў хвасце і не трэба цягнуцца.

Наш час — складаны час. Сярэдзіны ў наш век не бывае.

Нядаўна я чытаў фантастычнае апавяданне (а ці такое яно ўжо і фантастычнае?) аб тым, як на вялікім пульце кіравання наземнай ракетнай базай усё залежала ад таго, паспее маньяк-палкоўнік Гаскойн націснуць кнопку ці не. Ад чалавека, які апынуўся побач з ім, залежаў лёс зямлі.

Будзем спадзявацца, што такога не здарыцца.

Але хіба менш пачэсна адвесці, скажам, нож, занесены над чалавекам? Не менш. Таму што кожны чалавек — гэта таксама свет. І гэты непаўторны свет кожны раз згасае навекі і не паўторыцца болей са смерцю вось гэтага, непаўторнага чалавека. І той, хто яго ратуе, — кожны раз ратуе ўсю зямлю, сонца, захады і ўсходы, і ўсіх людзей, і жывёлу, і кветкі, і… зоры.

І для таго, хто ўратаваў, гэта і ёсць зорны час.

Можа ён быць і яшчэ сціплейшы. Дала першыя плады пасаджаная табою груша, расце харошым чалавекам твой сын, ты вырасціў на месцы коласа — два… Тысячы тысяч такіх спраў чакаюць любога. І на кожным шляху (і неаднойчы) чакае чалавека высакародная работа. І кожны шлях вянчаецца зорным часам. Тваім.

Толькі не прапусці. А каб не прапусціць, патрэбна гатоўнасць, маральная сіла, сумленне, звычайная людская чысціня.

Проста трэба быць дужа харошым чалавекам.

notes

Примечания

1

Тут і далей пераклады мае. — *У. К.*

2

Прыток рэчкі Трубеж (Трубайла).

3

Нажы.

4

Вялікага склепа.